Большинство представителей директорского корпуса (79,3%) считают, что с развитием крупного, среднего и малого предпринимательства мелкое (ЛПХ) бесперспективное производство будет исчезать и объективно исчезнет при укреплении экономики страны, как это произошло в ряде европейских стран. Поэтому, по их мнению, вкладывать государственные средства в поддержку ЛПХ не целесообразно. Однако это суждение входит в противоречие с реальным поведением: 68,5% опрошенных директоров и специалистов имеют личное подсобное хозяйство, а 89,3% считают, что каждый работник сельхозпредприятия должен иметь личное подсобное хозяйство, трудиться на своем подворье.

О том, что мнения аграрного истеблишмента противоречивы и неоднозначны, свидетельствует также оценка реального положения дел в своем СПК по результатам реформирования. С одной стороны, почти 40% респондентов заявили, что в их селе и СПК ничего не изменилось, с другой – когда вопрос коснулся влияния реформ АПК на уровень жизни сельского населения в целом по стране, то оценки были даны намного выше: о том, что уровень жизни улучшился, заявили уже 76% руководителей и специалистов, а то, что отношение работников агросферы к труду изменилось, отметили 30,4%. Такая дистанция между оценками реального положения дел в их СПК и в агросфере страны в целом свидетельствует о раздвоении мнения и знания. Общественное мнение экспертов формируется под воздействием позитивных успехов в АПК в целом, подчеркиваемых в идеологических и директивных документах, СМИ, отчетных цифрах, определяемых рамками уже заданных категорий и смыслов. А конкретные знания о состоянии дел в СПК формируются в непосредственной хозяйственно-управленческой практике и воспринимаются как естественно текущая повседневность, где успехи и достижения не артикулируются, соответственно кажутся незаметными.

В вопросах перспектив развития АПК респонденты проявляют взвешенность и продуманность ответов. Это касается, в частности, проблемы будущего АПК и возможности таких организационно-управленческих структур, как кооперативно-интеграционные объединения в агросфере (концерны, холдинги и др.). Директора и специалисты понимают, что введение данных структур имеет не только положительные последствия (устранение необоснованной конкуренции между производителями и поставщиками однотипной продукции – 74,9%; возможность проводить единую ценовую политику – 76,1; пространственно оптимально распределять рынки сбыта конечной продукции – 77,2; осуществлять совместную реализацию маркетинговых возможностей в условиях жесткого соперничества поставщиков – 77,2%), но и негативные. Так, большинство опрошенных обращают внимание на возможность усиления монополизма на рынке однотипной продукции – 72,8%; сужение возможности для самостоятельности среднего и мелкого предпринимательства в агросфере; появление возможности жесткой манипуляции потребительским спросом населения – 68,5; перестройки всего сельхозпроизводства под требования накопления капитала агробизнесгруппами – 76,1; появление излишков человеческих ресурсов за счет интенсификации труда – 63,1%, неиспользованных земельных ресурсов, поскольку в обороте останутся только высокоплодородные земли (59,7%). Постоянное взвешивание всех «за» и «против», колебание вектора мнений, а также осторожность при необходимости что-то радикально менять сказались, по всей вероятности, на нежелании большинства директоров объединяться в кооперативно-интеграционные структуры на деле, в реальной практике. Таких структур в стране крайне мало и не все они доказали свою эффективность. Эта раздвоенность мнения выразилась в том, что только 12% опрошенных отнесли перевод сельского хозяйства страны на кооперативно-интеграционные начала к первоочередным мерам улучшения работы АПК. Для директорского корпуса этот перевод – дело будущего, а в данный момент он придерживается традиционных взглядов, выраженных в признании, с одной стороны, необходимости финансовой поддержки предприятий (притом высокоэффективных), с другой – либерализации (свободы) хозяйственно-финансовой деятельности (45,7% респондентов). При этом почти половина опрошенных считают, что первоочередной мерой для развития АПК является осуществление ценообразования на продукцию АПК на основе фактических затрат. Приоритеты индивидуального и группового успеха особенно ярко выразились в таком параметре, как личное материальное

благосостояние. Поэтому треть опрошенных директоров и специалистов считают в качестве первоочередной меры, способствующей повышению эффективности сельского хозяйства, перевод их на новую систему стимулирования труда, предполагающую не только традиционную систему оплаты, но и участие в прибылях, персонификацию собственности (долей, паев) с начислением дивидендов, процентов на капитал и т. п. Нужно подчеркнуть, что речь идет именно об индивидуальных и групповых ожиданиях, так как в этом вопросе также наблюдается рассогласованность индивидуального (группового) и общественного сознания. В ответах выявилось абсолютное неприятие процедуры приватизации и персонификации государственной и колхозно-кооперативной собственности. Всего 2,2% респондентов считают ее необходимой и только 1,1% – приемлемой. В контрольном вопросе: «Считаете ли Вы, что СПК должны быть приватизированы?» только 6,5% респондентов ответили положительно.

Таким образом, можно сделать вывод, что аграрный истеблишмент не стал лидером развития в рыночном понимании этого слова, придерживается осторожных традиционных взглядов к радикальному реформированию, а в силу необходимости приспосабливаться к институциональным инновациям характеризуется противоречивыми представлениями, рассогласованностью знаний и мнений, слабо развитым рыночным мышлением. Полученные данные свидетельствуют о том, что взгляды, представления, способы экономического поведения, особенно в организационно-управленческой сфере, присущие руководству аграрных предприятий, не соответствуют в полной мере рыночным, но не в смысле отсталости и неразвитости, а в связи с тем, что отражают, на наш взгляд, иные способы сознания и деятельности, которые современные ученые называют редистрибутивными. Последним свойственны не индивидуалистические, как в рынке, а коммунитарно-распределительные экономические отношения с соответствующими хозяйственными практиками потребления, производства и распределения. Разрабатываемая такими известными экономистами, как К. Поланьи и Д. Норт, а в постсоветской литературе О. Бессоновой и С. Кирдиной, теория институциональных матриц показала, что институциональные матрицы (рыночные или редистрибутивные) лежат в основе меняющихся эмпирических состояний конкретного общества и, несмотря на реформы и даже революции, постоянно воспроизводятся. Если в западных странах с рыночной институциональной матрицей преобладают институты рыночной экономики, идея личностных ценностей, приоритет Я над Мы, принцип субсидиарности, то в странах с редистрибутивной институциональной матрицей доминируют обязательное опосредование Центром движения ценностей и услуг, а также прав по их производству и использованию – доминирование коллективных, надличностных ценностей, приоритет Мы над Я, т. е. коммунитарности [2–5].

Как показал анализ, директорский корпус белорусского АПК (так же, как все сельские жители) воспроизводит в своей деятельности и сознании, в основном, принципы редистрибутивной (раздаточной, планово-централизованной) институциональной матрицы, исторически сформировавшейся и устойчиво реализующейся на постсоветском пространстве.

## Литература

1. Г а м а н - Г о л у т в и н о в а, О. В. Политическая элита – определение основных понятий / О. В. Гаман-Голутвинова // Полис. – 2000. – № 3. – С. 97–103.

2. П о л а н ь и, К. Два значения термина «экономический», «неформальная экономика» / К. Поланьи. – М.: Логос, 1999.

3. Н о р т, Д. Институциональные изменения : рамки анализа / Д. Норт // Вопросы экономики. – 1997. – № 3.

4. Б е с с о н о в а, О. О. Раздаточная экономика как российская традиция / О. О. Бессонова // Общественные науки и современность. – 1994. – № 3.

5. К и р д и н а, С. Теория институциональных матриц и развитие России / С. Кирдина. – 2-е изд., перераб. и доп. – Новосибирск : Ин-т экономики и ОПП СО РАН, 2001.

*R. A. SMIRNOVA*

**AGRARIAN ADMINISTRATIVE STAFF MACHINERY AS LEADERS OF THE AGRARIAN SECTOR DEVELOPMENT**

## Summary

This article is dedicated to analysis of innovative potential of the agrarian administrative staff machinery such as directors and other top managers of the agrarian sector. Author considers that specificity of their economic behavior as well as their consciousness has been determined by transition of the agrarian sector from distributional economy to the market one. That is shown in the article, too.

*УДК 331.524:316.43*

*Т. В. КУЗЬМЕНКА*

# АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ПРАЦОЎНЫХ РЭСУРСАЎ У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

*Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 27.09.2010)*

Адной з найважнейшых умоў, якія забяспечваюць інавацыйна-ўстойлівае развіццё вёскі і аграпрамысловай сферы, з'яўляецца эфектыўнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, фарміраванне рацыянальнай структуры занятасці. Працоўная занятасць выступае асноўным фактарам павышэння ўзроўню жыцця, дабрабыту і сацыяльнай абароненасці насельніцтва. Падзенне вытворчасці, нізкая заработная плата, адсутнасць працоўных месцаў і магчымасцей для самарэалізацыі – асноўныя прычыны распаўсюджвання ў сельскай мясцовасці многіх сацыяльных праблем. З'яўленне цэлай арміі непрацуючых працаздольных вяскоўцаў цягне за сабой адток значнай іх часткі ў гарады, на заробкі ў краіны блізкага замежжа, пашырэнне нефармальнай эканомікі, зніжэнне нараджальнасці (з прычыны адсутнасці эканамічных выклікаў), распаўсюджванне п'янства і алкагалізму і ўцягванне беспрацоўных у крымінальнае асяроддзе. Вынік гэтых негатыўных з'яў – сацыяльнае расслаенне, эканамічная, сацыяльная і культурная дэградацыя і дэпапуляцыя вёскі. Рашэнне задач аптымальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў сельскай мясцовасці павінна ажыццяўляцца па такіх асноўных напрамках, як зніжэнне ўзроўню беспрацоўя, стварэнне аптымальнай кадравай структуры сельгаспрадпрыемстваў, а таксама дыверсіфікацыя сфер прыкладання працы і спосабаў атрымання даходаў грамадзян на вёсцы. Рэалізацыя названых кірункаў патрабуе сацыялагічнага аналізу і абгрунтавання.

Рэфармаванне аграпрамысловага комплексу, удасканаленне эканамічнай, сацыяльнай і кадравай палітыкі ў сельскай гаспадарцы адбываецца на фоне такіх тэндэнцый, як пастаяннае зніжэнне колькасці сельскага насельніцтва і скарачэнне долі занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці. Калі ў 2004 г. – да пачатку рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг. – працэнтныя суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва складалі 71,5 і 28,5%, то ў 2009 г. – ужо 73,9 і 26,1% [1, с. 24]. Доля занятых у сельскай гаспадарцы ў 2004 г. складала 10,7%, а ў 2009 г. – 9,3%. Вырашальную ролю ў гэтых працэсах адыгрывае міграцыя сельскай моладзі ў горад.

Вынікам сацыяльнай накіраванасці рэформаў стала бесперапыннае зніжэнне ўзроўню беспрацоўя: у 2004 г. гэты паказчык па рэспубліцы складаў 1,9%, а ў 2009 г. – 0,9% [2, с. 69]. Імкненне захаваць працоўныя месцы і не дапусціць масавых скарачэнняў дзеля росту эканамічных паказчыкаў, безумоўна, пазітыўна паўплывала на павышэнне ўзроўню жыцця вяскоўцаў і дазволіла пазбегнуць значнай колькасці сур'ёзных сацыяльных праблем.

Разам з тым, уключэнне сучасных сельгаспрадпрыемстваў у сістэму рынкавых адносін, павышэнне канкурэнтаздольнасці і арыентацыя на эфектыўнасць немагчымы без карэкціроўкі кадравай палітыкі, без удасканалення арганізацыйнай і кадравай структуры [3, с. 33; 4, с. 43]. Гэта абумоўлівае неабходнасць распрацоўкі прэвентыўных мер, накіраваных на прадухіленне магчымых негатыўных наступстваў і пабочных эфектаў павышэння эфектыўнасці сельскай гаспадаркі. Мадэрнізацыя прадпрыемстваў аграсферы, аўтаматызацыя сельскагаспадарчай вытворчасці вымушаюць сучасныя сельгаспрадпрыемствы скарачаць значную колькасць лішніх работнікаў

і аддаваць перавагу найбольш актыўным, маладым. Усё гэта ставіць праблему пошуку магчымасцей эфектыўнага выкарыстання чалавечых рэсурсаў вёскі, іх уцягвання ў альтэрнатыўныя формы занятасці, не звязаныя з сельгаспрадпрыемствам.

Традыцыйныя ўяўленні аб неабходнасці выкарыстання пераважна ручной працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама прыярытэтнае значэнне захавання працоўных месцаў і сацыяльная накіраванасць ажыццяўляемых пераўтварэнняў шмат у чым абумовілі распаўсюджванне ўяўленняў аб тым, што ў сельскай мясцовасці практычна немагчыма застацца без працы. Ілюстрацыяй служаць вынікі рэспубліканскага апытання працаздольнага сельскага насельніцтва, праведзенага Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў 2009 г. (прынялі ўдзел 730 чалавек), паводле якога 41,3% апытаных палічылі, што ў іх вёсцы, аграгарадку «беспрацоўя няма, хто хоча, заўсёды знойдзе працу», яшчэ 15,3% адзначылі недахоп рабочых рук. У той жа час 13,3% рэспандэнтаў сцвярджаюць, што праявы беспрацоўя маюць месца ў іх населеным пункце, а палова вяскоўцаў (50,9%) у той ці іншай ступені адчувае пачуццё страху і трывогі ў сувязі з магчымасцю страціць сваё працоўнае месца. За апошнія пяць гадоў, па даных штогадовага рэспубліканскага маніторынгу, які праводзіцца Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, колькасць вяскоўцаў, упэўненых, што для іх не існуе пагрозы застацца без работы, знізілася з 25,9% у 2004 г. да 14,4% у 2009 г.

Падчас апытання кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў сельгаспрадпрыемстваў, праведзенага ў 2008 г. (у апытанні прынялі ўдзел 63 кіраўнікі і галоўныя спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў), высветлілася, што большасць прадпрыемстваў, пераважна эфектыўна працуючых, на думку паловы рэспандэнтаў (52,4%), маглі б абысціся меншай колькасцю пастаянных работнікаў. Гэтаму, з пункту гледжання кіраўнікоў і спецыялістаў, спрыяе пераклад ручных аперацый на сучасныя тэхналогіі, а таксама ўдасканаленне арганізацыі вытворчасці. Праблема слабай забяспечанасці работнікамі ўсіх катэгорый – ад часовых сезонных рабочых да спецыялістаў высокай кваліфікацыі – у значна большай ступені характэрная для нізкаэфектыўных сельгаспрадпрыемстваў. Прычынамі немагчымасці прыцягнення рабочай сілы, на думку кіраўнікоў, служаць нізкая заработная плата, непрэстыжнасць прафесій у сельскай гаспадарцы, немагчымасць забяспечыць жыллём, а таксама адсутнасць работнікаў без шкодных звычак. Праведзены аналіз дае падставы меркаваць, што з ліквідацыяй тэхніка-тэхналагічнай адсталасці прадпрыемстваў аграсферы і з ростам іх эфектыўнасці праблема «лішніх» кадраў у сельскай мясцовасці будзе набываць усё большую вастрыню і актуальнасць.

Мадэрнізацыя вытворчай базы сельгаспрадпрыемстваў, выкарыстанне сучасных вытворчых тэхналогій прад'яўляюць новыя патрабаванні да кваліфікацыі работнікаў. У сувязі з гэтым для сучасных сельгаспрадпрыемстваў праблема лішку нізкакваліфікаванай працоўнай сілы дапаўняецца недахопам кваліфікаваных кадраў. Праблема якасці працоўнай сілы пагаршаецца адтокам найбольш маладой, дынамічнай і адукаванай часткі насельніцтва з вёскі. Сур'ёзную занепакоенасць выклікае той факт, што больш за палову работнікаў сельгаспрадпрыемстваў (54,5%), паводле вынікаў рэспубліканскага апытання работнікаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у 2008 г. (было апытана 350 работнікаў сельгаспрадпрыемстваў рэспублікі), не хацелі б, каб іх дзеці жылі і працавалі ў іх вёсцы або аграгарадку. Толькі пятая частка апытаных (18,7%) пажадала б сваім дзецям застацца ў родным сяле, прычым больш такіх рэспандэнтаў у тых населеных пунктах, дзе паспяхова дзейнічае сельгаспрадпрыемства. Прыкладна столькі ж (20,3%) маладых людзей падчас апытання сельскай моладзі, праведзенага ў 2007 г. (было апытана 400 навучэнцаў старэйшых класаў і прафесійна-тэхнічных вучылішч), заявілі пра намер застацца ў сваім сяле, аграгарадку пасля завяршэння вучобы, а каля паловы (46,1%) хацелі б з'ехаць. Асноўнымі фактарамі міграцыі моладзі ў горад з'яўляюцца нізкая заработная плата і абмежаваны выбар прафесій у сельскай гаспадарцы: гэтыя дзве прычыны нежадання жыць і працаваць у вёсцы назвалі адпаведна 51,4 і 37,6% юнакоў і дзяўчат. Не знаходзячы прымянення сваім працоўным навыкам, маладыя людзі ад'язджаюць у горад, дзе знаходзяць больш магчымасцей для самарэалізацыі. У дадатак да названых прычын моладзь адзначае яшчэ адсутнасць магчымасцей для культурнага развіцця, цікавага вольнага часу (26,3%) і нездавальняючыя ўмовы для працы (25,3%).

Усё гэта вызначае неабходнасць комплекснага падыходу да аптымізацыі кадравай палітыкі не толькі ў рамках сельгаспрадпрыемстваў, але і на ўзроўні дзяржавы і канкрэтных рэгіёнаў. Такі падыход павінен уключаць стымуляванне і матэрыяльную зацікаўленасць працы ў сельгаспрадпрыемстве, забеспячэнне дастойных сацыяльна-бытавых умоў, павышэнне прывабнасці і прэстыжнасці прафесій, звязаных з сельскай гаспадаркай, а таксама ўдасканаленне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі работнікаў аграсферы.

Штогадовы маніторынг паказвае, што пятая частка вяскоўцаў мае патрэбу ў павышэнні кваліфікацыі. Прыкладна для такой жа колькасці працуючых жыхароў вёскі, па выніках апытання працаздольнага сельскага насельніцтва (2009 г.), дадатковае навучанне і атрыманне новых ведаў і навыкаў з'яўляецца праблемай: у сувязі з неабходнасцю асваення новай тэхнікі і тэхналогій на сваім працоўным месцы пачуццё страху і трывогі адчуваюць 21,6% апытаных, у 21,5% такія адчуванні выклікае перспектыва перанавучання і змены прафесіі.

Асаблівае месца ў вырашэнні праблем падрыхтоўкі кадраў для аграрнай сферы належыць навучанню і павышэнню кваліфікацыі кіраўнікоў. Сёння з прычыны складанасці і маштабнасці пастаўленых перад аграпрамысловым комплексам задач сучаснаму сельскагаспадарчаму прадпрыемству патрэбны спецыялісты-прафесіяналы з высокім узроўнем кваліфікацыі ў канкрэтнай сферы дзейнасці, якія валодаюць таксама навыкамі кіраўнікоў-менеджараў, здольных рэалізаваць прынятыя рашэнні, і сістэмных аналітыкаў, якія забяспечваюць навуковую аснову кіравання. Гэта абумоўлена тым, што вельмі часта спецыяліст, які працуе на сельскагаспадарчым прадпрыемстве, адначасова выконвае і функцыі кіраўніка.

Пераход да рынкавых умоў гаспадарання вызначыў істотныя змены ў працы кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў, якія звязаны, перш за ўсё, з ростам колькасці кіруемых аб'ектаў, павелічэннем аб'ёму кіраўніцкіх задач і павышэннем колькасці тэрміновых рашэнняў. Змены ў іх дзейнасці звязаны як з мадэрнізацыяй вытворчай сферы – укараненнем новай тэхнікі і вытворчых тэхналогій, так і з пашырэннем самастойнасці прадпрыемстваў і неабходнасцю самастойна вызначаць стратэгію свайго развіцця, шукаць рынкі збыту выробленай прадукцыі.

Усё гэта патрабуе ад кіраўнікоў асваення новых метадаў работы, а для большасці з іх гэта азначае неабходнасць змены парадыгмы кіраўніцкай дзейнасці ў цэлым. Перш за ўсё, гэта прадугледжвае прад'яўленне высокіх патрабаванняў да прафесійнай кампетэнтнасці кіраўнікоў, да іх уменняў хутка адаптавацца да нестандартных сітуацый і прымаць адпаведныя нестандартныя рашэнні. Асаблівае значэнне ў такіх умовах набывае сістэматычная актуалізацыя, абнаўленне прафесійных ведаў і ўменняў у галіне кіравання, а таксама спецыялізацыя і паглыбленне ведаў у асобных сферах дзейнасці. Інавацыйны патэнцыял кіраўнікоў і спецыялістаў сельгаспрадпрыемстваў шмат у чым вызначаецца іх прафесійнымі якасцямі, назапашаным вопытам, ведамі, адукацыйным і кваліфікацыйным рэсурсам. Назапашванне адукацыйнага рэсурсу пашырае магчымасці прыстасавання да канкурэнтных патрабаванняў, дазваляе хутка ацэньваць асаблівасці знешняга асяроддзя і выпрацоўваць рацыянальную стратэгію прыстасавання.

Параўнальны аналіз вынікаў апытання работнікаў сельгаспрадпрыемстваў і прадстаўнікоў кіруючага корпусу, праведзенага ў 2009 г. (было апытана 630 работнікаў і 100 кіраўнікоў і спецыялістаў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рэспублікі), паказваюць, што кіраўнікі і спецыялісты ў некалькі большай ступені гатовы да змен у сваёй прафесійнай дзейнасці і ў звыклым ладзе жыцця, дэманструюць больш высокую актыўнасць па ўсіх пазіцыях. Больш за палову спецыялістаў і кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў гатовы атрымліваць дадатковае навучанне, перанавучацца, працаваць больш інтэнсіўна, часам звышурочна, згодны несці яшчэ большую асабістую адказнасць за вынікі сваёй працы і быць больш дысцыплінаванымі (табліца). Часткова гэта звязана з тым, што прырода кіраўніцкай дзейнасці прадугледжвае высокую актыўнасць, мабілізацыю інтэлектуальных, арганізацыйных, творчых здольнасцей і рэсурсаў кіраўніка, а высокія нагрузкі, ненармаваны працоўны час і асабістая адказнасць за ўсё, што адбываецца на падпарадкаваным аб'екце, – норма для сучаснага кіраўніка прадпрыемства.

**Размеркаванне станоўчых адказаў на пытанне:**
**«Ці пагадзіцеся Вы на некаторыя змены ў звыклым для Вас ладзе жыцця, звязаныя»:**

| Паказчык | Кіраўнікі і спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў | Астатнія катэгорыі работнікаў |
|---|---|---|
| З перанавучаннем, дадатковым навучаннем | 57,6 | 44,1 |
| З неабходнасцю працаваць больш інтэнсіўна, часам звышурочна | 65,2 | 48,5 |
| З узмацненнем працоўнай дысцыпліны на прадпрыемстве | 67,4 | 42,3 |
| З павелічэннем асабістай адказнасці | 73,9 | 52,9 |
| З пераходам на працу, не звязаную з сельскай гаспадаркай | 46,8 | 35,9 |
| З пераездам у іншае сяло, аграгарадок | 12,0 | 15,4 |
| З пераездам у раённы цэнтр | 34,8 | 19,7 |

У той жа час, чвэрць спецыялістаў і кіраўнікоў заявілі аб сваім нежаданні атрымліваць новыя або дадатковыя веды і навыкі, працаваць больш інтэнсіўна, 17,4% экспертаў не пагадзіліся б з узмацненнем працоўнай дысцыпліны на іх прадпрыемстве, а кожны дзясяты – з павелічэннем асабістай адказнасці за вынікі сваёй працы.

Пасяховасць рэалізацыі кіраўніцкіх і арганізацыйных здольнасцей шмат у чым залежыць ад успрымання спецыялістам сваёй працы. Як паказваюць вынікі апытання, большасці спецыялістаў і кіраўнікоў (68,5%) падабаецца іх праца (7,6% не падабаецца, 23,9% не змаглі адказаць). Значная частка апытаных (42,2%) успрымае сваю працу як вельмі працаёмкую, цікавай яе лічаць 36,7% рэспандэнтаў, 15,6 – творчай, а 12,2% – аднастайнай. Прычым апошнія характарыстыкі дэтэрмінуюцца прафесійным статусам работніка: сярод тых, хто лічыць сваю працу аднастайнай, рабочых у два разы больш, чым спецыялістаў сярэдняга і вышэйшага звяна, а цікавасць да яе маюць у асноўным спецыялісты. Па меры павышэння прафесійнага статусу павялічваецца і творчая кампанента выконваемых функцый.

Найважнейшае значэнне для сучаснага кіраўніка мае магчымасць пастаянна павышаць свой кваліфікацыйны рэсурс, мець доступ да найноўшай інфармацыі ў галіне кіравання аграрнай сферай. На думку большасці апытаных (67,4%), іх кваліфікацыя адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца прафесіяй. Разам з тым, толькі пятая частка кіраўнікоў і спецыялістаў (19,8%) заявілі, што не адчуваюць патрэбы ў новых ведах і інфармацыі для больш паспяховага выканання сваёй работы. Прадстаўнікі кіраўніцкага корпусу маюць патрэбу ў сучаснай інфармацыі аб спецыфіцы сваёй работы, у авалоданні навыкамі работы з камп'ютарнай тэхнікай, актуальнымі прадстаўляюцца атрыманне ведаў аб тэхніцы і новых тэхналогіях, інфармацыі пра навінкі ў галіне агропрамысловай вытворчасці, а таксама веданне працоўнага заканадаўства. Такім чынам, прыярытэтным для спецыялістаў і кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў з'яўляецца атрыманне сучасных ведаў, якія дазваляюць ім вырашаць канкрэтныя, вынікаючыя з будняў кіраўніцкай працы, задачы.

Складанасць кіруемых аб'ектаў, комплекснасць вырашаемых кіраўніцкіх задач і выконваемых кіраўніцкіх функцый, з аднаго боку, і адсутнасць даступнай інфармацыі і ведаў – з другога, абумоўліваюць шэраг цяжкасцей у рабоце спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў аграрнай сферы. Параўнальны аналіз адказаў паказвае, што ў прадстаўнікоў сістэмы кіравання значна часцей узнікаюць цяжкасці ў працы, чым у работнікаў, чыя праца не звязана непасрэдна з выкананнем кіраўніцкіх функцый. Большасць апытаных кіраўнікоў і спецыялістаў (67,4%) адзначаюць, што ім стала больш складана працаваць на прадпрыемстве; сярод іншых катэгорый работнікаў такі адказ сустракаецца значна радзей – у 40,8%. Пра адсутнасць цяжкасцей у сваёй рабоце заявілі 14,4% спецыялістаў і кіраўнікоў, а таксама 30,8% астатніх катэгорый работнікаў. Асноўныя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца прадстаўнікі аграрнага істэблішменту, звязаны з павелічэннем аб'ёму работы (так лічаць 43,3% апытаных экспертаў і 30,3% астатніх катэгорый работнікаў), з павышэннем нормаў і патрабаванняў да якасці выконваемай працы (22,2 і 11,2% адпаведна), з неабходнасцю авалодання новай тэхнікай, абсталяваннем, новымі вытворчымі аперацыямі (8,9 і 3,5%). Практычна аднолькавую актуальнасць як для прадстаўнікоў адміністрацыйна-кіраўніцкага корпусу, так і для астатніх супрацоўнікаў набываюць праблемы, звязаныя з неабходнасцю

выканання звышурочных работ (18,9 і 18,3% адпаведна) і пагаршэннем ўласнага здароўя (14,4 і 15,2%). Некалькі менш значныя для спецыялістаў-кіраўнікоў у параўнанні з астатнімі работнікамі праблемы, абумоўленыя пагаршэннем умоў працы (7,8 і 9,1%) і ўзмацненнем працоўнай дысцыпліны (3,3 і 7,4%).

Такім чынам, пераход да новых умоў гаспадарання вызначыў неабходнасць абнаўлення прафесійных ведаў для ўсіх катэгорый работнікаў сельгаспрадпрыемстваў, асабліва актуальная гэтая праблема для кіраўнікоў і спецыялістаў. У гэтай сувязі пашырэнне магчымасцей для атрымання сучаснай інфармацыі па пытаннях кіравання сельгаспрадпрыемствам, абмену вопытам у форме семінараў, форумаў, кансультацый, курсаў, дыстанцыйных формаў навучання прынесла б бясспрэчную карысць для павышэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў аграрнай сферы.

Важным напрамкам развіцця сельскіх тэрыторый у рынкавых умовах з'яўляецца дыверсіфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. Дадзены тэрмін мае на ўвазе пашырэнне спектра вырабленай прадукцыі (новыя і традыцыйныя, але забытыя культуры, перапрацоўка і інш.), а таксама павелічэнне відаў паслуг – рамёствы, сельскі турызм, догляд за ландшафтам, ахова навакольнага асяроддзя і інш. [5, с. 69]. Дыверсіфікацыя, зніжаючы рызыкі і ступень уразлівасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, надае ўстойлівасць эканоміцы сельскіх рэгіёнаў і ўяўляе сабой важную аснову гнуткага прыстасавання да зменлівых знешніх умоў.

Ацэньваючы магчымасці дыверсіфікацыі сфер прыкладання працы ў сельскіх рэгіёнах, неабходна ўлічваць, што буйныя сельгаспрадпрыемствы выконваюць ключавую ролю ў жыцці сельскіх тэрыторый. Праца ў грамадскай вытворчасці з'яўляецца асноўнай сферай прыкладання працоўных сіл і атрымання даходу для вяскоўцаў. Развіццё сваёй вёскі, аграгарадка, рашэнне сацыяльна-эканамічных праблем, павышэнне даходаў і занятасці насельніцтва, прыцягненне моладзі вяскоўцы таксама звязваюць з устойлівым развіццём вытворча-прамысловага комплексу: з далейшым развіццём і ўзбуйненнем сельгаспрадпрыемства (так лічаць 52,3% вяскоўцаў), з адкрыццём вытворчасці па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі (42,6%), з будаўніцтвам філіяла прамысловага прадпрыемства, размешчанага ў горадзе (51,3%) (па выніках апытання работнікаў сельгаспрадпрыемстваў у 2008 г.). Значна меншае значэнне надаецца такім напрамкам, як развіццё сферы паслуг (24,2%), агратурызму (17,1%), а таксама асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва (16,4%).

Роля буйных сельгаспрадпрыемстваў у жыццядзейнасці сельскага насельніцтва высокая. У той жа час праца на сельгаспрадпрыемстве з'яўляецца толькі адной з магчымых сфер прыкладання працы на вёсцы. У меркаваннях сучаснага грамадства аб вёсцы трывала замацаваўся прыярытэт сельскагаспадарчай функцыі як асноўнага віду дзейнасці ў сельскай мясцовасці. Аднак сусветны вопыт паказвае, што ў развітых краінах сельская мясцовасць становіцца ўсё больш шматфункцыянальнай, у чым складаецца залог яе ўстойлівага развіцця. Так, разам з перапрацоўкай сельскагаспадарчай сыравіны ўсё больш значную ролю адыгрываюць невытворчыя функцыі, якія забяспечваюць сацыяльнае ўзнаўленне насельніцтва і рэкрэацыйнае выкарыстанне сельскай мясцовасці [6, с. 353].

Уключэнне вёскі ў сістэму рынкавых адносін дае штуршок да распаўсюджвання новых сфер прыкладання працы не толькі ў сельскагаспадарчай вытворчасці, але і развіцця прадпрымальніцтва ў такіх галінах, як бытавое абслугоўванне насельніцтва, гандаль, аграэкатурызм. З мэтай стварэння ў сельскіх населеных пунктах і аграгарадках спрыяльных умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці і забеспячэння эканамічных передумоў для доўгатэрміновага і ўстойлівага развіцця гэтых тэрыторый на дзяржаўным узроўні прыняты шэраг кіраўніцкіх рашэнняў. Дэкрэтамі і Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнымі і рэгіянальнымі праграмамі занятасці насельніцтва замацавана сістэма мерапрыемстваў па стварэнні новых працоўных месцаў, стымуляванні развіцця асабістых падсобных і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і індывідуальнага прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці. Адбываецца спрашчэнне працэдур арганізацыі і вядзення бізнесу на вёсцы, атрымання крэдытаў, ажыццяўляецца аказанне прадпрымальнікам юрыдычных, інфармацыйных, кансалтынгавых, маркетынгавых і іншых паслуг. Прадугледжаны таксама меры па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, садзейнічанні беспрацоўным грамадзянам у працаўладкаванні і пераездзе на новае месца жыхарства.

Важная роля прыватнага сектара ў эканоміцы абумоўлена прадпрымальніцкім характарам і адносна невялікай колькасцю працуючых, што павышае яго дынамізм, гнуткасць, інавацыйны характар і эфектыўнасць. Пры ўмове рэалізацыі свайго патэнцыялу малы і сярэдні бізнес здольны значна паўплываць на ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі, горада, раёна, краіны ў цэлым. З аднаго боку, ён павышае канкурэнтаздольнасць эканомікі, з другога – спрыяльна ўздзейнічае на сацыяльную абстаноўку, зніжае ўзровень беспрацоўя, ствараючы магчымасць для рэалізацыі творчага патэнцыялу прадпрымальнікаў і работнікаў, насычэння рынку тавараў і паслуг, павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

Вынікі праведзеных даследаванняў паказваюць, што ў цэлым станоўча ацэньваючы рынкавыя змены ў сельскай гаспадарцы (44,7% апытаных у 2009 г. працаздольных сельскіх жыхароў станоўча ставяцца да развіцця рыначных адносін), толькі невялікая частка вяскоўцаў гатова ўключыцца ў іх, яшчэ менш – ужо ўключыліся: 2,9% адказалі, што заняліся бізнесам, 4,8% збіраюцца гэта зрабіць у бліжэйшай перспектыве, а 24,1% адказалі, што пакуль прыглядаюцца. Большасць жа не ўключыліся ў рынкавыя адносіны з-за адсутнасці магчымасці (42,4%) або з-за неадпаведнасці прынцыпаў рынку уласным ідэалам (19,3%). На пытанне: «Ці хацелі б Вы адкрыць уласную справу?» чвэрць працуючых жыхароў сяла (25,8%) далі станоўчы адказ. Гэта пераважна моладзь да 30 гадоў. Не хацелі б займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю 41,6%, а 29,2% не змаглі адказаць. З прычыны тэрытарыяльнай аддаленасці ад рынкаў збыту, слабага развіцця вытворчай інфраструктуры, абмежаванасці доступу да крыніц інфармацыі, адноснай абмежаванасці магчымасцей для павышэння кваліфікацыі прадпрымальніцкая дзейнасць у сельскай мясцовасці аказваецца менш прывабнай.

Рынкавыя пераўтварэнні аказваюць неадназначны ўплыў на сітуацыю ў аграрным сектары, больш выразным стала вылучэнне лідараў і аўтсайдараў, моцных і слабых на ўзроўні рэгіёнаў, гаспадарак, сем'яў. Разуменне многіх рынкавых працэсаў становіцца больш поўным, калі пры аналізе ўлічваць асаблівасці псіхалогіі, менталітэту жыхароў вёскі, якія вызначаюць спосабы адаптацыі і мадэлі паводзін у новых эканамічных і сацыяльных умовах. Такія гістарычна і генетычна абумоўленыя асаблівасці менталітэту, як насцярожанае стаўленне да ўсяго новага, адсутнасць схільнасці да рызыкі, залежнасць ад знешніх абставін, імкненне кіравацца прынцыпам «жыць як усе», адстойваць калектыўныя інтарэсы, і сёння шмат у чым вызначаюць стратэгіі паводзін вяскоўцаў [7, с. 56].

У якасці найбольш значных перашкод для адкрыцця бізнесу разам з фактарамі аб'ектыўнага плана, абумоўленымі недахопам матэрыяльных, арганізацыйных, інфармацыйных рэсурсаў, вяскоўцамі ўказваліся і прычыны, звязаныя з асаблівасцямі псіхалогіі і менталітэту. Найбольш істотнымі прычынамі, якія, на думку жыхароў вёскі, стрымліваюць жаданне і магчымасці адкрыць сваю справу, па выніках апытання працаздольнага сельскага насельніцтва ў 2009 г. выступаюць: насцярожанае стаўленне да ўсяго новага (32,4%), эканамічная нестабільнасць (27,9%), узрост і здароўе (27,2%), адсутнасць неабходнай інфармацыі (20,0%). Па самаацэнках вяскоўцаў, для прадпрымальніцкай дзейнасці ім больш за ўсё не хапае грашовых сродкаў і зберажэнняў (51,9%), дзелавой хваткі (30,8%), упэўненасці ў сваіх сілах (28,1%), ведаў і вопыту асваення рынкавых адносін (25,1%), схільнасці да рызыкі (22,5%), патрэбнай адукацыі (21,5%).

На сучасным этапе развіцця рынкавых адносін з прычыны пералічаных вышэй фактараў жыхары вёскі дэманструюць невысокі ўзровень прадпрымальніцкай актыўнасці. Такія крыніцы даходаў, як збор грыбоў і ягад, продаж прадуктаў з уласнай падсобнай гаспадаркі, сезонны і часовы падзаработак, занятак бізнесам, слаба распаўсюджаны: колькасць рэспандэнтаў, якія ўказваюць на гэтыя крыніцы, складае не больш за 14%. Дастаткова яркай ілюстрацыяй невысокай прадпрымальніцкай актыўнасці і невялікага спектра альтэрнатыў занятасці ў грамадскай вытворчасці служаць адказы жыхароў вёскі на пытанне: «Калі б Вы страцілі працу, што б распачалі для вырашэння матэрыяльных праблем сям'і?» (2009 г.). Колькасць адказаў, якія прадстаўляюць хоць нейкую альтэрнатыву пошуку працы ў грамадскай вытворчасці (заняўся б фермерствам, стварыў бы сялянскую гаспадарку для вытворчасці прадукцыі на продаж, жыў бы прыбыткамі з уласнай гаспадаркі, аб'яднаўся б у кааператыў па вытворчасці або продажы сельгаспрадукцыі, заняўся б бізнесам або падзаработкам, пайшоў бы наёмным работнікам у фермерскую гаспадарку), не перавышае трэці.

Найбольш распаўсюджанай і блізкай да сельскага ладу жыцця формай занятасці і атрымання дадатковага даходу з'яўляецца вядзенне асабістых падсобных гаспадарак. Аднак, як паказваюць даныя апытанняў сельскага насельніцтва, большасць асабістых падсобных гаспадарак не забяспечваюць пераходу да таварнай вытворчасці і арыентаваны ў асноўным на ўнутрысямейнае спажыванне. Толькі пятая частка вяскоўцаў вядзе ўстойлівую дробнатаварную вытворчасць у сваіх падсобных гаспадарках, чвэрць хацела б павялічыць колькасць выробленай прадукцыі. Не набылі папулярнасці сярод сельскага насельніцтва ідэі стварэння добраахвотных сялянскіх кааператываў па вытворчасці сельгаспрадукцыі: толькі 6,4% удзельнікаў апытання працаўнікоў вёскі (у 2008 г.) хацелі б аб'яднацца ў кааператыў з 10–20 надзейных гаспадароў для вытворчасці сельгаспрадукцыі на продаж, яшчэ менш – маглі б самі заняцца яго арганізацыяй. З-за адсутнасці ведаў, вопыту, інфармацыі, а таксама ініцыятывы (як уласнай, так і з боку кіраўніцкіх структур) уладальнікі падсобных гаспадарак не гатовы прыняць удзел у стварэнні добраахвотных сялянскіх кааператываў.

Адным з актуальных напрамкаў развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці ў сельскай мясцовасці з'яўляецца агратурызм. Зыходзячы з прыродных, экалагічных, гістарычных умоў, развіццё турызму на тэрыторыі свайго населенага пункта лічаць магчымым 42,6% рэспандэнтаў (па даных апытання працуючых жыхароў вёскі ў 2008 г.). Сярод асноўных мерапрыемстваў, якія, на думку вяскоўцаў, могуць спрыяць прыцягненню турыстаў – добраўпарадкаванне водаахоўных зон і прыродных аб'ектаў (так лічаць 44,3% апытаных), стварэнне сельскіх сядзіб для прыёму турыстаў (21,5%), аднаўленне гістарычных і культурных помнікаў і адкрыццё на іх базе турыстычных маршрутаў (15,1%), будаўніцтва гасцініцы, турыстычнага, спартыўнага комплексу (14,4%), развіццё ў вёсках цэнтраў народных рамёстваў і промыслаў (12,4%). Працаваць у сферы аграэкатурызму ў якасці наёмнага работніка, абслугоўваючага персаналу з той ці іншай ступенню ўпэўненасці пагадзіліся б больш за трэць апытаных (38,6%), самастойна заняцца арганізацыяй сельскага турызму – дзясятая частка ўдзельнікаў апытання (13,1%).

Вынікі праведзеных даследаванняў паказваюць, што па шэрагу прычын (як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару) самастойна заняцца бізнесам і праяўляць актыўнасць у сферы прадпрымальніцтва здольна дастаткова невялікая колькасць жыхароў аграгарадкоў і вёсак. Гэта пераважна найбольш маладая, дынамічная, адукаваная частка сельскай супольнасці. І, акрамя таго, гэтыя людзі, як правіла, даволі паспяхова працуюць у грамадскай вытворчасці, так што пошук альтэрнатыўных сфер прыкладання працы для іх не з'яўляецца вострай праблемай, а набывае характар пошуку крыніц дадатковага заробку. Найбольш «праблемнай» у дачыненні стварэння альтэрнатыўных легальных формаў занятасці і атрымання даходу з'яўляецца катэгорыя вяскоўцаў, якія з-за адсутнасці кваліфікацыі, дысцыпліны, перадпенсіённага ўзросту ці іншых прычын найменш абаронены і могуць апынуцца незапатрабаванымі на сельгаспрадпрыемствах і ў іншых арганізацыях. Самі жыхары аграгарадкоў і вёсак, паводле даных апытання працуючых вяскоўцаў, праведзенага ў 2008 г., лічаць, што тых, хто не задзейнічаны ў сферы грамадскай вытворчасці, можна прыцягваць да работ па добраўпарадкаванні (так лічаць 49,0%), да сезонных работ на сельгаспрадпрыемствах (46,3%), да дзейнасці па аказанні паслуг насельніцтву па нарыхтоўцы і распілоўцы дроў, рамонту дамоў, апрацоўцы зямельных участкаў (42,6%), да будаўнічых работ (32,9%), а таксама да догляду за адзінокімі састарэлымі людзьмі і інвалідамі (32,2%). Дадзеныя віды паслуг найбольш запатрабаваныя ў сельскай мясцовасці, аднак відавочна, што праца толькі ў гэтым напрамку не вырашыць праблемы занятасці і павышэння даходаў грамадзян. Меры па выкарыстанні вызваленых з вытворчасці працоўных рэсурсаў павінны насіць комплексны характар. Гэта выяўляецца ў накіраванасці на мэтавую сацыяльную падтрымку сельскага насельніцтва, рэгуляванні міграцыйных працэсаў, падтрымцы некаторых відаў сельскагаспадарчай вытворчасці павышанай працаёмкасці (напрыклад, стымуляванне вытворчасці экалагічна бяспечнай прадукцыі) і спалучэнні з развіццём сацыяльнай і інжынернай інфраструктуры вёскі, паляпшэннем бытавых умоў сельскіх працаўнікоў, прафілактыкай п'янства і алкагалізму.

Рашэнне праблемы эфектыўнага выкарыстання працоўных рэсурсаў вёскі мае на ўвазе не проста комплекс асобных мерапрыемстваў па падтрымцы сельскай гаспадаркі або садзейнічанні

развіццю прадпрымальніцтва. Да комплекснай стратэгіі ўстойлівага развіцця адносіцца садзейнічанне дыверсіфікацыі эканамічнай дзейнасці, а таксама ажыццяўленне мерапрыемстваў па ўзмацненні рэгіянальнай канкурэнтаздольнасці. Абавязковай умовай яе паспяховай рэалізацыі з'яўляецца ўлік спецыфікі развіцця сельскай мясцовасці, сялянскай псіхалогіі, менталітэту і ладу жыцця.

## Літаратура

1. Сельское хозяйство Республики Беларусь. Статистический сборник / Министерство статистики и анализа Республики Беларусь. – Минск, 2009.

2. Социальное положение и уровень жизни населения Республики Беларусь. Статистический сборник / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2010.

3. С м и р н о в а, Р. А. Рациональное использование человеческого потенциала – залог эффективности сельского хозяйства / Р. А. Смирнова // Человеческий потенциал белорусской деревни / Р. А. Смирнова [и др.]. – Минск, 2009. – С. 14–33.

4. С о к о л о в а, Г. Н. О подходе к исследованию инновационной стратегии государства / Г. Н. Соколова // Социологические исследования. – 2008. – № 9. – С. 39–46.

5. Ч е п у р н ы х, Н. В. Региональное развитие: сельская местность / Н. В. Чепурных, А. Л. Новоселов, А. В. Мерзлов; Совет по изучению производ. сил. – М.: Наука, 2006.

6. Н и к о л ь с к и й, С. А. Аграрный курс России: Мировоззрение реформаторов и практика аграрных реформ в социально-историческом, экономическом и философском контекстах / С. А. Никольский; ред. О. П. Степанова. – М.: Колос С, 2003.

7. С м и р н о в а, Р. А. Трудовой потенциал белорусского крестьянства в условиях реформирования АПК (социологический анализ) / Р. А. Смирнова, Т. И. Матюшкова // Проблемы управления. – 2007. – № 4 (25). – С. 54–58.

*T. V. KUZMENKO*

**MAIN DIRECTIONS TO IMPROVE THE EFFICIENCY OF LABOR RESOURCES UTILIZATION IN RURAL AREAS**

## Summary

This article is devoted to the problem to search possibilities of the effective utilization of human resources in rural areas. To solve this problem there are some main directions. They are: reduction of the level of unemployment, optimization of personnel structure on the agricultural enterprises and raising the level of manager's and specialist's skill as well as diversification of spheres to utilization the work and ways to get citizens' incomes in the countryside and their involvement in alternative forms of employment, which not connected with agricultural enterprises.

## *ПРАВА*

*УДК 342.72/.73;364 (476)*

*С. М. СІВЕЦ*

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН ЯК АСНОЎНЫ ВЕКТАР РЭАЛІЗАЦЫІ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь*

*(Пастпуіў у рэдакцыю 12.07.2011)*

**Уводзіны**. Сам факт канстытуцыйнага замацавання сацыяльных правоў грамадзян яшчэ не з'яўляецца рэальнасцю. Больш таго, па меркаванні шэрагу вучоных, «права на жыццё, права на абарону ўласнасці, эканамічных, сацыяльных і маральных інтарэсаў, на абарону інтэлектуальнай уласнасці не мае забеспячальных прававых механізмаў, у ролі якіх могуць выступаць камісіі па працоўных спрэчках, якія існуюць на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях, звычайныя суды і іншыя органы. Дадзеная акалічнасць значна ўскладняе магчымасць рэалізацыі ўказаных правоў» [1, с. 12]. У гэтых умовах дзяржава і грамадства павінны прыкладаць шмат намаганняў для забеспячэння сацыяльных правоў сваім грамадзянам, а таксама іншым асобам, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (замежным грамадзянам, асобам без грамадзянства, легальным і нелегальным бежанцам). Гэта значыць, што забеспячэнне ўказанай групы канстытуцыйных правоў датычыць не якіх-небудзь асобных выпадкаў і асоб, а мільёнаў людзей, якія пастаянна ці часова знаходзяцца на тэрыторыі нашай дзяржавы. У дэмакратычным грамадстве, дзе кожны чалавек удзельнічае ў рэалізацыі ўлады народа і з'яўляецца каштоўнасцю дзяржавы, апошняя абавязана забяспечыць чалавеку не толькі фізічнае (біялагічнае), але і сацыяльнае жыццё.

**Асноўная частка**. Вызначаны артыкулам 21 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь абавязак дзяржавы гарантаваць правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах, і набытыя міжнароднымі абавязацельствамі, з'яўляецца агульнай прававой нормай, якая ўзначальвае сістэму канстытуцыйных гарантый сацыяльных правоў грамадзян. Відавочна, што без дакладна рэгламентаванай заканадаўчай сістэмы гарантый рэалізацыя грамадзянамі сацыяльных правоў застанецца па сутнасці толькі прыгожым дэклар採аваным лозунгам. Якія ж гэта гарантыі і як бачыцца сістэма гарантый сацыяльных правоў грамадзян, адлюстраваных у Канстытуцыі краіны і ў сутнасці грамадскага ладу?

У навуцы канстытуцыйнага права пад гарантыямі разумеюць прававыя і іншыя сродкі, якія забяспечваюць рэалізацыю таго ці іншага права чалавека і грамадзяніна. Як вядома, канстытуцыйныя правы і свабоды валодаюць найвышэйшай юрыдычнай сілай і забяспечваюцца ўсім дзяржаўным і грамадскім ладам, а таксама сістэмай гарантый, замацаваных нормамі права.

«Своеасаблівасць гэтых правоў – у спосабах забеспячэння іх з боку дзяржавы. Дзяржава не мае права ўмешвацца ў сферу асабістага жыцця грамадзян, якая ляжыць па-за рамкамі іх абавязкаў перад дзяржавай. Разам з тым, яна бярэ на сябе абавязак забяспечваць абарону правоў і свабод грамадзян ад неправамерных замахаў з боку органаў дзяржавы, службовых асоб і грамадзян» [2, с. 100]. Сацыяльныя правы з'яўляюцца найважнейшымі канстытуцыйнымі правамі чалавека. У сістэме сацыяльных каштоўнасцей ахова здароўя і медыцынская дапамога, асабістая недатыкальнасць, жыллё, праца, адукацыя і г. д. – гэта найважнейшыя абсалютныя і натуральныя каштоўнасці, вакол якіх і фарміруюцца магчымыя грамадскія адносіны, актыўным удзельнікам якіх выступае чалавек. У гэтай сувязі забеспячэнне сацыяльных правоў грамадзян залежыць не

толькі ад наяўнасці юрыдычных гарантый гэтых правоў, але таксама і ад так званых «матэрыяльных гарантый правоў», пад якімі разумеюць сукупнасць эканамічных, палітычных, сацыяльных і духоўных умоў, якія робяць правы рэальнымі. Бо калі дзяржава, забяспечыўшы, да прыкладу, недатыкальнасць чалавека, пазбавіць яго пры гэтым харчавання (шляхам затрымкі выплаты зарплаты, пенсіі, стыпендыі), жылля ці іншых матэрыяльных даброт, у выніку гэта прывядзе да гібелі чалавека, што будзе сведчаннем адсутнасці гарантыі абароны жыцця чалавека з боку дзяржавы. Як справядліва адзначаюць В. Е. Гуліеў і Ф. М. Рудзінскі, «асноўныя правы чалавека – гэта яго сацыяльныя магчымасці валодаць такімі элементарнымі дабротамі, як жыццё, харчаванне, адзенне, недатыкальнасць асобы і г. д.» [3, с. 98].

Канстытуцыйна-прававая прырода сацыяльных правоў грамадзян, а таксама механізм і спосабы забеспячэння іх рэалізацыі заўсёды з’яўляліся аб’ектам пільнай увагі вучоных-правазнаўцаў. У ліку аўтараў, якія звярталіся да дадзенай праблематыкі, можна выдзеліць такіх вядомых і аўтарытэтных вучоных, як Н. С. Бондар, А. І. Бабылёў, Р. А. Васілевіч, А. А. Галаўко, Е. А. Лукашова, Т. К. Міронава, В. А. Пацюлін, Н. В. Пуціла, Ф. М. Рудзінскі, Ю. А. Ціхамінаў і многія іншыя.

Аналіз навуковых публікацый згаданых аўтараў дазваляе звярнуць увагу на некаторую разнароднасць у вызначэнні паняцця і сутнасці названай групы правоў. Так, Н. С. Бондар адзначае, што сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы ў якасці адрознівальных прыкмет валодаюць:

• адзінствам матэрыяльнага (эканамічнага і сацыяльна-культурнага) зместу; іншыя правы не залежаць непасрэдна ад адносін уласнасці і таму рэалізуюцца ў палітычных адносінах;

• выступаюць як правы-гарантыі, г. зн. выконваюць гарантуючыя функцыі ў адносінах да іншых правоў і свабод;

• маюць агульнасацыяльную накіраванасць, выступаюць інструментам сцвярджэння гуманізму і сацыяльнай справядлівасці;

• патрабуюць дэталёвай канкрэтызацыі сацыяльна-эканамічных канстытуцыйных правоў у бягучым заканадаўстве [4, с. 179].

У той жа час, паводле меркавання В. А. Чацверніна, катэгорыя «сацыяльныя правы» аб’ядноўвае «складаны комплекс правоў, дэкларацый і добрых пажаданняў, якія не маюць юрыдычнага зместу, маральных патрабаванняў і да т. п.» [5, с. 234]. Л. Д. Ваяводзін у якасці сацыяльных правоў выдзяляе тыя правы, якія «забяспечваюць задавальненне матэрыяльных патрэб індывіда і гарантуюць яму свабоду ўдзелу ў гаспадарча-эканамічным жыцці краіны» [6, с. 184]. А. Е. Казлоў лічыць, што «галоўная характэрная рыса сацыяльных правоў – гэта тое, што яны закліканы забяспечыць асобе задавальненне найважнейшых жыццёвых патрэб, без якіх не можа быць і размовы аб нармальным чалавечым быцці». Пры гэтым даследчык адзначае, што, «выдзяляючы сацыяльныя правы ў асобную групу, трэба мець на ўвазе іх характэрную асаблівасць: яны накіраваны, перш за ўсё, на задавальненне матэрыяльных патрэб грамадзян, як правіла, незалежна ад колькасці і якасці працы» [7, с. 84]. Н. В. Пуціла выказвае думку, што сацыяльныя правы прызваныя кампенсаваць усе тыя негатыўныя вынікі сацыяльных хвароб, якія пазбаўляюць асобу даступнасці элементарных даброт. Яна прапануе азначэнне сацыяльных правоў як «натуральных неадчужальных магчымасцей, якія гарантуюць абарону і падтрымку з боку грамадства і дзяржавы ў выпадку аб’ектыўнай немагчымасці самастойна забяспечыць годныя ўмовы існавання для сябе і сваёй сям’і, якія забяспечваюць даступнасць элементарных даброт цывілізаванага грамадства. Дадзенае азначэнне, як уяўляецца, дазваляе адасобіць сацыяльныя правы ад іншых груп правоў чалавека, падкрэсліваючы пры гэтым іх індывідуальны, спецыфічны змест» [8, с. 17].

В. А. Іваненка і В. С. Іваненка прапаноўваюць наступнае азначэнне даследуемага паняцця: «Сацыяльныя правы – гэта прызнаваемы грамадствам і дзяржавай і замацаваны ў нарматыўна-прававых актах комплекс правоў і свабод, якімі павінен валодаць кожны чалавек з мэтай забеспячэння і абароны сваіх пэўных уласцівасцей, інтарэсаў і магчымасцей, неабходных яму для нармальнага фізіялагічнага, матэрыяльнага і духоўнага існавання і развіцця, для сацыяльна годнага жыцця і грамадска значнай дзейнасці» [9, с. 98]. Разам з тым, усе згаданыя аўтары аднадушны ў тым, што сацыяльныя правы, як і іншыя групы правоў грамадзян, уяўляюць сабой юрыдычна гарантаваныя магчымасці самарэалізацыі ў грамадстве з адначасовым абавязкам дзяржавы па іх забеспячэнні. Рэальнасць гэтым правам надае замацаванне на канстытуцыйным узроўні.

Сёння неабходна цэласная адзіная сістэма гарантый, якая забяспечвае максімальную абарону і рэалізацыю сацыяльных правоў грамадзян. Пры дэмакратычным ладзе грамадства менавіта

«Вінтоўка № 492116» імпанавала педагагічнаму тэатру. У п’есе размова ідзе пра выхаванне беспрытульных дзяцей. Чатыры падлеткі па мянушцы Ірад, Разань, Паташон і Ахметка аказва-

юцца сярод чырвонаармейцаў, і тут адбываецца іх вяртанне да чалавечага жыцця. Выхавацелем у асобе камандзіра Эйна з’яўляецца Чырвоная Армія. Актуальнасць, злабадзённасць тэмы была відавочная, без асаблівых удакладненняў яна і спрацоўвала ў сцэнічным творы.

З мэтай адкрыта наблізіцца да дзіцячага ўспрымання была ажыццёўлена пастаноўка п’есы «Шлях далёкі» М. Шастакова (1934). У творы закранаецца стандартная для 1930-х гадоў тэма класавага, палітычнага выхавання падрастаючага пакалення. Драматургічным матэрыялам на гэты раз паслужыла жыццё савецкіх піянераў і іх сяброўства з дзецьмі працоўных капіталістычных краін.

Спектакль «Шлях далёкі» разлічваўся на малодшых школьнікаў і прадугледжваў іх масавы ўдзел у дзеянні. Фактычна пастаноўка будавалася ў адпаведнасці з папулярнай на той час тэорыяй «спектакля-гульні». Беларускія акцёры больш-менш старанна яе «выклалі» на практыцы.

Тэматычная абмежаванасць цягнула за сабой абмежаванасць творчую. Пэўныя зрухі не беспадстаўна звязваліся з пастаноўкай нацыянальнай п’есы, і ў 1936 годзе на афішы тэатра з’явіўся спектакль «Ная» М. Зарэцкага ў рэжысуры М. Кавязіна.

П’еса «Ная» – апошні драматычны твор, які паспеў надрукаваць М. Зарэцкі. Тут аўтар звяртаецца да далёка не простай тэмы жыцця цыган, але вырашае яе ў рэчышчы аднастайных агітацыйна-прапагандысцкіх установак. Гістарычна выпрацаваны побыт народа, спрадвечны ўклад яго існавання выстаўляюцца ў п’есе як перажытак старога, ужо адрынутага рэвалюцыяй грамадскага ладу. Пакласці канец негатыўным праявам можа толькі пераход цыганскага насельніцтва да аседлага жыцця ў адзінай сям’і калгаснікаў.

Цэнтральнае месца ў сюжэце твора займае вобраз дзесяцігадовай дзяўчынкі-цыганкі Наі. У двухгадовым узросце яна засталася сіратою і з тае пары жыве ў чужых людзей, сярод вандроўных цыган, зазнаючы зусім не дзіцячы клопат. Самазваныя «дабрадзеі» – Якуб, яго маці Мар’яна і жонка Зора – прымушаюць Наю красці, зарабляць грошы вулічнымі скокамі. Аднак, як бы дзяўчынка ні старалася, чуць ёй даводзіцца адно – папрокі ды лаянку, зносіць пагрозы і цярпець пабоі. Вырвацца з гэтага жудаснага палону і знайсці старэйшага брата Наі дапамагаюць юныя піянеры Юзік і Мікіта.

Выконваючы сацыяльны заказ, М. Зарэцкі відавочна згушчаў фарбы ў абмалёўцы нораваў цыганоў-вандроўнікаў. Якуб і яго родныя характарызуюцца не толькі жорсткім абыходжаннем з Наей, але яшчэ і зняважлівымі, грубымі адносінамі паміж сабой. Абагульненні, якія робіць драматург, істотна разыходзяцца з рэальнасцю.

Уласны голас М. Зарэцкага прагучаў у тым, што галоўным героем яго п’есы выступае «несвядомае дзяўчо». Сённяшняя крытыка слушна заўважае, што «ў гады, калі магістральнымі тэмамі літаратуры абвяшчаліся калектывізацыя, індустрыялізацыя, тэма выкрыцця ўнутраных ворагаў, увага пісьменніка да скрыўджанай жыццём асобы была праяўленнем сапраўднай чалавечнасці» [4, с. 402].

Можна меркаваць, што на абарону маленькага чалавека было скіраванае і сцэнічнае прачытанне п’есы М. Зарэцкага. Такі сэнсавы акцэнт мог прыкметна вылучаць спектакль «Ная» з ліку ўсіх іншых работ тэатра. Ёсць сведчанні, што «гэта была яркая і цікавая пастаноўка, і гледачы сустрэлі яе прыхільна» [5, с. 43]. На жаль, якіх-небудзь больш канкрэтных ацэнак спектакля не захавалася. Ён прайшоў усяго некалькі разоў і быў зняты з рэпертуару як ідэалагічна не вытрыманы твор. Пастаноўка аказалася заложніцай палітычнага тэрору, ахвярай якога стаў сам аўтар п’есы.

Новае гучанне на тэатральных падмостках праблемы надзённага жыцця набываюць у другой палавіне 1950-х гадоў. Адноўлены пасля Вялікай Айчыннай вайны Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача пад кіраўніцтвам Л. Мазалеўскай (1955) адразу актыўна ўключыўся ў працу над актуальнымі творамі. У спектаклях «Аркадзь Жыгалкін» Я. Пасава (1957) і «У пошуках радасці» В. Розава (1958), пастаўленых галоўным рэжысёрам, сучасная тэма атрымала па-тэатральнаму выразнае маральна-этычнае тлумачэнне, была напоўнена духоўным, агульначалавечым зместам.

Спектакль «Аркадзь Жыгалкін» можа служыць яскравым прыкладам удумлівай і плённай працы тэатра з пачынаючым драматургам. Пастаноўка мела шырокі грамадскі рэзананс. Настаўнікі

дыскуціравалі наконт праблемы «цяжкага» падлетка, правільнага–няправільнага выхавання. Тэатральныя крытыкі абмяркоўвалі характар і спосабы яе мастацкага вырашэння. Гледачы ж, якім адрасаваўся спектакль, знаходзілі ў ім шмат пазнавальнага і захапляліся блізкім: «Аркадзь Жыгалкін (яго ролю выконваў сёння ўсім вядомы беларускі кінарэжысёр І. Дабралюбаў. – *А. С.*) надоўга стаў кумірам для многіх мінскіх школьнікаў» [7, с. 29].

Этычны складнік спектакля быў для Л. Мазалеўскай не менш важкім і каштоўным, чым складнік эстэтычны. Гэтым тлумачыцца яе асаблівая зацікаўленасць да драматургіі В. Розава.

Сямейныя клопаты, непаразуменні паміж дарослымі і дзецьмі раскрываюцца В. Розавым з асаблівым унутраным напружаннем, канцэнтравана, і таму яны, звыклыя ў побыце, у мастацкім творы напаўняюцца абагульняючым, агульначалавечым сэнсам. Розаўскае светаўспрыманне адчувалася ў спектаклі. Яго стваральнікі і перш-наперш рэжысёр Л. Мазалеўская, як і драматург, былі гранічна шчырыя ў раскрыцці чалавечай прыроды. Адэкватна праяўляўся крытычны струмень, пад які падпадалі пошласць, нядобрасумленнасць, бязмежная прага да нажывы, маральная спустошанасць. Аднак у галоўным сцэнічная версія, як і яе літаратурная аснова, была мастацкім выказваннем аб светлых і чыстых пачуццях, якія праносіць чалавек праз усё сваё жыццё.

Не ўсе выканаўцы арганічна ўвайшлі ў задуманы рэжысёрам спектакль. Незавершаным застаўся вобраз Алега, якога прадстаўляў нядаўні выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў І. Слатвінскі. Перадусім ён не змог вызначыцца з тым, як трактаваць узрост свайго героя: у адных сцэнах яго не ўлічваў, у другіх – занадта педаліраваў, што ўносіла фальш у ігру. З выклікам, правакацыйна дэманстравала мяшчанскія замашкі Леначкі В. Козмер, з-за чаго вобраз выбіваўся з агульнага псіхалагічна абгрунтаванага дзеяння. А вось дзве інтэрпрэтацыі Фёдара пераконвалі ў неадназначнасці дадзенага характару: «У Фёдара – Лебедзева воля зломана назаўсёды. Характар Фёдара – Дубашынскага – гэта часовая асліпленасць, невялікае патуранне капрызам любімай жанчыны, але верыцца, што ён яшчэ зразумее сваю памылку і стане, кім быў» [6]. Новыя грані таленту Э. Аўчыннікавай праявіліся ў ролі Таццяны. Душэўную разгубленасць Генадзя і адначасова яго нацэленасць на дабро выразна раскрываў Б. Барысёнак. Нарэшце Ю. Фляйто стварыла пераканаўчы, эмацыянальна напоўнены вобраз Клаўдзіі Васільеўны – Маці з вялікай літары.

Спектаклю «У пошуках радасці» бракавала паслядоўнасці дзеяння, стройнасці выканання. Аднак гэта ніколькі не адмаўляла яго значнасці ў дыялогу з гледачом. Вельмі важна і тое, што пастаноўка адпавядала праграмным пазіцыям тэатра.

Аднак дасягнутае Л. Мазалеўскай не атрымлівае належнага працягу і развіцця. У наступныя дзесяцігоддзі назіраецца рэзкае пагаршэнне сітуацыі з сучасным рэпертуарам для падлеткаў, адбываецца як колькаснае, так і якаснае звужэнне дадзенай рэпертуарнай лініі. Рэдкімі астраўкамі вылучаюцца адмыслова задуманыя і выразна выкананыя спектаклі «Пузыркі» А. Хмеліка (1965), «Пойдзем у кіно?..» А. Алексіна (1978) і «Уся надзея» М. Рошчына (1986).

У п’есе «Пузыркі» А. Хмелік арыгінальна трактуе дзяжурны сюжэт, калі галоўнай дзеючай асобай выступае лепшы прадстаўнік класнага калектыву, асноўнай жа характарыстыкай юных герояў з’яўляецца іхняя грамадска-карысная дзейнасць. Сапраўды, цэнтральнае месца ў п’есе займае старшыня савета атрада 7-га класа «А» Юра Узюмаў і ён жа аказваецца завадатарам далёка не лепшых дзеянняў сваіх аднакласнікаў. З аднаго боку, падлеткі свой вольны час не трацяць: збіраюць металалом, макулатуру, аптэчныя пузыркі, даглядаюць за хворымі старымі. З другога – дзеля перамогі ў спаборніцтве ламаюць жалезную агароджу ля сквера; крадуць каўпакі ад новага «Масквіча»; занепакоеныя тым, каб бабулька як мага даўжэй хварэла, што павялічыць колькасць сабраных пузыркоў. І ў абарону такой, мякка кажучы, ганебнай справы Юра знаходзіць гучныя аргументы: «не для себя берем, для государства!», са здабытага металалому «построят тепловоз и напишут: «Пионерский» [10, с. 81]. Многае сыходзіць з рук гора-актывістам, толькі няхітрая махінацыя з пузыркамі якраз і не прайшла.

У п’есе героі-падлеткі надзелены характэрнымі, тыповымі рысамі. Лёгка ўявіць сабе нават Машку Грыбаедаву, якая непасрэдна ў дзеянне не ўключаецца. Адметнымі і пазнавальнымі атрымаліся яны і ў спектаклі, пастаўленым У. Маланкіным. Нязмушаная манеры ігры, на якой настойваў рэжысёр, дапамагала акцёрам арганічна існаваць у ролях хлопчыкаў і дзяўчынкі.

Яны знаходзілі персанальныя матывіроўкі ўчынкаў кожнага ў здзяйсненні агульнай справы. Самаўпэўнена і па-смешнаму напышліва спраўляў свае паўнамоцтвы Юра Р. Маленчанка; з гумарам прадстаўлены А. Фурманавай небарака Пеця Нечытайла поўнасцю адпавядаў свайму прозвішчу; наадварот, кемлівым, спрытным выканаўцам даручанай справы быў Валодзя Лапцеў у выкананні К. Мізгайла; мяккімі лірычнымі фарбамі малявала вобраз наіўнага Гарыка Еўрумяна Ю. Палосіна; шустрым і не па гадах спрактыкаваным выглядаў першакласнік Пятроў З. Паўлоўскай; у кампаніі хлапчукоў іскрыстым праяўленнем характару вылучалася Таня Скрыпіцына А. Бендавай. Агульнае і галоўнае было тое, што кожны персанаж уяўляўся асобай.

Выстаўляючы на асуджэнне на першы погляд бяскрыўдныя прыдумкі Юры і яго сяброў, А. Хмелік недвухсэнсава ўказвае на адказнасць дарослых, грамадства за выхаванне юных душ. У. Маланкін уважліва паставіўся да аўтарскай пазіцыі. Яна дакладна праяўлялася ў глыбокіх і трапных характарыстыках, вынаходлівых мізансцэнах. Крытычна, аднак, успрымалася вострая сатыра, з дапамогай якой рэжысёр імкнуўся калі-нікалі абагульняць сцэнічнае дзеянне. Яна пярэчыла незласлівай мяккай танальнасці п'есы, ды і ўвогуле сатыра як форма мастацкага асэнсавання рэчаіснасці не з'яўляецца арганічнай для ўспрымання падлеткаў, якім у першую чаргу адрасаваўся спектакль «Пузыркі».

Характэрныя рытмы і танальнасць выказвання ўласцівы п'есе А. Алексіна «Пойдзем у кіно?..». І без таго няспешную хаду падзей драматург быццам бы знарок прытрымлівае, прапануючы ўгледзецца ў кожную дзеючую асобу, услухацца ў любое слова і не спяшацца з высновамі. Галоўнай матывацыяй дзеяння з'яўляецца першае, юнацкае каханне, чым і абумоўліваецца своеасаблівы лірызм твора. Гэта непаўторнае пачуццё раскрываецца праз учынкі рэальнага і ўяўнага герояў. Рэальны – васьмікласнік Андрэй з 1969 года, уяўны – яго дзядзька Валодзя, матчын брат, які загінуў на фронце ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Андрэй адкрывае для сябе наступнае: «…любить надо только того человека, который достоин любви. А радость дарить тому, кто нуждается в радости!» [1, с. 176]. Драматурга, здаецца, не бянтэжыць некаторая штучнасць фармулёвак падлетка. Галоўнае – сутнасць учынкаў, якія вызначаюць душэўныя зрухі юнага героя. Прадмет кахання Андрэя – Ліля не толькі не падзяляе яго пачуцця, але і кпіць з яго. Андрэй здолеў узняцца над уласнай крыўдай і папрасіць высакамерную васьмікласніцу, каб яна больш клапацілася аб сваім бацьку. Праз трыццаць гадоў у старой энцыклапедыі Андрэй знаходзіць «Ліст у 1970-ы год», напісаны дзядзькам Валодзям да сваёй каханай. У пошуках адрасата ён аказваецца перад маральным выбарам: зрабіць фармальна і аддаць ліст той, якая і ў школе не звяртала ўвагі на Валодзю і цяпер ледзь успомніла яго, ці ўтаіць праўду і прынесці свята з лістом той, хто Валодзю кахаў і ўсё яшчэ кахае. Андрэй спыняецца на апошнім. Перажыванні героя, праца яго душы зусім не штучныя, пытанне ж «пойдзем у кіно?» становіцца сувязным звяном у дыялогу пакаленняў.

Спектакль «Пойдзем у кіно?..» вырашаўся ў жанры лірычнай драмы. Рэжысёр І. Папоў не проста перадаваў стыль аўтарскага пісьма. У яго інтэрпрэтацыі лірычны матыў узбагачаўся псіхалагічнымі фарбамі і адценнямі, што дазваляла паміж іншым зняць пэўную рытарычнасць «датской» п'есы. На тую пару было прынцыповым, што да гэтага ўзбагачэння рэжысёр ішоў праз выяўленне акцёрскай індывідуальнасці, праз дасканалую распрацоўку характараў.

Выразна раскрываліся лёсы трох розных жанчын: маці Андрэя Людмілы Васільеўны, Клаўдзіі Філімонавай і Мар'яшы. Актрысы Р. Маленчанка, С. Ніканчык і Л. Горцава будавалі ролі на празрыстым перапляценні мінулага – юнацтва і цяперашняга часу – сталасці сваіх гераінь, што рабіла вобразы адметнымі, іх сцэнічнае жыццё эмацыянальна напоўненым. Крыху аднабаковым успрымаўся Міхалёў (Б. Барысёнка). Выканаўца засяродзіўся на побытавых складанасцях, няўпэўненасці персанажа перад жонкай і дачкой, але не выявіў матываў такога душэўнага стану Міхалёва. Колішняе юнацтва не ўвайшло ў біяграфію вобраза, і ён пазбавіўся характэрнай лірычнай афарбоўкі.

Сапраўднай рухаючай сілай спектакля быў у пэўнай ступені антыпод Міхалёва – яго малады сучаснік Андрэй у выкананні С. Жураўля. Рэжысёр дапамог акцёру выйсці з кола аднатыпных прац і ўпэўнена раскрыцца ў ролі васьмікласніка, які праходзіць складаны шлях сталення асобы.

Абнаўленчыя павевы адчуваліся ў спектаклі «Уся надзея» М. Рошчына. У сцэнічным творы шчырую цікавасць выклікалі і актуальная праблема, і яе мастацкае асэнсаванне.

У драме М. Рошчын знаходзіць своеасаблівы паварот так званай «тэмы падлеткаў». У адрозненне, напрыклад, ад розаўскіх хлопчыкаў яго героіні – учарашнія школьніцы і сённяшнія навучэнцы ПТВ – Надзя Белаглазава, яе сяброўкі Лянок, Бухара і Жырафа не бунтуюць, не ламаюць меблю ў кватэры дзеля таго, «каб дом быў чысты». У сям'і кожная існуе прыстойна. Сапраўднае жыццё гэтых дзяўчынак – вуліца, тут яны сцвярджаюць сябе, сцвярджаюць дзёрзка, часам бязлітасна.

Праз вобразы Надзькі, Лянка, Бухары і Жырафы ў п'есе і асабліва ў спектаклі раскрывалася абвостраная ўспрымальнасць дзяўчынак, іхняя агульная ўнутраная цяга да дабрыні, ад якой яны самі ж і бягуць, як ад чумы. Разам з тым тэатр, уваходзячы ў становішча «цяжкога ўзросту», жорстка ставіў пытанне і перад дарослымі: ці не з'яўляецца ў сапраўднасці адвольнае стаўленне дарослых да падлеткаў прамым вытворным іх раўнадушша? У хуткім часе і чыноўнікі ад мастацтва мусілі загаварыць аб тым жа: «Мы павінны прызнаць, што іх (падлеткаў. – *А. С.*) пагарду да свету дарослых мы заслужылі – сваім двудушшам, канфармізмам, гатоўнасцю да кампрамісаў, непамерным ужываннем гучных слоў і прыгожых фраз» [9, с. 28].

Рэжысёр У. Караткевіч драматызаваў дзеянне праз асобныя эмацыянальна напружаныя сцэны, у якіх раскрываўся жыццёва верагодны і адначасова па-мастацку абагульнены вобраз. Так, драматургічным вузельчыкам стала сцэна ў парку, дзе Лянок, Бухара і Жырафа па звычцы разыгрывалі прахожых, выпрошваючы ў іх пятакі ды двушкі; Надзька ж, як і належыць «лідару», разжаліўшы жанчыну сваім уяўным сіроцтвам, дзеля забавы атрымлівала ад яе слоік венгерскага кампоту. Абвастрала канфлікт сцэна ў кватэры мамкі Клаўдзі, дзе, не цырымонячыся перад дзяўчынкамі, раскрывала душу мамка Шура, якая прыляцела за Надзенькай з Далёкага Усходу і не прапускала цяпер моманту назваць яе сваёй «ракавой памылкай». Узнімала градус драматызму сцэна, калі Надзька, якую, здавалася, ужо нічым не праймеш, якая нават і прасіць не ўмела – адно патрабаваць, маліла лейтэнанта Арлоўскага ўзяць яе ў Свярдлоўск – гэта значыла туды, дзе жыццё пачнецца па-новаму, без абрыдлага ўжо «балдзення», без адчування ўласнай непатрэбнасці.

Ашаламляльныя, насцярожваючыя, кранальныя – гэтыя і іншыя падзеі адбываліся ў спектаклі на фоне дарогі, якая ахоплівала ўвесь заднік сцэны. Роўная і вялікая, яна з'яўлялася важным сэнсавым кампанентам у сцэнаграфіі Л. Рулёвай. Мастак быццам бы ў здзіўленні пыталася: хіба цяжка правільна прайсці па ёй?! Раздзяляльная паласа засцерагае ад сутыкнення з сустрэчным рухам. Дарожныя знакі дрэннае забараняюць, пра небяспечнае папярэджваюць. Які ж шлях выберуць дзяўчынкі? Зараз іх захапіла вуліца, яна стала для іх месцам для забаў, для жыцця, па сутнасці запаўняючы духоўны вакуум, які акружаў кожную з іх у сям'і. Нібы дзейны заклік, драматычным падтэкстам гучалі словы вучонага-псіхолага: «Родитель! С тебя лепится первообраз мира! Глубина отпечатка, оставляемого тобой в душе, никакому сравнению не поддаётся – сильнее этого только сама Природа» [3, с. 313].

Ставячы неабходны эмацыянальна-лагічны акцэнт на цяжкім узросце дзяўчынак, рэальна, часам натуралістычна адлюстроўваючы ценявыя бакі сямейных адносін, стваральнікі спектакля ў сваім вырашэнні «тэмы падлетка» не ідэалізавалі гераінь. Выканаўцы роляў Надзькі (В. Кавалерава), Лянка (Г. Ільчанка), Бухары (Р. Астрадзінава) і Жырафы (А. Перавожкіна) надзялялі сваіх персанажаў запамінальнымі індывідуальнымі рысамі, якія ўносілі жывыя фарбы ў паводзіны кожнай з сяброўак.

З падмосткаў бескампрамісна даводзілася, што кола інтарэсаў гераінь вузкае, але не замкнёнае. Абмежаванае сёння духоўнае жыццё дзяўчынак заўтра можа і павінна абавязкова напоўніцца сапраўднымі чалавечымі пачуццямі і каштоўнасцямі. Пастаноўкай гэтага прынцыпова важнага пытання У. Караткевіч імкнуўся раскрыць сацыяльна-этычныя праблемы нашага грамадства.

Своеасаблівая супярэчнасць выяўляецца ў тым, што з «перабудовай», якая надзвычай абвастрыла грамадскую свядомасць, у ТЮГу сучасная тэма атрымлівае пераважна аблегчанае сцэнічнае ўвасабленне. Больш за тое, аналіз пастановак адкрыта пацяшальнага характару паказвае, наколькі актыўна яны «пазбаўляліся» ад маральных установак і мастацкага густу. Дэманструючы надуманую верагоднасць сюжэта, спектаклі «Аперацыя «Дарагі хлопчык» С. Міхалкова і «Як я быў вундэркіндам» А. Вольскага і У. Машкова (абодва – 1986) яшчэ вылучаліся шэрагам жывых

эпізодаў, нязмушаным выкананнем асобных роляў. Сцэны са школьнага жыцця «Супер-ША» (1992, 1995) і «2222» (1999), прыдуманыя і пастаўленыя Ю. Вута, ужо абсалютна выбіваліся з этычнай і культурна-мастацкай плоскасці. У выніку такіх неабдуманых і нядбайных адносін да актуальнай тэмы аказваецца, што з канца 1990-х гг. сучаснасць увогуле знікае з падмосткаў ТЮГа, і гэта істотна абмяжоўвае прастору дзіцячага тэатра.

Даследаванне праблем сцэнічнага адлюстравання рэчаіснасці і характару іх вырашэння ў практычнай дзейнасці Беларускага тэатра юнага гледача дазваляе заключыць наступнае. Сучасная праблематыка з'яўляецца неад'емнай сферай творчых пошукаў тэатра для дзяцей і падлеткаў. Спектаклі гэтага кірунку складаюць сутнасць дачыненняў тэатра са сваёй своеасаблівай аўдыторыяй. Практыка такіх узаемаадносін супярэчлівая і неадназначная. Ад пачатку калектыў ствараўся як тэатр сучаснай тэмы, і яе матывацыю вызначалі перш за ўсё сацыяльныя механізмы ўключэння дзяцей у свет прыгожага. Са зменай грамадскіх прыярытэтаў узнікаюць магчымасці інтэрпрэтаваць сучасную праблематыку з пункту гледжання агульначалавечых каштоўнасцей, аднак тэатр фактычна самаўхіляецца ад працы над ёй. Адсутнасць сучаснай п'есы ў рэпертуары ТЮГа сведчыць пра вельмі дрэннае становішча нацыянальнага дзіцячага тэатра.

## Літаратура


1. А л е к с и н, А. Пойдем в кино?.. / А. Алексин // Театр. – 1977. – № 7. – С. 157–176.
2. Б о ж о в и ч, Л. И. Избранные психологические труды. Проблемы формирования личности / Л. И. Божович. – М.: Междунар. пед. акад., 1995.
3. Л е в и, В. Л. Нестандартный ребенок / В. Л. Леви. – Хабаровск: Кн. изд-во, 1990.
4. М у ш ы н с к і, М. У барацьбе за годнасць мастака і грамадзяніна / М. Мушынскі // Зарэцкі, М. Зб. тв.: у 4 т.– Мінск, 1989 – 1992. – Т. 4. – С. 390–407.
5. П я т р о в і ч, С. А. Дзіцячы тэатр БССР (1931 – 1941 гг.) / С. А. Пятровіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983.
6. П я т р о в і ч, С. У адной маскоўскай кватэры / С. Пятровіч // Мінская праўда. – 1958. – 13 верас.
7. П я т р о в і ч, С. Шукаць сваё, непаўторнае / С. Пятровіч // Тэатральны Мінск. – 1981. – № 2. – С. 25–29.
8. Т о л с т о й, Л. Н. Собр. соч.: в 22 т. Т. 1: Детство. Отрочество. Юность / Л. Н. Толстой. – М.: Худож. лит., 1978.
9. Тэатр – дзецям // Тэатральны Мінск. – 1988. – № 4. – С. 27–33.
10. Х м е л и к, А. Друг мой, Колька!: Пьесы / А. Г. Хмелик. – М.: Сов. писатель, 1980.


*A. A. SAVITSKAYA*

**MODERN PROBLEMS IN THE REPERTOIRE OF THE CHILDREN'S THEATRE (PRACTICES OF THE BELARUSIAN THEATRE OF THE YOUNG SPECTATOR)**

## Summary

In the article one of key problems of the children's theatre functioning – creation of modern repertoire for teenagers has been considered. Author marks prominent features of teenage age and opens their value for performances on a vital topic. Social, cultural and art aspects of its embodiment at different stages of activity of the Belarusian Theatre of the young spectator have been investigated.

*УДК 72.012(476)*

*Н. В. МУРИНА*

# АУТЕНТИЧНОСТЬ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ОБРАЗА СОВРЕМЕННОЙ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛАРУСИ

*Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы НАН Беларуси*

*(Поступила в редакцию 02.08.2011)*

На протяжении всей истории развития архитектуры можно наблюдать естественное стремление людей к образу совершенства в искусстве зодчества и самовыражению через создание индивидуальных художественных образов. В разные времена такие стремления рождали устойчивые формы и особые аутентичные образы и образцы жилых и гражданских зданий, сооружений.

Существование такого рода аутентичных образцов стало главной особенностью развития архитектуры и формирования человеком своего окружающего пространства. В основе их формообразования концентрировались накопленные знания и эволюционно проверенный опыт поколений. Это в значительной мере и определило механизмы генезиса архитектуры в той форме, которую мы наблюдаем сейчас, ее существование как культурного явления. А. В. Иконников раскрывает сложную зависимость архитектурной формы от общественного назначения произведений зодчества. Здесь же автор отмечает закономерности восприятия и эстетической организации формы: «Форму определяют среда, культура и функция» [1–2; 3, с. 21].

Ощущение аутентичности среды обитания в локальной местности исторически определялось тем конкретным пространством, в котором некогда проживали люди, создавшие селения и освоившие ландшафт. Эта локальная среда в совокупности с природными и рукотворными объектами обретала неповторимый уникальный образ. Природно-ландшафтные особенности местности и предметно-пространственной среды закреплялись в сознании, делались архетипом и, в конечном итоге, становились компонентами образного представления о родном крае, родном уголке. В психоэмоциональном понимании «родны кут» ассоциировался с конкретным пейзажем. Где бы человек ни находился, вспоминая родные места, он рисовал в воображении дорогие сердцу «краявіды» [4]. Родная среда современного поколения белорусского народа – это крупные и малые города, местечки и деревни, это сочетание новых технологий и архаичных традиций, которые влияют друг на друга, видоизменяются и создают колорит современной Беларуси.

М. В. Шубенков смотрит на проблемы и генезис архитектурного формообразования с точки зрения «структурной архитектоники», которая характеризует естественнонаучное изучение строения пространственной формы архитектурных объектов и приводит к поискам закономерностей, объясняющих механизмы пространственного формообразования и формоизменения. Исследователь отмечает, что структура представляет собой совокупность устойчивых связей объекта, обеспечивающих его целостность и тождественность самому себе, т. е. сохранение основных свойств при различных внешних и внутренних изменениях [5].

Вопросы структуры, комбинация оси симметрии с плоскостями симметрии, использование различных модулей природного происхождения в законах композиции различных видов искусств рассматриваются в исследованиях А. В. Шубникова: «Понятие симметрии входит в искусствознание через понятие структуры. Искусство как образная форма познания и моделирования мира должно отражать и действительно отражает его структурную сторону. Структурность – достаточно общий закон, форма существования и движения материи, и этому закону подчинены также продукты научного и художественного творчества» [11].

Обращение к природным формам и образам прослеживается на протяжении всей истории архитектуры. Пространственные сочетания этих форм становились прообразами таких художественных архитектурных решений, как мотив лотоса в колоннаде египетских храмов, мотив леса в интерьерах готических соборов и т. д. В современной архитектуре сформировалось целое направление, в основе которого лежит обращение к природной форме и процессам ее формообразования, это направление получило название архитектурная бионика. Исследования в отношении формообразования с позиции архитектурной бионики выявляют, например, что для формы, структуры и пространства в динамике исторического развития характерно включение в себя предыдущих достижений. Происходит сложение и накопление опыта, часто приводящее к усложнению форм. Это проявляется во все усложняющейся современной системе градостроительного пространства, хотя отдельные здания, сооружения могут быть и простыми, несмотря на сложность их конструктивной структуры. Развитие функции, наоборот, основывается на принципе исключения: новое не может в итоге сосуществовать со старым и происходит замена устаревшего новым [10, с. 2, 29].

Принципы формообразования в природе созвучны традиционным. Так, геометрические орнаменты в архитектуре и других видах изобразительного искусства совпадают по построению с проекциями структур кристаллов. Другими словами, жизнь и ее проявления присутствуют и развиваются в универсальных геометрических формах. Особенности перехода от плоскости к пространству, взаимодействие имеющих определенную форму двухмерных фигур и трехмерных существ, способных передвигаться в пространстве, характерны для творчества М. К. Эшера, который стремился иллюстрировать динамику явления. М. К. Эшер создал уникальную галерею картин, которые иллюстрируют теорию относительности А. Эйнштейна, строение материи, геометрические преобразования, топологию, кристаллографию, физику, и исследовал пластические аспекты понятий бесконечности и симметрии. Одним из любимых геометрических объектов художника была лента Мебиуса. Он создавал на своих картинах оптические иллюзии, в основном с помощью светотени. Например, на картине «Куб с полосками» невозможно определить, в какую сторону обращены объемные «пуговицы», расположенные на ленте. Многогранники в работах М. К. Эшера играют роль как основной фигуры, так и вспомогательных элементов «игры» с логикой пространства.

Проблема поиска национальной и индивидуальной аутентичности, поиски новой национальной аутентичности и собственного места в новом европейском сообществе стали как никогда актуальными после образования Европейского союза. Пластичная природа художественного в архитектуре обусловливает постоянную трансформацию в контексте историко-культурных изменений. Возникает проблема аутентичности художественного в условиях современной культуры.

Вопрос об аутентичном сознании всегда представлен в историко-культурном контексте, в обстоятельствах которого взвешиваются шансы нации и индивидуума на выживание в новою эпоху. Обращение к корням, национальной уникальной культуре, культурно-исторической аутентичности актуализируется в эпоху «перемен» на протяжении всей истории искусств, как в архитектуре, так и в других видах искусства.

Однако в современных условиях технического прогресса, с появлением компьютерных технологий, множественность образов современной архитектуры упраздняет соотношение оригинал-копия. Снижаются актуальность и необходимость существования оригинала как основы репрезентации. Сегодня стремительный рост количества художественных образов разнообразного характера благодаря возможности их технического репродуцирования обусловливает сущностную трансформацию природы художественного в архитектуре.

Аутентичность произведения искусства невозможно воспроизвести. Усиление процессов репродуцирования привело к дифференциации аутентичности, выделению некоторых ее уровней. Тема идентичности и аутентичности искусства многонациональной культуры рассматривается сегодня как одна из важнейших проблем начала XXI в. Принцип аутентичности (принцип соответствия самому себе) является важным ретранслирующим средством идентификации современных произведений архитектуры.

Анализ современной белорусской архитектурной практики показывает развитие традиционных подходов, которые ориентируются на создание пластических, контекстуальных, насыщенных

деталями объектов, и их взаимосвязь с современными техническими достижениями. Так, применение больших прозрачных остекленных поверхностей в городской среде способствует размытию границ, облегчению объема здания. Заслуживают внимания верхний уровень сооружений, элементы завершения зданий и входные группы. Детали высотных завершений способны дополнить ощущение легкости, воздушности. Усложнение взаимоотношения пространства и объема традиционно для Беларуси. Разрушение жесткости границ и внедрение наружного и внутреннего воздушного пространства во многом становились основой психологического комфорта архитектурной среды. В современной архитектурной практике этот композиционный принцип активно используется на основе новых конструктивно-технических решений [6].

В архитектурно-художественных решениях сельской среды прослеживается преемственность традиционного: более мелкий масштаб и этажность, скромность в использовании декора, верность традиционному планировочному решению, пропорциональные соотношения основных частей здания, общего решения и деталей, особенно в таких регионах, как Центральная Беларусь, Поозерье, Понеманье. Общее направление развития принципов в формообразовании архитектуры и их аутентичная составляющая выявляются при рассмотрении строительной культуры городской и сельской среды, градостроительной иерархии и типологической дифференциации в Беларуси.

Сегодня процессы архитектурной деятельности предопределены высокими технологиями и быстрым темпом развития строительной индустрии. Во все ее сферы активно проникают компьютерные технологии. Скорость и обширность замены традиционных профессиональных инструментов и методов грозят потерей накопленного предшествующими поколениями опыта и подменой его универсальной технократической культурой, обслуживающей сегодня области инженерно-технического и информационно-технологического проектирования. Ведь основные из применяемых сегодня архитекторами проектных программ первоначально разрабатывались для решения инженерных, а отнюдь не художественно-эстетических задач, и это определило характер их интерфейсов.

Благодаря новым технологиям сегодня репрезентативность в архитектуре получила невероятные возможности для художественного выражения акцентированием вертикали. Процесс вертикального роста городов глобален и копируется. Необдуманное следование моде на небоскребы, погоня за новыми национальными и иными символами вызывают художественную дисгармонию с традиционными архитектурными и историко-культурными ландшафтами. Учитывая развитие технологий и возрастающую с каждым днем цену земли, в обозримом будущем высотные постройки станут совершенно обыденными, и небоскреб перестанет быть символом успеха, а вектор успешности будет иным. Анализируя взаимосвязь и влияние различных факторов, художественно-конструктивных тенденций и стремлений архитектурной мысли в процессе формообразования высотных групп Беларуси, остается лишь надеяться на рациональный подход архитекторов при проектировании таких объектов.

Обращение к традициям национальной культуры, спроецированное на современность, позволяет учесть трудноисправляемые ошибки, с которыми столкнулись многие мировые города. В них трехмерность и величина искусственного ландшафта вызывающе конкурируют с природными формами окружения и исторической аутентичной застройкой, подавляя ее, нарушая связность и преемственность уже построенного и строящегося. Необходимо соединить имеющееся архитектурное наследие эпох в единый минимально разбалансированный эстетически ансамбль. Так, в традиционной культуре Беларуси имеются архетипы высотной застройки, выраженные в архитектуре башенных форм. Высотные доминанты гармонично поддерживаются ландшафтом. Их появление обусловлено большими открытыми пространствами. Развивая и поддерживая традицию ратуш и башен, формировавших систему доминант, служивших средством закрепления нового пространства, современное высотное строительство сохраняет аутентичные подходы к формообразованию в архитектуре. Наряду с практическим назначением башен возникли символические смыслы башенных форм. Для белорусской культуры эти смыслы образует глубинный пласт значений, общий для современного города и его исторических прототипов. Частичный перенос этих значений на современный город мог бы соединить эпохи, стимулировать творческий поиск

новых средств и приемов выразительности, художественное воплощение современных и исторических достижений науки и техники, устремление сохранения и внедрения традиционных подходов в архитектурном формообразовании. Все это делает архитектуру визуальным выражением культуры страны и ее достижений.

В. Глазычев отмечает, что «архитектура – дорогое искусство, однако история доказала, что нет более выгодного капиталовложения, чем создание архитектурного шедевра... За последние 30 лет 300 миллионов человек побывали в Афинах, в Риме или Венеции только затем, чтобы «посмотреть на старые камни» [7, с. 7]. Архитектурное пространство, с одной стороны, моделирует универсум, а с другой – оно моделируется универсумом. С этим связан высокий символизм всего, что так или иначе относится к создаваемому человеком пространству его среды жизнедеятельности. «Важный аспект внутреннего диалога культуры складывается исторически: предшествующая традиция задает норму, имеющую уже автоматизированный характер, на этом фоне развивается семиотическая активность новых структурных форм» [8].

Многие исследователи традиционной архитектуры и традиций, лежащих в ее основе, выделяют принципы, которые закрепляются как некие устоявшиеся аутентичные местные нормы, отличающие архитектуру одного ареала от другого. Целостность и гармоничность такого формообразования антропогенной среды вытекают из естественности и закономерности природного мироустройства, обнаруживая свои корни и закономерности в архаической архитектурной традиции и проверенном веками коллективном аутентичном народном строительном опыте. Природно-ландшафтные особенности местности закреплялись в сознании, делались архетипом и, в конечном итоге, становились компонентами образного представления о родных местах. Локальная среда вместе с природными и рукотворными объектами формировала неповторимый образ родного уголка. «Это был мир образности, одухотворенности, гармонии… Характер застройки селения, масштаб, силуэт в сочетании с природными компонентами определяют устойчивый образ среды, психологическую привязанность к ней» [8, с.8]. Имея образ страны башен и укромных, уютных, пейзажных местечек, Беларусь и сегодня не утратила свою художественную выразительность, влияющую на облик современной архитектуры.

Итак, исходя из изложенного, аутентичность художественного образа архитектуры Беларуси заключается в многообразии форм, их преемственности и развитии.

Современной архитектуре присущи такие аутентичные формы, как:

1) башенные с различной формой завершений, ярусным развитием;
2) линейные, однорядные и многорядные в плане;
3) формы, раскрывающие внутреннюю сущность здания (ордера, членения, купола);
4) продиктованные адаптацией к среде;
5) формы на основе геометрических фигур, в том числе гиперболоидов, параболоидов, трапециоидов;
6) концептуальные производные от заранее заданной формы и конкретных параметров;
7) проистекающие из градостроительной контекстуальности и являющиеся переходами, шинами между зданиями и рекреациями, экранами;
8) органически связанные с ландшафтной архитектурой (альпийскими горками, портерами цветов и декоративных кустарников);
9) бионизированные, производные от форм живой природы.

Среди новейших достижений в развитии архитектурных форм можно выделить гибкие структуры, кинетические и трансформируемые формы, киберпространственные и иллюзорные формы.

Для создания всех этих форм используются различные принципы на основе малофакторного и многофакторного формообразования, как универсальные, так и специальные, как обычные, так и уникальные. Выбор этих принципов обусловлен решением конкретных градостроительных, архитектурных и социокультурных задач, продиктован логикой необходимости достижения заданных свойств конечного результата. На фоне различных универсальных принципов формообразования (принцип аутентичности, системности, целесообразности, тектоничности, гармонизации, выразительности, гибкости, органичности и другие принципы) можно выделить отличительные особенности этих принципов, присущие различным территориальным ареалам. Это

контекстуальность решений, светотеневые эффекты с помощью навесов и галерей, преобладание горизонтальных членений, пластичность фасадов и цветовая гамма колористических решений, вариации форм завершений строений, а также другие особенности. Они являются аутентичной составляющей основ формообразования и художественной выразительности в современной архитектуре. Выявление и использование этих особенностей позволит создавать современные архитектурные сооружения, имеющие аутентичные образы, развивающие ареальные различия, а также решать различные формообразовательные проблемы в современной архитектуре, проблемы, связанные с поиском национальной и индивидуальной аутентичности в природе художественного, развития традиций формообразования в архитектуре, решения художественных атрибуций.

Системный характер европейского архитектурного формообразования позволяет рассматривать процесс создания аутентичных архитектурных форм как сложную управляемую систему с различными элементами, имеющими собственные ранги в зависимости от классификации и места в иерархии этой системы. В процессе тиражирования элементов системы и их репродукции (аналоги существующих), попадая в новые условия, получают дополнительные, в том числе аутентичные, качества и свойства, ареальные отличия. Понятие универсальности в отношении системы формообразования и принципов, лежащих в ее основе, скорее затрагивает наиболее подобные и репрезентативные элементы, свойства и феномены этой системы, совокупность которых имеет как мировое, так и универсальное значение.

## Литература


1. А р с л а н о в, В. Г. Западное искусствознание XX века / В. Г. Арсланов. – М. : Традиция : Академический проект, 2005. – 861 с.
2. З е д л ь м а й р, Г. Искусство и истина: теория и метод истории искусства / Г. Зедльмайр; пер. с нем. Ю. Н. Попова. – СПб. : Axioma, 2000. – 272 с. : ил.
3. И к о н н и к о в, А. В. Художественный язык архитектуры / А. В. Иконников. – М. : Искусство, 1985. – 175 с.
4. Л о к о т к о, А. И. Традиционная выразительность обитаемой среды белоруса: [о природ.-ландшафт. местностях Беларуси] / А. И. Локотко // Архитектура и строительство. – 2004. – № 5. – С. 28–31.
5. Ш у б е н к о в, М. В. Структура архитектурного пространства: автореф. дис. ... д-ра архитектуры / М. В. Шубенков. – М., 2006.
6. С е р г а ч е в, С. Пространство и объем в архитектуре / С. Сергачев, В. Миронов // Архитектура и строительство. – 2009. – №10 (209).
7. Г л а з ы ч е в, В. Л. Архитектура : энциклопедия / В. Л. Глазычев. – М.: РШЦ «Дизайн. Информация. Картография»; ООО «Изд-во Астрель»; ООО «Изд-во АСТ», 2002. – 672 с. : ил.
8. Л о т м а н, Ю. Архитектура в контексте культуры / Ю. С. Лотман. – СПб.: «Искусство – СПб», 2000. – С. 677–678.
9. Л о к о т к о, А. И. Архитектурное наследие Беларуси (развитие традиций, охрана и реставрация) / А. И. Локотко. – Минск: ИООО «Право и экономика», 2004. – 303 с.
10. Л е б е д е в, Ю. С. Архитектурная бионика / Ю. С. Лебедев. – М.: Стройиздат, 1990. – 269 с.
11. Ш у б н и к о в, А. В. Симметрия в науке и искусстве / А. В. Шубников, В. А. Копцик. – М.; Ижевск: Ин-т компьютерных исследований, 2004. – С. 367.


*I. V. MURINA*

**AUTHENTICITY OF THE ARTISTIC IMAGE OF THE MODERN ARCHITECTURE OF BELARUS**

## Summary

This article is based on the analysis and assessment of constructions and traditions on the modern architectural shaping. Also it discloses certain approaches which contribute to development and conservation of the national peculiarities in architecture and authenticity of the artistic image.

ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 4 2011
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 791.43.03+821.161.3.09.(092)*

*К. І. РЭМІШЭЎСКІ*

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І ЭВАЛЮЦЫЯ МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ПАРАДЫГМЫ Ў ЭКРАННАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 02.08.2011)*

*Да 120-годдзя з дня нараджэння*
*Максіма Багдановіча*

Розныя аспекты жыцця і творчасці выдатных беларускіх празаікаў, паэтаў, драматургаў прыцягвалі ўвагу беларускіх кінематаграфістаў з моманту ўзнікнення нацыянальнай кінаіндустрыі, аднак доўгі час гэтая праблематыка заставалася на перыферыі тэматычных прыярытэтаў. У першую чаргу гэта тлумачыцца тым, што мемарыяльная парадыгма, у рамках якой часцей за ўсё ствараліся такія фільмы, стала звыклым інструментам ідэалагічнага суправаджэння тэматычнага плана дакументальнай і навукова-папулярнай кінавытворчасці толькі ў канцы 1950 – пачатку 1960-х гадоў. Выключэннем з’яўляецца першы ў беларускім кіно дакументальны фільм-партрэт «Народны паэт» (1952), створаны на кінастудыі «Беларусьфільм» да 70-годдзя класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Да стварэння 20-хвіліннай стужкі былі прыцягнуты найбольш вопытныя на той момант кадры беларускай кінематаграфіі: рэжысёр Юрый Тарыч і аператар Уладзімір Акуліч. Сцэнарый быў напісаны Максімам Лужаніным, а дыктарскі тэкст – Андрэем Макаёнкам. Гэта рэдкі і, верагодна, унікальны прыклад, калі функцыі аўтараў сцэнарыя і дыктарскага тэксту былі размежаваны.

Толькі дзесяццю гадамі пазней у беларускім неігравым кіно быў створаны другі дакументальны фільм-партрэт – стужка «Янка Купала» (1962), прысвечаная 80-годдзю вялікага беларускага паэта. Гэта быў фактычна першы вопыт рашэння задач канструявання апавядання «адлюстравана», галоўным чынам на іканаграфічным матэрыяле – да моманту стварэння фільма Я. Купалы ўжо дваццаць гадоў не было ў жывых. Лірычная інтанацыя кінаапавядання была прадвызначана пранікнёным і разам з тым інфармацыйна ёмістым дыктарскім тэкстам, напісаным беларускім паэтам, пісьменнікам і кінасцэнарыстам Анатолем Вялюгіным.

Зразумела, двума фільмамі-партрэтамі класікаў беларускай літаратуры экранны кіналетапіс Беларусі, што адлюстроўваў падзеі і персаналіі літаратурнага жыцця рэспублікі, на той момант не вычэрпваўся. Асобныя падзеі (юбілеі, сходы, прэм’еры і іншыя культурныя мерапрыемствы, якія маюць грамадскі рэзананс) фіксаваліся на кінаплёнку і ўключаліся ў форме падзейных хранікальных сюжэтаў у выпускі кінаперыёдыкі: сюжэт «Памяці народнага песняра», прысвечаны чацвёртай гадавіне смерці Я. Купалы (кіначасопіс «Савецкая Беларусь». – 1946. – № 15–16); сюжэт «Пясняр беларускага народа» пра лаўрэата Сталінскай прэміі Максіма Танка («Савецкая Беларусь». – 1948. – № 8) і шэраг іншых. Аднак вельмі абмежаваны аб’ём (1,5–2,5 хвіліны экраннага часу), кароткачасовасць выкарыстання ў пракаце і падкрэсленая інфармацыйнасць такіх сюжэтаў пазбаўлялі іх аўтараў ад неабходнасці вырашаць складаныя задачы сюжэтапабудовы, трактаваць падзеі і з’явы асаблівым чынам. Выбар персон – дзеячаў беларускай літаратуры, якія траплялі ў кадр беларускіх кінахранікёраў у сувязі са здымкамі той ці іншай падзеі, – дэманструе асцярожную выбіральнасць аўтараў і рэдактараў студыі. Фарміраванне «палітыкі памяці» ў гэтым кантэксце нярэдка разглядалася як свабодны працэс маніпуляцыі з падатлівым гістарычным ма-

тэрыялам. Часцей за іншых у кадрах хронікі пасляваеннага перыяду можна ўбачыць (і, адпаведна, пачуць згадванне іх імёнаў у дыктарскім тэксце) Я. Коласа, А. Куляшова, М. Лынькова, К. Крапіву, М. Танка, П. Броўку, П. Глебку, І. Шамякіна, драматургаў К. Губарэвіча, А. Макаёнка [2].

У выніку дбайнага аналізу велізарнага масіву беларускага кіналетапіснага матэрыялу (датаванага раней за 1971 год), праведзенага аўтарам артыкула ў апошнія гады, згадвання паэтычнай ці публіцыстычнай спадчыны Максіма Багдановіча або памятных месцаў, звязаных з яго жыццём і творчасцю, пакуль што не знойдзена.

Відавочна, што прычынай замоўчвання былі важкія, з пункту гледжання асоб, адказных за фарміраванне сцэнарнага партфеля кінастудыі, падставы. Галоўнай прычынай такога становішча была патаемная – далёка не заўсёды відавочная – ідэйная неадпаведнасць паэтычнай і публіцыстычнай спадчыны паэта прапагандысцкай дактрыне, якая ляжала ў аснове функцыянавання ідэалагізаванай сістэмы «кінавытворчасць–кінапракат» і шчодра забяспечвала матэрыяльнымі рэсурсамі яе паскоранае развіццё (асабліва ў 1960-я гады) [9].

З пазіцый сённяшняга часу няпроста растлумачыць феномен, што ў 1960-я гады, калі інтэнсіўнасць вытворчасці неігравых фільмаў у Беларусі дасягнула свайго апагея – у год ствaралася да 40 дакументальных, навукова-папулярных і вучэбна-прапагандысцкіх стужак агульнай працягласцю да 90 частак (15 гадзін экраннага часу) – аб дзеячах нацыянальнай літаратуры, за выключэннем ужо згаданага фільма пра Я. Купалу, не было створана практычна ніякай аўдыявізуальнай прадукцыі. 1960-я гады – перыяд выбухной «фармальнай эмансіпацыі» сусветнага неігравога кіно (у тым ліку і беларускага), экспансіі ў невядомыя раней тэматычныя і стылёвыя прасторы – на паверку аказваюцца даволі скупымі і кансерватыўнымі ў дачыненні да культурнай тэматыкі. Удвайне гэтае сцвярджэнне справядліва ў тых выпадках, калі такая тэматыка магла справакаваць нечаканы «выхад» у нацыянальную культурную ідэю.

Тэматычны «прарыў» прыйшоўся на пачатак 1970-х, калі і на кінастудыі «Беларусьфільм», і ў нядаўна створаным творча-вытворчым аб'яднанні «Тэлефільм» Дзяржтэлерадыё БССР актывізаваўся працэс стварэння стужак, прысвечаных выдатным дзеячам беларускай літаратуры. Толькі за два гады (1971–1972) на студыі «Летапіс» былі зняты фільмы «Якуб Колас» (сцэнарый Г. Бекарэвіча, рэжысёр В. Сукманаў), поўнаметражны пра Я. Купалу «А зязюля кукавала...» (сцэнарый А. Вялюгіна, рэжысёр В. Дашук), пра А. Куляшова «Край крынічны» (сцэнарый В. Бязручкінай, рэжысёр В. П. Цяслюк), а таксама некалькі фільмаў у аб'яднанні «Тэлефільм» (у цэнтры ўвагі апынуліся Я. Купала, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Лужанін).

Відавочна, што тэма спадчыны М. Багдановіча магла аказацца ў «сферы доступу» беларускіх кінематаграфістаў толькі пасля «ідэйнай рэабілітацыі» паэта ў «верхнім эшалоне» літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства. Для гэтага афіцыйны пункт гледжання на ўклад пісьменніка ў нацыянальную літаратуру неабходна было прывесці хоць бы ў прыблізную адпаведнасць з аб'ектыўным значэннем яго творчай спадчыны [4; 5; 7]; канчаткова і беспаваротна пераадолець абвінавачванні ў прыхільнасці да эстэтыцы сімвалізму, прыналежнасці да «міфалагічнай школы», а значыць, і ў дэкадэнцтве, і, ускосна, у нацдэмакратызме, які звязвалі з імем М. Багдановіча ў 1930–1950-я гады [1; 6; 8].

Менавіта да пачатку 1970-х гадоў намаганнямі шматлікіх беларускіх літаратараў і даследчыкаў, у прыватнасці, пісьменнікаў Алеся Бачылы, Барыса Бур'яна, бібліёграфа Ніны Ватацы (яе найцікавейшы артыкул «Пошукі творчай спадчыны Максіма Багдановіча» ўвайшоў у зборнік успамінаў «Шлях паэта» [11, с. 289–299]), вучонага-літаратуразнаўцы Мікалая Грынчыка і іншых, удалося выявіць шматлікія, раней невядомыя творы і ўзбагаціць нацыянальную культурную памяць новымі звесткамі аб яго жыцці. Паступова сфарміраваўся паліятыўны пункт гледжання, што хаця М. Багдановіч і не праявіў таго эпічнага размаху, уласцівага, напрыклад, Купале, аднак старанна распрацоўваў, шліфаваў кожны верш, кожны радок, і гэтыя радкі бліскаюць рознакаляровымі іскрачкамі, як сапраўдныя брыльянты.

Што тычыцца экраннай (галоўным чынам – кінематаграфічнай) рэпрэзентацыі культурнай памяці пра Багдановіча, забягаючы наперад, можна сказаць, што з рэжысёрамі, якім давялося сродкамі экрана знаёміць гледача з творчасцю паэта, гэтай тэме пашанцавала (як і экраннай культуры Беларусі ў цэлым).

Першы зварот кінематаграфістаў да М. Багдановіча адбыўся ў 1971 годзе, калі ў Беларусі ўпершыню шырока адзначаўся 80-гадовы юбілей паэта. Па сцэнарыі Алеся Бачылы на хранікальна-дакументальнай студыі «Летапіс» рэжысёрам Пятром Аліферанкам быў зняты двухчасткавы (19 хвілін экраннага часу) фільм «Максім Багдановіч». Рабочыя назвы фільма – «І вее верш мой дзівоснай казкай», «Цярновы вянок паэта» – даволі дакладна вызначаюць аўтарскія акцэнты ў падачы тэмы.

Нягледзячы на тое, што фільм атрымаў толькі другую катэгорыю (групу аплаты), яго ні ў якой меры нельга назваць няўдалым. Наадварот, агульныя падыходы і асобныя знаходкі, па-майстэрску рэалізаваны ў стужцы: выкарыстанне фрагментаў успамінаў бацькі паэта, архіўных фотаматэрыялаў 1907–1916 гадоў, запрашэнне акцёра П. Кармуніна для запісу дыктарскага тэксту, выкарыстанне лірычнай музыкі Ю. Семянякі, уключэнне кадраў, якія захавалі легендарную Зоську Верас (Людвіку Антонаўну Сівіцкую-Войцік) у Вільні (на жаль, у дзень здымак група не мела сінхроннай камеры) – былі творча перапрацаваны і дапоўнены ў больш позніх фільмах.

Звяртае на сябе ўвагу тое, што ва ўступных словах дыктарскага тэксту Багдановіча называюць толькі «вядомым» беларускім паэтам, што, безумоўна, уяўляецца недастатковым, палавінчатым азначэннем, улічваючы непераўзыдзены артыстызм формы яго твораў, радыкальнае ўзбагачэнне нацыянальнай паэзіі дасягненнямі сусветнай літаратуры.

Данінай традыцыі таксама можна лічыць згадванне такога факта яго біяграфіі, як удзел у сходках і мітынгах у яраслаўскі перыяд жыцця. Курортныя ялцінскія пейзажы далёка не заўсёды спалучаюцца з закадравым тэкстам па сэнсе, а аб’ём крымскіх «прыгажосцей» у выяўленчым шэрагу фільма празмерна вялікі ў параўнанні з карцінамі беларускай прыроды. Відавочна, што аўтары не змаглі вырашыць праблему «недахопу карцінкі», – некаторыя партрэты, напрыклад, пісьменніка З. Бядулі, акцёра і драматурга У. Галубка, вучонага-географа А. Смоліча, іншыя архіўныя фота ці нацюрморты бессэнсоўна падманціраваны кавалкамі даўжынёй па 5–6 і болей секунд.

У дыктарскім тэксце, які, як гэта нярэдка здаралася ў кінадакументалістыцы пасляваеннага перыяду, «жыве» незалежным ад выявы жыццём, няма згадак ні пра нядаўнія ганенні на паэта, ні пра погляды Багдановіча на нацыянальную ідэю і ролю нацыянальнай інтэлігенцыі. Для асвятлення гэтых тэм у 1971 годзе час яшчэ не прыйшоў, аднак пачатак экраннай рэпрэзентацыі тэмы жыцця і творчасці Багдановіча быў пакладзены.

У 1975 годзе вытворчае аб’яднанне «Тэлефільм» ажыццявіла пастаноўку 30-хвіліннага тэлефільма «Ля сіняй бухты» па сцэнарыі вядомага беларускага журналіста, рэдактара і пісьменніка Барыса Бур’яна. Рэжысёр У. Станкевіч і аператар У. Пранько стварылі даволі жывапісную тэатралізаваную кінаілюстрацыю ялцінскага перыяду жыцця М. Багдановіча: марскі прыбой, крымскія цясніны, пікнікі і прагулкі з дамай сэрца вярхом на конях, маляўнічыя захады і... размовы аб маючай адбыцца рэвалюцыйнай барацьбе. Несумненна прафесійная, але некалькі «пагалівудску» традыцыяналісцкая аператарская праца Уладзіміра Пранько разам з чароўнай мелодыяй «Зоркі Венеры» кампазітара Сямёна Рак-Міхайлоўскага на словы Максіма Багдановіча стварае дваістае адчуванне: у наяўнасці ўсе неабходныя атрыбуты экраннага твора, але мэта і ідэя фільма зусім не ясныя. У адсутнасці драматургічнага канфлікту, які ляжыць у аснове сцэнарыя, гэты праект адбыўся як нейкая эцюдная замалёўка, але не больш...

Нягледзячы на відавочныя недахопы, верагодна дзякуючы выяўленчасці і вельмі імпазантным акцёрам (ролю Максіма выканаў акцёр Рускага тэатра (Мінск) Валерый Шушкевіч, Веранікі – вядомая актрыса Святлана Пенкіна) у другой палове 1970-х гадоў тэлефільм неаднаразова знаходзіў сваё месца ў сетцы беларускага тэлевяшчання і, у нейкай ступені, уносіў лепту ў папулярызацыю творчасці паэта...

1981 год – год 90-гадовага юбілею паэта – стаў рубіконам у справе ўшанавання імя М. Багдановіча ў экраннай культуры Беларусі. На працягу аднаго года на экран выйшлі тры цалкам розныя (і па відавой, і па жанрава-стылёвай класіфікацыі) кінастужкі.

Першым па храналогіі стаў сюжэт «Паэтычная спадчына Максіма Багдановіча», уключаны ў кіначасопіс «Савецкая Беларусь» 1981 г., № 9 (рэжысёр кіначасопіса А. Карпаў, аператар Ю. Плюшчаў). Менш чым трохxвілінны кінасюжэт – па сутнасці, падзейны кінарэпартаж, са-

мастойна зняты нядаўнім выпускніком Інстытута кінематаграфіі, маладым аператарам Юрыем Плюшчавым, – пачынаецца з кадраў традыцыйнай выставы-продажу твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, арганізаванай у кінатэатры «Кастрычнік» у рамках свята беларускай паэзіі. Затым сюжэт працягваецца кадрамі ўрачыстага пасяджэння (у першым шэрагу сярод іншых – беларускія паэткі Яўгенія Янішчыц і Таісія Бондар) і сінхроннымі планамі пленарнага выступлення старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Максіма Танка.

Аддаючы даніну памяці Максіма Багдановіча, М. Танк кажа аб паэце як аб паўнапраўным, нароўні з Я. Коласам і Я. Купалам, удзельніку класічнага трыўмвірату беларускіх класікаў: «Ён так непарыўна звязаў свой лёс з жыццём народа і так глыбока ўжыўся ў стыхію беларускай мовы, што стаў адным з самых выдатных майстроў беларускага мастацкага слова...».

Услед за хранікальным сюжэтам выйшаў адначасткавы дакументальны фільм «Зорка Максіма» студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм», які атрымаў рэгістрацыйнае пасведчанне ў канцы снежня 1981 года і выйшаў на экраны ўжо ў наступным годзе (у цітрах пазначаны 1982 год выпуску).

Юбілейная матывацыя ўключэння фільма пра М. Багдановіча ў тэматычны план пацвярджаецца з першых кадраў урачыстага пасяджэння, прысвечанага 90-годдзю з дня нараджэння паэта (некаторыя кадры запазычаны з хранікальнага сюжэта, знятага Ю. Плюшчавым).

Абмежаванне аб'ёму стужкі адной часткай (10 хвілін) шмат у чым абумовіла абраны дасведчаным рэжысэрём-дакументалістам Рышардам Ясінскім храналагічны стыль выкладання матэрыялу – жыццю паэта ў Беларусі адведзена палова экраннага часу; ніжагародскаму, яраслаўскаму і ялцінскаму перыядам – астатнія 5 хвілін амаль роўнымі долямі.

Закадравы наратыў пісьменніка Валянціна Тараса цалкам вызначае рытм і канструкцыю апавядання: неабходнасць хоць бы пункцірна пазначыць асноўныя жыццёвыя этапы прымусіла стваральнікаў фільма не толькі быць вельмі лаканічнымі, але і перыядычна пераходзіць на скорагаворку.

Выяўленчы рад, створаны аператарам Анатолем Сіманавым, адрозніваецца высокім прафесіяналізмам: убачаны і зафіксаваны дзіўна зменлівы і кароткачасовы імпрэсіяністычны стан прыроды ідэальна спалучаецца з паэзіяй М. Багдановіча; старанна падабраны натура і прадметнае асяроддзе; з нешматлікага іканаграфічнага матэрыялу, які быў у распараджэнні кінагрупы, створаны ўдалыя нацюрморты.

Але якой бы стылістычна дакладнай ні была б выява, яна толькі ілюструе дыктарскі тэкст, які выконвае дамінуючую функцыю і недвухсэнсава ўстанаўлівае каштоўнасныя прыярытэты. Так, калі супаставіць аб'ём тэксту, прысвечанага прыналежнасці Багдановіча дзвюм культурам (як мінімум!) – беларускай і рускай, а таксама сувязям сем'яў Багдановічаў і Пешкавых, з тэмай беларускага нацыянальнага адраджэння, якая складала ядро светаадчування паэта і вяла яго па жыцці, то параўнанне апынецца засмучана сімптаматычным. Дзевяціхвілінны наратыў паспявае прыпісаць паэту ўдзел у напісанні рэвалюцыйных пракламацый у яраслаўскі перыяд жыцця, аднак у ім не знаходзіцца месца для колькі-небудзь выразнага выкладання яго поглядаў на беларускую нацыянальную ідэю ва ўмовах, калі сама назва Беларусь была пад забаронай, а ў дачыненні да шасці губерняў Беларускага генерал-губернатарства і Літоўскага генерал-губернатарства выкарыстоўваўся пазаэтнічны тэрмін «Паўночна-Заходні край Расійскай імперыі».

Вопытны рэжысёр Р. Ясінскі не мог не разумець абмежаванасці дакументальных стужак, змадэліраваных выключна на іканаграфіі. Таму моцным бокам фільма з'яўляецца спроба ажывіць кінаапавяданне інтэрв'ю з чалавекам, знойдзеным раней, яшчэ ў 1971 годзе рэжысёрам першай стужкі пра Багдановіча П. Аліферанкам. Паплечніца паэта Зоська Верас ярка і пранікнёна распавядала пра Максіма, але ў канчатковы мантаж увайшоў толькі той фрагмент, які ілюстраваў зусім не першарадны па значэнні аспект жыцця паэта, – яго перажыванні з нагоды сваёй бяздзетнасці і прадчуванні, што ў яго так і не атрымаецца працягнуць галіну свайго прозвішча.

Менш за год прайшло з моманту стварэння рэжысёрам Р. Ясінскім дакументальнай стужкі «Зорка Максіма» ў студыі «Летапіс», а кіраўніцтва Дзяржтэлерадыё БССР палічыла мэтазгодным запусціць у вытворчасць новы тэлевізійны праект, прысвечаны М. Багдановічу пад назвай «Я не самотны». Яго пастаноўка была даручана рэжысёру Ігару Калоўскаму – аднаму з найбольш адораных і творча вынаходлівых рэжысёраў-неігравікоў Беларусі.

У 1980-я гады і жанрава-стылёвыя падыходы, і сама тэхналогія вытворчасці тэлефільмаў практычна нічым не адрозніваліся ад фільмавытворчасці для «вялікага экрана» – у абодвух выпадках здыманне ажыццяўлялася на 35-міліметровую кінаплёнку. Аднак каштарыс, склад групы, тэрміны вытворчасці і, такім чынам, пастановачныя магчымасці былі зусім не аднолькавымі.

Справа ў тым, што жанрава-відавы фармат тэлевізійнага фільма (і, што вельмі важна, яго каштарыс!) бесперашкодна дазваляў уключаць у тканіну экраннага апавядання іграvыя эпізоды, значна больш шырока выкарыстоўваць прыёмы з арсенала «вялікага кіно»: здыманне ў спецыяльна пабудаванай павільённай дэкарацыі для гістарычнай рэканструкцыі падзей усімі даступнымі мастацка-пастановачнымі сродкамі, выкарыстоўваць спецыяльныя віды здымання (у прыватнасці, рапід) і дадатковыя аператарскія прыстасаванні (краны, цялежкі, ветрадуй, піратэхніку і г. д.). Дзякуючы гэтаму палітра сродкаў экраннай выразнасці, якой валодалі аўтары тэлефільма «Я не самотны», была значна шырэй тых, без перабольшання мінімальных магчымасцей, якімі валодалі кінадакументалісты – аўтары хранікальна-дакументальных фільмаў, якія ствараліся на студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм».

Тым не менш бясспрэчны творчы поспех 20-хвіліннага тэлефільма «Я не самотны», які дзякуючы таленту аўтараў і паглыбленню ў тэму вылучаецца асобна ў цыкле фільмаў пра Максіма Багдановіча, было б несправядліва лічыць толькі вынікам гэтых асаблівых пастановачных магчымасцей.

Закадравы тэкст, напісаны беларускім пісьменнікам Раманам Тармолам, у значнай ступені грунтуецца на ўспамінах бацькі паэта, Адама Ягоравіча Багдановіча, сабраных ім у артыкуле «Матэрыялы да біяграфіі М. А. Багдановіча» (1923) і ўключаных складальнікам Нінай Ватацы ў зборнік успамінаў пра паэта [11, с. 10–54]. Вышэйзгаданы зборнік пабачыў свет у Мінску ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1975 годзе, гэта значыць зусім незадоўга да 90-гадовага юбілею паэта і запуску фільма ў вытворчасць.

Аўтары не пайшлі па пракладзеным дакументалістамі шляху вербальнага пералічэння асноўных біяграфічных вех на фоне ўжо знаёмага па папярэдніх стужках і, у прынцыпе, вельмі абмежаванага іканаграфічнага матэрыялу (з прадметаў, якія належалі паэту, захаваўся толькі кішэнны гадзіннік фірмы «Павел Бурэ»). Драматургія фільма грунтуецца на цалкам апраўданым у творчым плане дапушчэнні – выдуманых, часам вельмі асабістых і крайне суб’ектыўных па змесце гутарках Адама Ягоравіча, бацькі паэта з сынам Максімам. Гэтыя гутаркі насычаны індывідуалізаванымі перажываннямі, часам нават цалкам даравальнымі недакладнасцямі і, што вельмі важна для разумення псіхалагічнага падтэксту іх узаемаадносін, спробай пераадолення комплексу віны бацькі перад сынам. У сваіх успамінах аб апошніх днях жыцця Максіма, па фатальным збегу акалічнасцей, што супалі з тымі перадрэвалюцыйнымі днямі, калі «старое рухнуло, а новое еще не отлилось в устойчивые формы» [11, с. 52], Адам Ягоравіч піша: «Хотя в этой беспрерывной сутолоке мне было не до личных дел, но в начале мая я тревожился, что не получил от Максима ответа на два последние письма. В это время заехал попутно с фронта мой второй сын Лева, и мое внимание сосредоточилось на нем, грязном, оборванном и обовшивевшем… А Максим в это время доживал свои последние дни, умирая в полном одиночестве и заброшенности» [11, с. 52].

Вельмі шмат складаных тэм і праклятых пытанняў ім абодвум хацелася адзін з адным абмеркаваць, і так мала магчымасцей ім дала для гэтага багіня лёсу Мойра! А апошнія дні жыцця паэта былі сапраўды трагічныя: паэт «слег за неделю до смерти, когда пошла кровь горлом. Кровь или текла струей, или выкашливалась крупными сгустками. Была приглашена сестра милосердия, которая за ним ходила, видимо, только днем, ибо он умер совершенно один ночью» [11, с. 52].

Мабыць, галоўная заслуга аўтараў тэлефільма заключаецца ў тым, што яны беспамылкова адчулі, што ідэйны канфлікт, які вынікае з рознасці тэмпераментаў і жыццёвых пазіцый Адама Ягоравіча і Максіма, можа стаць той спружынай сюжэта, якая дасць магчымасць распавесці не толькі праўдзівую ў псіхалагічных і гістарычных адносінах, але і высокую па пачуццях кінагісторыю.

Адчуўшы гэтую іх узаемную прыхільнасць і незавершанасць не толькі сямейнага, але і агульначалавечага дыялога, рэжысёр І. Калоўскі трансфармаваў *аповед Бацькі пра Сына*, а менавіта

такім ён паўстаў у літаратурным варыянце ўспамінаў А. Я. Багдановіча, *у серыю дыялогаў Бацькі з Сынам і Сына з Бацькам* (курсіў мой. – *К. Р.*), прычым дыялогаў незвычайна сардэчных, інтэлектуальна насычаных і вельмі неабходных абодвум суразмоўцам.

Канстатуючы абсалютную творчую правамернасць і кінематаграфічную эфектыўнасць такога рашэння з пункту гледжання сюжэтапабудовы, застаецца загадкай выпадкова ці ж наўмысна гэты драматургічны прыём нагадвае фрагмент эпілога бессмяротнага булгакаўскага рамана «Майстар і Маргарыта»: «От постели к окну протягивается широкая лунная дорога, и на эту дорогу поднимается человек в белом плаще с кровавым подбоем и начинает идти к луне. Рядом с ним идет какой-то молодой человек в разорванном хитоне и с обезображенным лицом. Идущие о чем-то разговаривают с жаром, спорят, хотят о чем-то договориться».

Звяртае на сябе ўвагу яшчэ адно падабенства: і ў пісьменніка М. Булгакава, і ў рэжысёра І. Калоўскага старэйшы, куды больш дарослы і дасведчаны суразмоўца апраўдваецца перад малодшым за баязлівасць ці, па меншай меры, слабасць, якую ён праявіў у вырашальны момант і якую ўжо ніколі не прадставіцца магчымасць выправіць ...

Тым не менш матывы сірочага жыцця паэта і смерці ў адзіноце складваюць толькі малую долю той глабальнай калізіі, якая разгарнулася паміж Бацькам і Сынам у папярэднія гады. Гаворка, зразумела, ідзе аб іх стаўленні да будучыні Беларусі, аб ідэі нацыянальнага адраджэння і беларускай мове як неад’емнай частцы гэтай ідэі.

З жыццёвых прагматычных пазіцый такое нявер’е бацькі паэта, нежаданне ўключацца ў справу беларускага нацыянальнага адраджэння можна зразумець і прабачыць. Энцыклапедыст Адам Ягоравіч лепш за многіх іншых ведаў, што з 40-х гадоў XIX стагоддзя ўрад Расійскай імперыі заўзята ўзяўся за нівеліраванне беларускага народа, за масавае перараблення беларусаў у вялікаросаў, як канфіскоўваліся і спальваліся кнігі перыяду Вялікага Княства Літоўскага, што было цалкам забаронена кнігавыданне і ліквідавана богаслужэнне на беларускай мове, што знішчана судаводства, заснаванае на беларускім праве, што амаль пад корань ліквідавана ўніяцтва – канфесія, якая выконвала кансалідуючую ролю ў жыцці беларускага грамадства амаль што да канца XVIII стагоддзя.

З’яўляючыся чалавекам адначасова і інтэлігентным, і практычным, бацька паэта выразна бачыў, што «дзяржаўны суверэнітэт – катэгорыя не «душэўная», а прагматычная» [10, с. 391–392], што дасягненне спрадвечнай духоўнасці, ярка выяўленай этнічнасці, пераход да актыўнага карыстання беларускай мовай, стварэнне самабытных мастацкіх твораў і нацыянальная ідэя ў цэлым павінны разглядацца і тым больш рэалізоўвацца галоўным чынам у сацыяльна-палітычным ключы.

Сам Максім Багдановіч таксама вельмі негатыўна ацэньваў сітуацыю, якая склалася ў Беларусі ў 1880–1890-я гады. Ён лічыў, што культурны пласт насельніцтва Беларусі складаўся з агульнаімперскіх адходаў, польскіх нацыяналістаў і яўрэйскай буржуазіі, якія былі ў сваёй масе іншароднымі целамі... Ніякага колькі-небудзь прыкметнага беларускага руху тады не было, паколькі нацыянальная самасвядомасць не магла развівацца ў народзе без дапамогі беларускай інтэлігенцыі, а яна толькі яшчэ пачала фарміравацца. У канцы XIX стагоддзя першыя інтэлігенты-беларусафілы з ліку студэнцкай моладзі Санкт-Пецярбурга былі аб’яднаны вакол часопіса «Гоман», але толькі ў канцы першага дзесяцігоддзя XX стагоддзя шэрагі нацыянальнай інтэлігенцыі сталі актыўна папаўняцца.

Вяртаючыся да аналізу тэлефільма, неабходна заўважыць, што поспех арыгінальнай драматургічнай канструкцыі, задуманай аўтарамі, залежаў ад таго, наколькі гістарычна дакладным і эмацыянальна пераканаўчым будзе персанаж, які перадасі яркую і шмат у чым супярэчлівую асобу аднаго з самых блізкіх паэту людзей – выяву яго бацькі Адама Ягоравіча Багдановіча. Такі падыход да сюжэтапабудовы і жанрава-стылёвай канцэпцыі фільма дазволіў вырашыць некалькі разнапланавых задач.

Па-першае, апавяданне ад імя канкрэтнай гістарычнай асобы дало магчымасць выканаўцу ролі бацькі паэта (гэтую ролю з найвялікшым тактам і годнасцю рэалізаваў на экране народны артыст Беларускай ССР Павел Васільевіч Кармунін) ад першай асобы вымаўляць тэкст нядаўна апублікаваных успамінаў, не прытрымліваючыся пры гэтым строга пэўнай паслядоўнасці

фрагментаў і нават часам не звяртаючы ўвагі на дакладнасць цытавання друкаванай версіі ўспамінаў, напісаных у 1923 годзе (напрыклад, на першай хвіліне фільма Адам Ягоравіч, седзячы ля магілы Максіма ў Ялце, кажа: «Я перажыў сына на 23 гады...»).

Па-другое, дакладны падбор фрагментаў успамінаў дазволіў пазбегнуць празмернага тэматычнага разгрупавання – аўтары былі абмежаваныя 20-хвілінным лімітам экраннага часу.

Абраўшы шлях наўмыснага тэматычнага самаабмежавання, у іх атрымалася сфакусаваць увагу выключна на тым, што ўяўлялася самым важным: прадчуванні паэтам свайго хуткага сыходу з жыцця, яго тугі і болю ў сувязі з немагчымасцю працягнуць галіну свайго прозвішча (…Ад усіх цяпер патомкі ёсць, // Ды няма адных – Страцімавых. «Страцім-лебедзь»). Адваротным бокам гэтай трагічнай тэмы з'яўляюцца глыбокія і шчырыя перажыванні Адама Ягоравіча аб тым, што паспей ён да хворага сына ў Ялту на некалькі дзён раней, магчыма, удалося б пазбегнуць бяды і «…какая несуразность, что не он обо мне, а я о нем должен писать свои воспоминания» [11, с. 54].

І, нарэшце, па-трэцяе, псіхалагічна матываваная непаслядоўнасць, фрагментарнасць успамінаў і мастацка апраўданая ўмоўнасць іх экраннага ўвасаблення забяспечыла магчымасць адмовіцца ад якой-небудзь «рэканструкцыі факта». Спадзяючыся на праўду ўнутраную, аўтарскую, праўду гора і пакуты – калі глядач верыць, што ўсё было сапраўды так і не патрабуе дадатковых пацвярджэнняў – аўтары стужкі пайшлі па шляху аўдыявізуальнага мадэліравання ўнутранай сутнасці падзей. З вялікай доляй упэўненасці можна выказаць здагадку, што рэжысёр Ігар Калоўскі беспамылкова адчуў, што прапорцыя паміж праўдаю і фальшу будзе залежаць, галоўным чынам, ад дакладнасці ключавой асобы апавядальніка.

Дзякуючы майстэрству акцёра з вялікай літары П. Кармуніна ўсё склалася ў вышэйшай ступені ўдала: атрымалася дасягнуць найвышэйшага партрэтнага падабенства, дакладнасці ў грыме (мастак-грымёр А. Тонкі), у касцюме (мастак па касцюмах Б. Грын), у аднаўленні прадметнага асяроддзя (мастакі-пастаноўшчыкі Б. Кавецкі і А. Лагун). Пры здымках у дэкарацыі, калі ў адным кадры адначасова прысутнічалі і бацька паэта, і сам Максім, рэжысёр і аператар (Л. Слобін) будавалі кампазіцыю з выкарыстаннем напаўпразрыстага люстэрка – адзіны персанаж быў бачны на прасвет, другі – у адлюстраванні, што дазваляла дасягнуць містычнага эфекту і падкрэслівала нерэальнасць, выдуманасць размовы, якая адбываецца паміж імі.

Амаль абсалютнае мастацкае «пападанне» ў дачыненні да вобраза Адама Ягоравіча задало аналагічныя патрабаванні і да вобраза паэта (яго ролю выканаў Сяргей Журавель). На жаль, вобраз Максіма не атрымаўся такім жа магутным і паўнакроўным: драматургія, пабудаваная *«ад Адама»*, расстаўляе акцэнты такім спецыфічным чынам, што таленавітаму акцёру С. Журавелю ў некаторых эпізодах проста «няма чаго іграць»; ён вымушаны выконваць «прыкладную» ролю пры П. Кармуніне, маўкліва прысутнічаць у якасці слухача маналогаў свайго бацькі. Гэтая сітуацыя пагаршаецца і мінімальнай колькасцю тэксту, дэлегаванага аўтарамі самому паэту; акцёр спрабуе прыдумаць якія-небудзь «прыстасаванні», якія дазваляюць «схавацца» за фізічнае дзеянне, але практычна нічога, акрамя пакашлівання і іншых сімптомаў фізічнага недамагання, выкліканых сухотамі, знайсці не атрымоўваецца.

Але ўсё ж, стрыжнёвая тэма фільма – гэта ідэя веры ці нявер'я ў будучыню беларускага народа, беларускай мовы, у беларускую ідэю ў цэлым. Максім не толькі ўсёй душою ў яе верыць, але і гатовы зрабіць беларускую ідэю сэнсам свайго жыцця: «Беларусь, твой народ повстречается // С ярким солнцем грядущего дня // Погляди, как заря разгорается // Сколько в тучах залетных огня!» (У фільме гэтыя паэтычныя радкі дадзены ў рускім перакладзе. – *К. Р.*). Бацька паэта не без гонару падкрэслівае: «Такая энергия в его годы, да еще при его болезни, просто непостижима!». Успамінаючы Максіма, ён кажа: «Его всегда тянуло в Беларусь… Мне думается, его тяга ко всему белорусскому есть дело наследственности. Эта преданная, нежная любовь к своему родному, далекому, которое кажется таким прекрасным…».

З гэтых пазіцый цалкам высвятляецца шматслаёвы падтэкст назвы фільма «Я не самотны». У першым, відавочным пласце змяшчаецца адсылка да вядомых паэтычных радкоў М. Багдановіча з адзінага прыжыццёвага зборніка «Вянок»: «У краіне светлай, дзе я ўміраю, // У белым доме ля сіняй бухты, // Я не самотны, я кнігу маю // З друкарні пана Марціна Кухты». Але ў на-

зве фільма ёсць і другі, больш глыбокі падтэкст*: беларуская нацыянальная ідэя сфарміравала і аб’яднала новыя парасткі беларускай інтэлігенцыі, таму паэт не адзінокі* (курсіў мой. – *К. Р.*), ён не сумуе і не шкадуе аб тым, што зрабіў выбар на карысць Беларусі, яе мовы і народа, адмовіўшыся ад месца ў выратавальным Ноевым каўчэгу: «Ды не плыў к яму з мора сіняга // Страцім-лебедзь – горды, моцны птах». Высокая місія служэння інтэлігенцыі свайму народу – для М. Багдановіча ў гэтым не было сумнення – прадвызначае гатоўнасць да поўнага самаахвяравання.

У фільме «Я не самотны» рэжысёр І. Калоўскі сродкамі экраннай пластыкі па-майстэрску стварыў чароўны прасторава-часавы тунэль, які не толькі актуалізаваў праблему прыхільнасці беларускай інтэлігенцыі да нацыянальнай ідэі, але і ярка прадставіў яе сваім сучаснікам. Да гэтага варта дадаць, што стужкай пра Багдановіча І. Калоўскі вельмі ганарыўся, гэта быў адзіны з яго самых любімых фільмаў.

Трагічным чынам жыццё рэжысёра шмат у чым паўтарыла падзеі жыцця самога паэта: імкнучыся да поўнай творчай самарэалізацыі, сістэматычна працуючы «на знос», Ігар Калоўскі дачасна падарваў сваё сэрца і пайшоў з жыцця праз два месяцы пасля свайго 50-годдзя (у лістападзе 1988 года).

Яшчэ праз дзесяцігоддзе, у 1990 годзе, у рамках юбілейнага тэматычнага планавання студыя «Летапіс» ініцыіруе стварэнне новага, на гэты раз вучэбнага фільма пра паэта – «Максім Багдановіч. Апокрыф» (рускамоўны фільм здымаўся па заказу Міністэрства народнай адукацыі БССР).

Рэжысёр фільма Вадзім Сукманаў – адзін з тых дакументалістаў, каго з поўным правам варта аднесці да катэгорыі тонка адчуваючых і «думаючых» рэжысёраў – не быў бы самім сабой, калі б не пачаў сваю версію кінаапавядання пра Багдановіча з яго ж філасофскай прытчы «Апокрыф» – глыбокіх разважанняў аб сутнасці і прызначэнні духоўнага пажытку: «22. Цяжка працаваў гаспадар і вось бачыць: паміж збожжа ўзраслі васількі. 23. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі; бо поўныя вагі каласы маглі бы ўзрасці на месцы васількоў. 24. Але яшчэ з маленства краса іх прыйшлася мне да душы. Таму я не вырву з каранём іх, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве сэрца маё» (М. Багдановіч «Апокрыф»).

Прыпавесць «Апокрыф» – гэта, па сутнасці, мікрафільм у фільме, які задае вельмі дакладны паэтычна-выяўленчы камертон, эмацыянальна наладжвае гледача на наступны прагляд. Выбар В. Сукманавым такога неардынарнага кампазіцыйнага прыёму – сведчанне высокага рэжысёрскага майстэрства, дазваляючага задзейнічаць стылеўтваральную функцыю пралога экраннага твора. Акрамя таго, выкарыстанне назвы прыпавесці ў назве фільма забяспечыла дадатковую нюансіроўку тых ацэнак, якія, на думку аўтараў стужкі, яшчэ не цалкам былі пераадолены ў той час у адносінах да паэта: відавочна, што «апокрыф» – не цалкам прызнаны (або нават непрызнаны) твор, які не ўвайшоў у канон. Выкарыстоўваючы такі троп, аўтары фільма маглі іншасказальна, але ясна данесці да гледача думку пра несправядлівасць недаацэнкі творчай спадчыны М. Багдановіча. Распавядаючы аб дзяцінстве Максіма, аўтары прама кажуць, што не толькі не атрымалася захаваць для нашчадкаў дом паэта, але і што дакладнае яго месцазнаходжанне невядома.

Эмацыянальная і шчырая інтанацыя закадравага тэксту (аўтар Алег Лойка) разам з уважлівым стаўленнем да фактаграфіі, умелы падбор апорных сэнсаўтваральных элементаў сюжэтапабудовы робяць гэтую стужку, задуманую і рэалізаваную ў якасці вучэбнага фільма (аўтары памяталі аб утылітарнай функцыі асветніцкага кіно), адным з лепшых да гэтага часу фільмаў пра М. Багдановіча ў сваёй відавой катэгорыі.

У 1992 годзе калекцыю неігравых фільмаў пра М. Багдановіча папоўніў Беларускі відэацэнтр, які незадоўга да гэтага пачаў сваю працу (у 1989 годзе). Да векавога юбілею паэта быў зняты 40-хвілінны відэафільм «Максім Багдановіч. Сто» (сцэнарый Р. Барадуліна, рэжысёр В. Каралёў, аператар С. Пушкін), у які ўвайшлі рэпартажныя матэрыялы святкавання юбілею Багдановіча ў Беларусі і за мяжой (імя паэта было ўнесена ў мемарыяльны спіс ЮНЕСКА дзесяццю гадамі раней). На жаль, недасканаласць тэхнічнай базы Белвідэацэнтра пачатку 1990-х гадоў вымусіла ажыццяўляць гэты відэапраект ў фармаце S-VHS, што істотна знізіла каштоўнасць рэпартажна знятага матэрыялу для паўторнага выкарыстання.

Радыкальныя сацыяльна-палітычныя трансфармацыі пачатку 1990-х, доўгачаканае набыццё Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту адкрывалі новыя магчымасці для экраннай трактоўкі і рэпрэзентацыі нацыянальнай культурнай спадчыны з улікам вынікаў найноўшых даследаванняў

і магчымасці доступу да раней закрытых архіўных даных. Аднак, нягледзячы на асобныя лакальныя прарывы, да ліку якіх можна аднесці творчасць кінадакументаліста Анатоля Алая і некаторых іншых рэжысёраў, гэтыя чаканні «творчага ўсплёску» ў цэлым не апраўдаліся. Узамен публіцыстычна завостранай кінадакументалістыкі – бескампраміснага даследчага кіно – галоўны вектар жанрава-стылёвых пошукаў перамясціўся ў бок постмадэрнісцкага дыскурса, навеянага замежнай фестывальнай практыкай. Пачалася эпоха фільмаў для фестываляў і ... фільматэкі. (Гаворка ідзе аб адсутнасці механізма прэзентацыі кінадакументалістыкі патэнцыяльным гледачам.) Гэта было выклікана і развалам савецкай сістэмы «кінавытворчасць–кінапракат», і новымі эканамічнымі рэаліямі фільмавытворчасці, і зменай пакаленняў творчых кадраў кінаіндустрыі, якая была адзначана сыходам «старых» майстроў і прыходам новага пакалення, што стварае іншыя каштоўнасці.

Спецыфічнасць сітуацыі канца 1990-х і першага дзесяцігоддзя новага стагоддзя заключалася перш за ўсё у тым, што рэжысёр, прыступаючы да здымак кароткаметражнага неігравога фільма, арыентаваўся, галоўным чынам, на магчымы фестывальны поспех зробленай ім карціны. Надзея на атрыманне ангажэмента, прывабнага па творчым і фінансавым баках кіна-, відэа- ці тэлепраекта, які залежаў ад прысутных на фестывальных праглядах экспертаў розных замежных адборачных камісій, прымушала мірыцца і з вельмі недасканалай арганізацыяй неігравой кінавытворчасці, і з больш чым сціплай аплатай творчай працы. На думку многіх рэжысёраў, дзяржаўная кінастудыя была патрэбна толькі як прамежкавая інстанцыя на шляху да фестывалю. А далей – рынкавая латарэя і рынкавыя зносіны канкрэтнага аўтара з патэнцыяльнымі наймальнікамі...

Такое становішча, у сваю чаргу, накладвала адбітак і на тэматычныя перавагі, і на трактоўку матэрыялу, і на эстэтычныя ўстаноўкі. Тэндэнцыі «фестывальна-элітарнага» кінематографа прадугледжвалі прытрымліванне модзе на непрафесійнае, стылізаванае пад аматарскае кіно. Гэта – адна з граняў постмадэрнісцкага ўплыву, чарговы віток захаплення натуралістычнымі здымкамі, этнаграфічным або яркім фенаменалагічным «жыццёвым матэрыялам», але нярэдка пры гэтым ніяк эмацыянальна не афарбаваным; матэрыялам, які падаваўся з падкрэсленай нявызначанасцю аўтарскіх пазіцый.

У 1996 годзе на студыі «Летапіс» быў створаны чарговы двухчастковы фільм пра М. Багдановіча «Забытыя нябёсы». Лічылася, што рэжысёр фільма Віктар Аслюк, на той момант нядаўні выпускнік майстэрні рэжысуры дакументальнага фільма (мастацкі кіраўнік В. Дашук) Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, ужо валодаў дастатковым творча-вытворчым вопытам, прафесійнымі навыкамі і майстэрствам для рэалізацыі праекта. Аднак завершаная стужка паказала, што рэжысёру ўласціва зусім іншая, чым другім рэжысёрам, якія да яго звярталіся да тэмы Багдановіча, форма арганізацыйна-функцыянальнага мыслення: створаны фільм быў не пра Багдановіча!

Кінаапавяданню папярэднічаў цітр: «Прысвячаецца Максіму Багдановічу і Сяргею Палуяну». (С. Палуян – беларускі публіцыст, празаік і літаратуразнаўца, адзін з заснавальнікаў беларускай прафесійнай крытыкі, які скончыў жыццё самагубствам у 1910 годзе ва ўзросце 20 гадоў.) Але ні выяўленчы рад (аператары А. Казазаеў і В. Бандаровіч), ні закадравы тэкст (В. Аслюк), ні музычна-шумавое рашэнне (гукааператар У. Мірашнічэнка) не ўнеслі нічога новага ў веданне, разуменне і засваенне творчай спадчыны ні М. Багдановіча, ні С. Палуяна. Адвольная кампіляцыя рыфмаваных (што належаць М. Багдановічу), празаічных (якія належаць С. Палуяну) і аўтарскіх (напісаных В. Аслюком) фрагментаў тэксту на фоне экспазіцыі музея «Беларуская хатка», гарадскога экстэр’еру і шматзначных, асветленых кантрасным аднабаковым святлом партрэтаў акцёра І. Дзянісава не дазваляла разабрацца, пра якія менавіта «забытыя нябёсы» наогул ідзе гаворка, бо страціць можна толькі тое веданне, якім чалавек валодаў раней.

Аўтарская рэфлексія – правамерны кампанент неігравога фільма, аднак у адсутнасці масіву фактаграфічнага матэрыялу, рацыянальнага пачатку, яна папросту правісла ў змястоўнай пустэчы.

Здаецца, што кінапраект 1996 года ў чарговы раз пацвердзіў некалькі правілаў. Першае тычыцца таго, што калі прыярытэтнасць «эстэцкага» накіравання ў якасці сэнсаўтваральнай функцыі мастакоўскай свядомасці дасягае крытычнай велічыні, твор можа ператварыцца ў дарагі помнік самалюбавання. Другое правіла сведчыць, што акунуцца з галавой у сферу кінавыяўленчасці значна прасцей, чым надзяляць высокім сэнсам тэматычны заказ, нават і прымеркаваны да юбілею.

З фільмам «Забытыя нябёсы» адбылася рэч некалькі дзесяцігоддзяў таму неверагодная: сэнсавая змястоўнасць неігравога фільма цалкам перастала адпавядаць гістарычнай і сацыяльнай сутнасці з'яў; экранны вобраз страціў кантроль над рэчаіснасцю і сувязь з ёй, а сама рэчаіснасць «рэжысёрам-канцэптуалістам» была выдалена як чужародны элемент.

У 2010 годзе, напярэдадні 120-гадовага юбілею паэта, Беларускі відэацэнтр ажыццявіў вытворчасць новага відэафільма (сцэнарый К. Князева, рэжысёр М. Князеў, аператар А. Казазаеў), прысвечанага памяці паэта. Карціна атрымала назву «Максім Багдановіч. Пераадоленне».

Не жадаючы ісці пракладзеным шляхам юбілейных фільмаў-партрэтаў, аўтар сцэнарыя і рэжысёр шукалі новы, нетрадыцыйны погляд на тэму творчасці Багдановіча і кампазіцыйную структуру кінаапавядання. У выніку фільм быў пабудаваны з дзвюх паралельных, перыядычна перасякальных ліній, кожную з якіх вёў асобны персанаж.

Першая лінія – «тэатральная» – заснаваная на фрагментах новай пастаноўкі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі – спектакля «Дзённік паэта» (аўтар п'есы С. Кавалёў, рэжысёр спектакля В. Баркоўскі). Галоўны дзеючы персанаж гэтай лініі фільма – малады акцёр Д. Паршын, выканаўца ролі Максіма ў тэатральнай пастаноўцы.

У якасці «рухавіка» другой, больш традыцыйнай (літаратурна-біяграфічнай) лініі была абрана маладая супрацоўніца музея М. Багдановіча Л. Сасонка, якая ў якасці «гаспадыні» музея і агучвала мінімальна неабходны набор факталагічных звестак пра жыццё паэта.

Аднак ні ў цэлым, ні паасобку гэтыя лініі не скламіся ў важкую па зместавых і фармальных характарыстыках кампазіцыю.

Па-першае, механічна завучаны абаяльнай супрацоўніцай музея аповед асноўных біяграфічных вех паэта не выйшаў за межы школьнай праграмы, а прэзентуемы набор іканаграфічнага матэрыялу – фатаграфій, паштовак, карцін, прадметаў ужытку – паўтараў тое, што ўжо неаднаразова выкарыстоўвалася ў папярэдніх фільмах іншымі рэжысёрамі.

Па-другое, экзістэнцыяльны погляд на праблему «жыццёвага шляху» М. Багдановіча, пакладзены ў аснову спектакля, калі і дадаў нешта новае ў разуменне ўнікальнай прыроды мастацкай і публіцыстычнай творчасці паэта, то знайсці гэта рацыянальнае зерне ў зафіксаваных і ўзятых у мантаж відэафрагментах немагчыма.

Біяграфічная інфармацыя, што агучваецца супрацоўніцай музея Л. Сасонкай, адрасавана акцёру Д. Паршыну, які ўважліва слухае экскурсавода. Маецца на ўвазе, што гэта неабходна для паглыблення ў вобраз Максіма. Парадокс сітуацыі ў тым, што маладому артысту для рэалізацыі рэжысёрскай задумы ў пастаноўцы авангардысцкай накіраванасці няма ніякай неабходнасці знаёміцца з асаблівасцямі светаўспрымання паэта – жанрава-стылёвыя асаблівасці спектакля (і гэта выразна відаць па прадстаўленых у фільме яго фрагментах) гэтага не патрабуюць.

Сёння вышэйпералічанымі стужкамі калекцыя фільмаў пра Максіма Багдановіча, створаных беларускімі кіна- і відэавытворцамі, вычэрпваецца. Да 120-гадовага юбілею вялікага беларускага паэта кінастудыя «Беларусьфільм» і Беларускі відэацэнтр плануюць да запуску новыя стужкі.

Хочацца спадзявацца, што ў будучых дакументальных (а магчыма, і ігравых) стужках пра Максіма Багдановіча і іншых вялікіх дзеячаў беларускай культуры зноў будзе вернуты ў творчую практыку і атрымае перавагу такі шлях вывучэння рэчаіснасці, які можна па праве зваць даследчым, аналітычным. Яго сутнасць фармулюецца вельмі проста і лаканічна: *ад фіксацыі бачнага да разумення існага.*

Завяршыць артыкул пра паэта хочацца словамі, якія вялікі беларускі пісьменнік Ніл Гілевіч напісаў амаль тры дзесяцігоддзі таму і якія непасрэдна адрасуюцца тым, хто фарміруе гістарычную памяць народа: «... імя Багдановіча за межамі нашай краіны пакуль што, на вялікі жаль, мала вядома. Прыходзіцца гаварыць: на вялікі жаль, таму што ён – як адна з самых выдатных постацей не толькі ў беларускай, але і ў агульна-славянскай, а можа быць і ў сусветнай культуры – заслугоўвае іншай вядомасці» [3, с. 174].

Да гэтага застаецца дадаць, што ў дасягненне гэтай «іншай», значна больш шырокай вядомасці, несумненна, зробіць уклад і экранная культура, якая – хочацца верыць – будзе прырастаць ў Беларусі інтэлектуальна і эмацыянальна насычанымі, адухоўленымі жарам сапраўднага даследавання творамі.

## Літаратура

1. Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі; пад рэд. А. І. Мальдзіса. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1992. – Т. 1. – 542 с.
2. Белорусский государственный архив кинофотофонодокументов: справочник / авт.-сост. С. В. Жумарь; Белорус. науч.-исслед. ин-т документоведения и арх. дела. – Минск, 2002. – Ч.1: Кинодокументы. – 716 с.
3. Г і л е в і ч, Н. Слова пра Максіма Багдановіча / Н. Гілевіч // Покліч жыцця і часу: публіцыст. выступленні і арт. – Мінск: Беларусь, 1983. – С. 173–187.
4. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі; Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; [рэд. кал.: У. В. Гніламёдаў і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – Т. 2. – 903 с.
5. Г р и н ч и к, Н. М. Максим Богданович и белорусский фольклор: автореф. дис. … канд. филол. наук / Н. М. Гринчик // АН БССР; Ин-т литературы им. Я. Купалы. – Минск, 1958. – 20 с.
6. М а й х р о в і ч, С. Максім Адамавіч Багдановіч (літаратурна-крытычны нарыс) / С. Майхровіч // М. Багдановіч. Выбраныя творы. – Мінск: Дзярж. выдавецтва БССР, 1946. – С. 3–29.
7. М у ш ы н с к і, М. І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 40-я – першая палавіна 60-х гадоў / М. І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 343 с.
8. Н а в у м е н к а, І. Максім Багдановіч / І. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры ХІХ стагоддзя.– Мінск, 1999. – Т. 1. – С. 265–318.
9. Р е м и ш е в с к и й, К. «Летопись» и кинолетописцы (первые четыре десятилетия белорусского неигрового кино) / К. Ремишевский // Белорусское кино в лицах. – Минск: Белорус. гос. ин-т проблем культуры, 2004. – С. 225–241.
10. Ч е р н я в с к а я, Ю. В. Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. В. Чернявская. – Минск : ФУАинформ, 2010. – 512 с.
11. Шлях паэта: зб. успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1975. – 332 с.

*K. I. REMISHEVSKY*

**MAXIM BAGDANOVICH AND EVOLUTION OF THE MEMORIAL PARADIGM IN THE BELARUSIAN SCREEN CULTURE**

## Summary

A wide array of audio-visual products (non-fiction films, video and television films), produced in the Republic of Belarus over the past four decades on themes of life and creativity of the great Belarusian poet Maxim Bogdanovich (1891–1917) has been analyzed in the article.

On examples of the complex and contradictory processes of cultural memory about M. Bogdanovich formation the establishment and development of the Belarusian screen culture memorial paradigm has been examined. Mechanisms of the Study of Literature's mutual influence on the screen culture have been discovered. Regularities of content, genre and stylistic approach evolution of the audiovisual works devoted to M. Bogdanovich, depending on the dominant at a particular stage of the historical axiological evaluation of poet's heritage as well as the change of the national non-fiction film making development priorities have been based, too.

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*УДК 882.6.09–3*

*П. П. ТКАЧОВА*

# МАСКА Ў САТЫРЫКА-ГУМАРЫСТЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ТРАНСФАРМАЦЫІ ВОБРАЗА АЎТАРА Ў МАСТАЦКІМ ТВОРЫ

*Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 01.06.2010)*

Вобраз аўтара ў мастацкім творы праяўляецца праз змястоўна-фармальныя якасці твора: выбар тэмы, пастаноўку праблемы, ідэю, пафас, жанрава-стылістычныя асаблівасці і г. д. Такім чынам, вобраз аўтара – гэта ўяўленне чытача аб тым, хто напісаў мастацкі твор. Безумоўна, вобраз аўтара шмат у чым можа быць падобны на самога аўтара, бо менавіта яго думкі і пачуцці закладваюцца ў твор, але ёсць выпадкі ў мастацкай літаратуры, калі вобраз аўтара падпарадкоўваецца законам стварэння мастацкага вобраза ўвогуле. У такім выпадку мы маем справу з інавацыйнай трансфармацыяй вобраза аўтара.

Пытанні, звязаныя з праблемай так званай «аўтарскай маскі», – спосабу прыхавання пісьменнікам уласнага твару з мэтай стварэння ў чытача вобраза аўтара, які адрозніваецца ад рэальнага чалавека, што насамрэч напісаў дадзены твор, перыядычна ўзнімаліся ў літаратуразнаўстве. Адна з першых спроб асэнсавання ролі аўтарскай маскі ў творчасці пісьменніка належыць М. Валошыну («Лица и маски», 1910) [1]. У свой час да гэтай праблемы звярталіся Ю. Тынянаў, І. Груздзеў, А. Люцікава і іншыя [2–4]. Адна з арыгінальных канцэпцый на гэту тэму з’явілася на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Яе аўтар М. Бахцін закранаў не толькі пытанні, традыцыйна звязаныя з гэтай тэмай, напрыклад, паралель: аўтар – чытач, але і не менш значную: аўтар – герой [5]. Своеасаблівы падыход да аўтарскай маскі належыць постмадэрнісцкай эстэтыцы. А. Асоўскі сцвярджае, што постмадэрнісцкая эстэтыка ўспрымае аўтарскую маску «как важный структурообразующий принцип повествовательной манеры постмодернизма» [6]. Адсюль вынікае, што ў літаратурнай практыцы заходняга постмадэрнізму ў апошні час аўтарская маска набывае большае значэнне, чым асоба самога аўтара. Так, у прадмове да свайго аўтабіяграфічнага рамана «Моя тайная история» П. Тэру з іроніяй пісаў: «Что до самого рассказчика, Пол Теру из книги похож на меня чрезвычайно, но и он – участник маскарада. Хранить кое-что в тайне – по-прежнему привилегия писателя, и он вправе использовать вместо маски собственное лицо. Вот тут уж я никаких вольностей себе не позволял. Пускай рассказчик вымышленный, но маска – самая настоящая» [7].

Каб разабрацца ў дадзенай праблеме, трэба, на нашу думку, перш-наперш звярнуцца да першапачатковага прызначэння маскі, яе існасці ў культурна-эстэтычным жыцці чалавека. Маска (ад франц. masque, з араб. masћara – «насмяхацца», «рабіць смешным, а таксама «жарт») – гэта накладка з проразямі для вачэй, найчасцей з выявай чалавечага твару ці галавы жывёлы, птушкі, міфалагічнай істоты і г. д. Зыходзячы з гэтага азначэння, можна сцвярджаць, што першапачаткова маска (абрадавая, рытуальная, тэатральная і г. д.) прызначалася для змянення твару пад адпаведны вобраз. Так, напрыклад, у антычным тэатры маска з’яўлялася элементам тэатральнага грыму і адлюстроўвала пэўны тыповы характар, а часам нават і адпаведны настрой героя [8–12].

Калі мы разглядаем маску, якая пры апрананні цалкам закрывае твар, то бачна, што нязменнымі («сваімі») застаюцца толькі вочы. Гэта акалічнасць, на нашу думку, з'яўляецца сімвалічнай менавіта для аўтарскай маскі, бо змяняючы аблічча, аўтар так ці інакш перадае ўласнае бачанне свету, свае пачуцці і ўяўленні. Толькі спосаб і манера, прыёмы і стыль і г. д. могуць змяняцца пад уздзеяннем маскі, што прымушае нас гаварыць пра інавацыйныя трансфармацыі вобраза аўтара, асабліва, калі мы гаворым пра аўтарскую маску ў сатырычным (гумарыстычным) творы, дзе «я» героя, часцей за ўсё, гэта «я» – гумарыстычнага ці сатырычнага персанажа, якога аўтар высмейвае.

Адной з праяў інавацыйнай трансфармацыі вобраза аўтара можна лічыць подпіс-псеўданім пад мастацкім творам. Аднак не кожны псеўданім цалкам выконвае гэтую ролю, для трансфармацыі вобраза аўтара патрэбна з'яўленне псеўданіма-маскі.

Смех у сатырычным (гумарыстычным) творы ахоплівае, на нашу думку, усе бакі творчасці сатырыка (гумарыста), у тым ліку ўплывае і на псеўданім-маску (адсюль з'яўленне пэўнай «жыццёвай» праграмы, адпаведнага стылю, погляду, нават асабістага светаўспрымання. Пісьменнік нібы пераўвасабляецца ў той вобраз, які мае на мэце стварыць. Чаму пісьменнік выбірае новае імя? Таму, што яму патрэбны іншы вобраз аўтара, іншая асоба, паколькі ён сам «не здольны» выканаць тую праграму, якую стварае для маскі. Паспрабуем разгледзець усё вышэйсказанае на прыкладах.

Класічным прыкладам у дадзеным выпадку, на наш погляд, з'яўляюцца творчасць і літаратурная маска К. Атраховіча – «Крапіва». Трэба заўважыць, што гэта самы вядомы, але не адзіны яго псеўданім. Ён падпісваўся, напрыклад, як Астапчук, Доўгі Мацей, але гэтыя псеўданімы не атрымалі шырокай папулярнасці. Крапіва – псеўданім, які найбольш яскрава ўвасобіўся ў творчасці пісьменніка. Гэта сапраўдная маска. Паколькі для яе быў абраны адпаведны стыль, створана асабістая праграма. Ролю праграмы «выконвае» гумарыстычны верш:

Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.
А якая? Смех, дый годзе:
Я – пякучка-крапіва.
Я расту вось тут пад плотам
І не так даўно ўзышла,
А ўжо многім абармотам
Рукі-ногі папякла.

Хто палез за агуркамі,
Хай той носіць пухіры –
Мяне голымі рукамі
Асцярожна, брат, бяры.
Хто сустрэўся, быў са мною,
Дакрануўся раз ці два,
Дык той ведае ўжо, хто я:
Я – пякучка-крапіва [13, с. 12].

Трэба адзначыць, што «марная трава» «ў мастацкім агародзе» – зашыфраваны вобраз, аздоблены своеасаблівым планам дзеяння: пячы, апякаць яскравым, гарачым смехам. «Пякучка-крапіва» папякла «абармотам» «рукі-ногі». Хто ж тыя «абармоты», што «палезлі за агуркамі»? А іх шмат: гэта і героі баек, і адмоўныя персанажы фельетонаў, памфлетаў, сатырычных ды гумарыстычных апавяданняў і, канечне ж, героі яскравых камедый К. Крапівы.

Крапіва – псеўданім, які практычна цалкам ахоплівае творчасць К. Атраховіча, як маска, якой пісьменнік падпарадкаваў, за малым выключэннем, практычна цалкам сваю творчасць, фактычна – гэта другое «я» мастака. Тое ж самае мы назіраем і ў творчасці ўкраінскага пісьменніка Астапа Вішні (сапр. Паўло Губенка). Тут, праўда, не назіраецца, як у першым прыкладзе, прамой сувязі абранага псеўданіма са смехам (сапраўды, Крапіва – пякучка, а Вішня – нешта круглае, смачнае, прывабнае). Праўда, сам П. Губенка адзначаў, што вішні таксама бываюць і кіслыя. У той жа час – зноў адпаведная праграма, стыль і нават свой жанр «усмешкі» – жанр, які быў створаны спецыяльна для гэтай мянушкі-маскі (у прыватнасці, «Усмешкі кааператыўныя, гандлёвыя і іншыя», «Крымскія ўсмешкі», «Усмешкі калгасныя...» і г. д.).

Ёсць аўтары, творчасць якіх, узятая разам, пакідае ўражанне, што аўтар пражыў некалькі розных жыццяў. Так, напрыклад, адбылося з творамі У. Высоцкага. Безумоўна, пад яго творамі маглі б з'явіцца подпісы (псеўданімы-маскі), але гэтага не адбылося па аб'ектыўных прычынах. Пры жыцці пісьменніка практычна нічога не было надрукавана, творы захаваліся ў асабістым выкананні аўтара на магнітных стужках. У творчасці гэтага пісьменніка назіраецца інавацыйнае

сумяшчэнне вобраза аўтара з вобразамі галоўных герояў яго твораў, ад імя якіх вядзецца аповед. І пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца тое, што У. Высоцкага прымалі і за франтавіка, і за альпініста, і за былога палітычнага зняволенага і г. д. І ўсё гэта быў адзін чалавек, таму як бы атрымалася, што ён адзін пражыў шмат розных жыццяў. Аднак вобраз аўтара, сабраны разам, па-першае, не адпавядае цалкам У. Высоцкаму (напрыклад, ён не быў на фронце, бо нарадзіўся ў 1938 годзе, ён не сядзеў у лагеры і г. д.), па-другое, вобраз аўтара настолькі разнастайны, што яго і сапраўды хопіць на некалькі жыццяў. Трэба таксама адзначыць, што з трансфармацыяй вобраза аўтара ў яго творчасці адбываюцца і стылістычныя трансфармацыі. Адсюль можна зрабіць выснову, што мы маем справу зноў-такі з мастацкай маскай, якую апранае аўтар дзеля стварэння дадзенага вобраза. І для творчасці У. Высоцкага гэта вельмі натуральна, бо ён быў выдатным акцёрам, а яго новы герой – гэта чарговая роля, якую трэба было сыграць, і сыграць так, каб усе паверылі, што ўсё адбываецца на самай справе: «Я – актер, я играл много ролей и в театре, и в кино и очень часто бывал в шкуре других людей. И мне, возможно, проще так работать – писать «из другого человека». Я даже, когда пишу, уже предполагаю и проигрываю будущую песню от имени этого человека, героя песни, – еще и потому почти все мои песни написаны от первого лица. Сначала прикидываешь, что за характер у персонажа, и идешь от характера. Если вы обратили внимание, исполняя эти вещи, я, в общем-то, даже стараюсь *показать* вам персонаж, от имени которого поется песня» [14, с. 215].

Толькі ў 4-ю томным зборы твораў У. Высоцкага  65 твораў пачынаюцца з «я»: «Я – Баба Яга…», «Я был слесарем шестого разряда», «Я – летчик, я – испытатель», «Я несла свою Беду…», «Я скачу, но я скачу иначе…», «Я – «Як», истребитель, – мотор мой звенит…» і г. д. [14, с. 395–397]. Трэба адзначыць, што большасць твораў У. Высоцкага напісана ад першай асобы, сам жа ён успамінаў: «Мне пишут в письмах, был ли я тем, от имени кого пишу: не был ли шофером, не воевал ли, не «трудился» ли на Севере, не был ли шахтером и так далее. Это все происходит оттого, что почти все мои песни написаны от первого лица: я всегда говорю «я», и это вводит некоторых людей в заблуждение. Они думают, что если я пою от имени шофера, то я им был; если это лагерная песня, то я обязательно сидел, и так далее. Просто некоторые привыкли отождествлять актера на сцене или экране с тем, кого он изображает. Нет, конечно, понадобилось бы очень много жизней для этого. Кое-что на своей шкуре я все-таки испытал и знаю, о чем пишу, но в основном, конечно, в моих песнях процентов 80–90 домысла и авторской фантазии. Я никогда не гнался за точностью в песне. Она получается как-то сама собой, не знаю отчего.

Я думаю, что вовсе не обязательно подолгу бывать в тех местах, о которых пишешь, или заниматься той профессией, о которой идет речь в песне. Просто нужно почувствовать дух, плюс немножечко фантазии, плюс хоть немножечко иметь какие-то способности, плюс чуть-чуть желания, чтобы зрителю было интересно. Поэтому я рискую говорить «я» вовсе не в надежде, что вы подумаете, что я через все это прошел» [14, с. 214].

Трэба сказаць, што герой У. Высоцкага, народжаны ад «я» – аўтарскага «я», ёсць не што іншае, як увасобленае інавацыйнае аўтарскае «я» (аўтарскія думкі, перажыванні, аўтарскія пачуцці) у вобразе яго героя (так сказаць, у вобразе іншага чалавека), а дакладней, пэўнай мастацкай асобы (калі ўлічыць «я» – папугая, мікрафона, нават «я» душы загінуўшага героя ў творах «Черные бушлаты», «Песня о звездах» і інш.).

«Меня часто отождествляют с героями моих песен, но никто и никогда не догадался еще спросить, не был ли я волком, лошадью или истребителем, от имени которых я тоже пою: ведь можно писать от имени любых предметов, в них во все можно вложить душу – и все!…

…В детской пластинке «Алиса в стране чудес»... есть история попугая, который рассказывает, как он дошел до жизни такой, как он плавал, пиратом был и так далее... Я там за попугая пою сам. Это в принципе снимает многие вопросы: был ли я тем, от имени кого пою? Попугаем я не был – ни в прямом, ни в переносном смысле. Если говорить серьезно, я на самом деле никогда никому не подражал и считаю это занятие праздным...» [ 14, с. 217].

Не пераймаючы і не з'яўляючыся ўсімі сваімі героямі адначасова, У. Высоцкі выкарыстоўвае маску як прыём пабудовы літаратурнага дыскурсу. Ствараючы вобраз галоўнага героя, ад імя якога вядзецца аповед, У. Высоцкі вызначае суадносна з гэтым дыскурс, элементы якога пада-

браны настолькі дакладна, што ствараецца ўражанне адзінства аўтара і вобраза галоўнага героя. Безумоўна, У. Высоцкі не быў «папугаем», аднак вобраз Папугая з «Песни Попугая» прадстаўлены настолькі яскрава, што не пакідае сумненняў у існаванні гэтага героя на самай справе. Гэтага аўтар дасягнуў пры дапамозе стварэння маскі Папугая, праз адпаведны змест і форму дадзенага твора.

Змест уяўляе сабой «аўтабіяграфічны» аповед, які вядзецца ад імя «я» галоўнага героя. У адпаведнасці з тым, што такі аповед аб пірацкіх прыгодах мог належаць чалавеку, а не птушцы, трэба канстатаваць, што перад намі – алегарычнае апавяданне, наяўнасць жа ў ім маралі падштурхоўвае чытача да думкі, што перад намі – байка. Знойдзеная намі ў «Песне Попугая» алітэрацыя (характэрная рыса класічнай байкі І. Крылова) таксама падкрэслівае думку аб байцы (тэкст дадзенага твора насычаны гукамі [р], [к], [п], [щ] і г. д.). Наяўнасць рысаў байкі, з аднаго боку, і маска Папугая – з другога, дазволілі аўтару ўключыць у дадзены твор дадатковыя філасофскія сэнсы, а пад відам дыскурсу жартаўлівай песенькі перадаць прыхаваны змест. Таму гэта не проста гісторыя Папугая, а гэта гісторыя чалавека, які быў неадукаваны, патрапіў у няволю, навучыўся (наперакор абставінам) шмат чаму, прычым гэты чалавек не стаў рабом, ён паўтараў толькі тое, што жадаў сам, і адчуваў сябе пры гэтым індывідуумам. І можна сказаць, што гэта гісторыя народа, якога захопнікі хацелі падпарадкаваць сабе, каб атрымаць адукаваных рабоў, але народ стаў адукаваным і ў той жа час застаўся вольным і моцным духам. Наяўнасць некалькіх філасофскіх сэнсаў – таксама характэрная рыса байкі. Аднак на гэтым падабенства да класічнай байкі заканчваецца. У. Высоцкі ўскладняе жанр дадзенага твора інавацыйнымі прыёмамі [15–18].

Па-першае, ён змяняе вобраз-сімвал – Папугай (той, хто ўвесь час паўтарае за кімсьці) на супрацьлеглы – Папугай у «Песне Попугая» паўтарае толькі з мэтай нешта вывучыць і толькі тое, што сам жадае:

> Давали мне кофе, какао, еду,
> Чтоб я их приветствовал: «Хау ду ю ду!»
> Но я повторял от зари до зари:
> «Карамба!», «Коррида!» и «Черт побери!» [19, с. 412].

Па-другое, вобраз галоўнага героя падаецца аўтарам як станоўчы (у класічнай байцы часцей – адмоўны), бо вобраз Папугая аўтар напісаў з усмешкай, але выклікае гэтая ўсмешка пачуцці спачування і нашы станоўчыя адносіны да галоўнага героя.

Па-трэцяе, для пабудовы твора У. Высоцкі выкарыстоўвае не разнастопны ямб, што характэрна для класічнай байкі, а амфібрахі (трохскладовая стапа з націскам на другім складзе). Прычым асноўныя радкі напісаны чатырохстопным амфібрахіем, а радкі, якія ўдакладняюць асноўны сэнс, – трохстопным амфібрахіем. Гэта стварае адпаведны рытмічны малюнак, які ў сваю чаргу падтрымліваецца своеасаблівым размеркаваннем радкоў: два, чатыры, пяць, чатыры. Гэты рытмічны малюнак (2–4–5–4) паўтараецца тройчы. Ён звязаны з колькасцю міні-кульмінацый твора і мае адпаведную схему рыфмоўкі: аа/бвбв/ггддд/ееее (альбо еежж). Такая форма спрыяе найбольш поўнаму раскрыццю зместу, паколькі яна стварае эфект напружання, руху, дазваляе ў малую форму закласці большы змест.

Трэба адзначыць, што маскі У. Высоцкага не з’яўляюцца застылымі. Яны падобны да «масак-трансфармацый» з некалькімі тварамі, якія імгненна змяняюць свой знешні выгляд, іншымі словамі, маскі У. Высоцкага наслойваюцца адна на адну. Напрыклад, пад маскай Папугая ў дадзеным творы мы бачым маску чалавека, а галоўны герой мае нібы два твары.

Аўтарскія маскі У. Высоцкага ляглі ў аснову яго творчай лабараторыі, яны вызначаюць унутраны стан жанраў, асаблівасці стылю, паколькі гэта своеасаблівае бачанне аўтарам рэчаіснасці [20–21].

«Наша Ніва» – выданне не сатырыка-гумарыстычнае, але і на старонках так званых «сур’ёзных» выданняў мы сустракаемся са смехабачаннем як з адным з кампанентаў светабачання ўвогуле. Смеханапаўненне «Нашай Нівы» – тэма вельмі шырокая. Сюды ўваходзіць шэраг розных пытанняў, звязаных перш-наперш з выкарыстаннем жанравай палітры і нацыянальнымі своеасаблівасцямі жанравых форм. На смеханапаўненне ўплываюць тэма, ідэя, аб’ект сатыры і гу-

мару, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці пабудовы твора і г. д. Трэба адзначыць, што значную ролю адыгрываюць подпісы пад творамі: «Тамаш Булава», «К. Альбуцкі», «Тарас Гушча», «Агарак», «Дзядзька Карусь», «Марцін», «Стары Шут», «Дземянаў Гуз», «Андрэй Сацыяліст», «Пятрусь Дзягель», «Янук з-пад Мінска», «Левы», «Вайдэльота», «Дзядзька Пранук», «Сымонка», «Альберт Пав-ч» і г. д. У дадзеным выпадку, на нашу думку, трэба гаварыць зноў-такі не проста аб псеўданімах, а аб псеўданімах-масках.

Пад псеўданімамі-маскамі на старонках «Нашай Нівы» друкаваліся К. Міцкевіч, Ф. Умястоўскі, У. Голуб, І. Луцэвіч, А. Паўловіч і іншыя. К. Міцкевіч падарыў чытачу «Якуба Коласа», але гэта была яго, так сказаць, «сур'ёзная маска», якая ахоплівае большую частку яго творчасці. Між тым і «Тамаш Булава», «К. Альбуцкі», «Тарас Гушча», «Агарак», «Дзядзька Карусь», «Марцін», «Стары Шут», «Дземянаў Гуз», «Андрэй «Сацыяліст», «Пятрусь Дзягель» і г. д. – гэта таксама К. Міцкевіч. Паўстае пытанне: навошта пісьменнік выкарыстаў цэлы шэраг літаратурных псеўданімаў-масак? На нашу думку, гэта дало яму магчымасць пісаць на розныя тэмы, з розных жыццёвых пазіцый, прыцягваць увагу розных чытачоў. Для прыкладу возьмем псеўданімы «Агарак» і «Стары Шут».

Пад псеўданімам-маскай «Агарак» на старонках «Нашай Нівы» друкуюцца сатырыка-гумарыстычныя апавяданні-гісторыі з жыцця мужыкоў.

Сатырыка-гумарыстычнае апавяданне «Андрэй-выбаршчык» прысвечана тэме выбараў у Думу. У ім выкарыстаны дасціпныя вясковыя жарты, народная мова. Сюжэт апавядання трымаецца на славутым пытанні: «Хто ва ўладзе?». Здавалася б, зусім іншай тэме прысвечана апавяданне «У балоце»: «Загразла ў балоце панская каляска разам з панскаю сям'ёю, слугамі, конямі, са ўсім панскім скарбам. Урэзалася яна ў гразь па самыя калодкі, засела на сярэдзіне балота. Палеглі на чэравах коні і ... ні «тпрррү», ні «но!» (...) Першым апомніўся пан і ўзяўся за работу. Першнаперш трэснуў ён кулаком хурману ў спіну, вылаяўся на ўсё балота і пусціў у ход усю машыну. Хурман, узяўшы цугу, высвенцаў коней. Коні задрыгалі нагамі, заварушыліся, перавярнуліся з аднаго боку на другі, і ... машына стала». Тут з'явіліся мужыкі, а разам з імі і вясковыя жарты, своеасаблівая мова.

Гэтыя апавяданні розныя па тэме, кірунку, але аднолькавыя па стылю, бачанню праблемы, жанру. Мяняецца псеўданім-маска – мяняецца і ўсё астатняе. За подпісам «Стары Шут» К. Міцкевіч змяшчае ў «Нашай Ніве» карацелькі-жарты.

Вось, напрыклад, у № 1 за 1907 год чытаем:

> «– Ітак, браціе, сам Бог павелевае ўважаць уласць...
> – Бацюшка! І вураднік – уласць?
> – Уласць.
> – Ад Бога?
> – Ад Бога.
> – А, отож усадзіў Бог уласць, як у пень!..» [22, с. 3].

Падобная да гэтай і карацелька «З судовай практыкі ў Мінскім павеце».

Такім чынам, у аднаго пісьменніка можа быць некалькі псеўданімаў.

Цэлую галерэю псеўданімаў-масак стварыў А. Аверчанка, што прывяло да вялікай колькасці аб'ектаў смеху ў творчасці гумарыста. Праблему смеху і аб'екта смеху ў творах А. Аверчанкі ў той ці іншай ступені закраналі практычна ўсе даследчыкі. Гэта адзначае і А. Міхайлаў ва ўступе да кнігі «Избранные рассказы» [23].

Закранае гэтае ж пытанне і С. Ніканенка. Ён падкрэсліў такую асаблівасць аверчанскага таленту, як пісаць пра ўсё на свеце: «Создается впечатление, что подобно мифическому царю Мидасу, от чьего прикосновения все превращалось в золото, Аверченко способен любую материю обратить в смех. Вероятно, нет такого литературного приема, к которому прибегали бы в прошлом и используют его сегодня сатирики и юмористы, которым бы в совершенстве не владел писатель. Если бы можно было собрать целиком все наследие Аркадия Аверченко, то оно могло бы служить наглядным пособием и иллюстрировать любой прием создания комического в литературе» [24, с. 18].

З гэтым нельга не пагадзіцца. Даследчыкі адзначалі смехавую разнастайнасць, залежнасць смеху ад аб'екта смеху і г. д., але ніхто не звярнуў увагі на тое, што дало магчымасць пісьменніку дасягнуць такой разнастайнасці, што дазволіла ацэньваць яго творчасць як творчасць розных людзей. Нагадаем, напрыклад, якую адзнаку дае А. Аверчанку К. Чукоўскі ў сваім артыкуле «Устрицы и океан» (Речь. – 20.03.1911. – № 77). А. Аверчанка, з яго слоў, – і «Фридрих Ницше», і «придворный щекотальщик».

Даследчыкі не звярнулі ўвагі на тое, што самім лёсам пісьменнік быў пастаўлены ў такія ўмовы, пры якіх пісаць інакш ён не мог. Пачынаючы яшчэ з харкаўскага «Штыка», дзе, па яго ж словах, ён быў і за рэдактара, і за журналіста, і за мастака, і за карэктара... А. Аверчанка становіцца адзіным у некалькіх асобах: ён з самага пачатку сваёй журналісцкай дзейнасці вымушаны быў пісаць на розныя тэмы, з розных пунктаў гледжання. Рабілася гэта, каб чытач «Штыка» не адчуваў недахопу ў «спецыялістах». Менавіта гэта і дапамагло яму зрабіць адно з цікавейшых адкрыццяў, якое, у сваю чаргу, спрыяла здзяйсненню мары пісьменніка – падабацца ўсім чытачам, прыцягваць да выдання публіку.

«Сатирикон» не меў недахопу ў супрацоўніках. Між тым, А. Аверчанка пакідае за сабою права (будучы на пасадзе рэдактара) пісаць і пісаць шмат. А каб мець магчымасць размаўляць з любым чытачом, ён стварае галерэю псеўданімаў-масак. Цэльны, аб'ёмны вобраз – маска жыве на старонках «Сатирикона» «асабістым» жыццём і атрымлівае «ўласны» ганарар. Маскі А. Аверчанкі – цэлы штат супрацоўнікаў выдання: Мядуза Гаргона, AVE, Воўк, Фальстаф, Фама Апіскін і інш. І што, на наш погляд, асабліва цікава: маскі ў «сваіх» творах выказваюць супрацьлеглыя думкі. Такім чынам, кожная маска «мае» на старонках выдання свой уласны погляд на жыццё, свой стыль, смехавую палітру, свае тэмы, жанры, аб'екты смеху. Палітычны памфлет Мядузы Гаргоны ніколі б не падпісаў Фама Апіскін. А інтэлігентны AVE не ўзяўся б за тэмы, што з задавальненнем «распрацоўвае» Воўк. Менавіта са стварэннем масак і звязана разнастайнасць аб'ектаў смеху і самога смехавага свету ў творчасці А. Аверчанкі. Усё гэта лёгка прасачыць, калі даследаваць яго творы па часопісах, дзе захаваліся ўсе подпісы, дзе добра бачна першапачатковая задума аўтара. Калі ж даследчык знаёміцца з кніжным выданнем А. Аверчанкі, то ён і сапраўды губляецца ў разнастайнасці тэм, кірункаў, стыляў і г. д. Дарэчы, трэба заўважыць, што ўсё вышэйадзначанае цалкам датычыцца толькі творчасці А. Аверчанкі да 1917 г. Пасля эміграцыі галерэя масак губляе свой сэнс (загадам урада была прыпынена дзейнасць «Нового Сатирикона»). У творчасці пісьменніка пачынае пераважаць палітычная тэматыка, а да яе ў дадатак ён піша яшчэ і пра тое, што нараджаецца гэтай палітыкай, – жыццё, побыт эмігрантаў. Зрэдку ён піша аб дзецях і зусім рэдка аб мастацтве (ці да мастацтва!). Таму, пры даследаванні масак мы будзем разглядаць толькі даэміграцкую творчасць гумарыста. Наша задача, як ужо было заўважана, перш-наперш у тым, каб прасачыць залежнасць смеху ад маскі. Таму, на нашу думку, не пашкодзяць невялічкія моўныя партрэты самых яскравых масак А. Аверчанкі.

Мядуза Гаргона – дама вядомая – займаецца палітычнай сатырай, за яе подпісам злабадзённыя памфлеты. Яе партрэт – вобраз даволі арыгінальны, паколькі чытач уяўляе яе старай свецкай дамай, якая любіць плёткі і асабліва палітычныя: ведаць, што робіцца ў вышэйшых колах грамадства, – яе абавязак. Яна здзекуецца з кожнага вядомага палітыка, смех яе – дзёрзкі, рэзкі, саркастычны. Яе не цікавяць дробязі жыцця, вось буйныя палітычныя сваркі – іншае пытанне.

З'яўленне гэтай маскі было вызначана самой гісторыяй. Да дня нараджэння «Сатирикона» (красавік 1908 г.) першая руская рэвалюцыя была падаўлена. Былі забаронены шматлікія сатырычныя і гумарыстычныя выданні («Пулемет», «Заря», «Жупел», «Зритель», «Зарево» і г. д.). А. Аверчанка сам казаў, што спазніўся са сваім жаданнем займацца сатыраю: «... Я приехал в столицу в наиболее неудачный момент – не только к шапочному разбору, но даже к концу этого шапочного разбора, когда уже почти все получили по шапке...» [25, с. 6].

Назаўсёды захаваўся ў гэтых радках подых часу. А. Аверчанка адчуваў увесь драматызм становішча прэсы таго часу, між тым, сам ён бярэцца за справу, у дапамогу выкарыстоўвае «эзопаву мову», сістэму кодаў, якую выпрацавалі часопісы 1905–1906 гг. На першы погляд, памфлеты Мядузы Гаргоны – не зусім зразумелыя і не вельмі смешныя. Іх смех (рэзкі, саркастычны) добра прыхаваны самою гісторыяй, і толькі калі аднавіць палітычны малюнак таго часу (безумоўна, вядомую сучасніку гумарыста), то можна зразумець, якое смехавае напаўненне мелі гэтыя творы.

За подпісам Мядузы Гаргоны выйшла шмат памфлетаў, сатырычных мініяцюр. Яе сатырычны погляд закрануў амаль усіх вядомых палітыкаў таго часу.

Пра каго піша Воўк? Пра генерал-губернатараў, пра членаў таварыстваў, дэпутатаў і ўрад, пра звычайных людзей і г. д. Здаецца, што яго задача – толькі заўважыць, схапіць, а затым – «ў кусты».

Фельетон «Крутые времена» пачынаецца паведамленнем, якое аўтар хутчэй за ўсё прачытаў у газеце: «В Саратовском отделении русского народа касса оказалась абсолютно пуста. Не хватило даже на посылку телеграммы Дубровину» [26, с. 3].

Што далей? Далей у характэрнай для аверчанкаўскіх фельетонаў манеры распавядаецца, як уяўляе сабе гэтую карціну сам аўтар. Але недарэмна гэты фельетон выйшаў у свет за подпісам «Воўк». Напісаны ён са з'едлівай ухмылкай, сцісла, без усялякіх літаратурных упрыгожванняў ды філасофіі.

Атмасфера саюза, вобразы яго лідараў, планы – усё гэта перадаецца праз дыялогі герояў. Воўк – назіральнік, ён у баку ад падзей. Пра яго адносіны да ўсяго, што адбываецца ў фельетоне, мы даведваемся толькі праз тое, які матэрыял падаецца, паколькі ўласныя аўтарскія меркаванні адсутнічаюць. Героі фельетона – палітыкі-дылетанты з Саратава. Ім трэба адправіць тэлеграму, але грошай няма, бо ў казне пуста. І Воўк раскрывае тайну, чаму там пуста. Робіць ён гэта ў самым канцы фельетона, у загадкавым, нечаканым заключэнні. Чытач даведваецца, куды падзеліся грошы з казны Саратаўскага аддзела Саюза рускага народа, высвятляецца, што члены саюза проста іх прапілі. Такім чынам Воўк паказвае, якія на самай справе палітыкі ў гэтым саюзе.

Калі ўлічыць вышэйадзначанае, можна сказаць, што мініяцюры Воўка падобныя да невялічкіх анекдотаў з канцом, які кожны разумее па-свойму.

Так, у сатырычнай мініяцюры «Отчаянное средство» (Сатирикон. – 1909. – № 17) распавядаецца, як прадстаўнік грамадзян Адэсы прапанаваў грамадзянам Калугі памяняцца губернатарамі. Але калужане адмовіліся браць сабе губернатара з Адэсы, таму прадстаўніку з горада Адэсы нічога не заставалася, як павесіцца на дрэве ў гарадскім садзе.

Твор гэты мала зразумелы сёння, а між тым адчуваецца смех ад адчаю. Такая тэматыка і такі кірунак не характэрны больш ні для адной з масак А. Аверчанкі. Воўк не надта часта трапляецца на старонках «Сатирикона». Але само з'яўленне гэтай маскі гаворыць шмат аб чым. А. Аверчанку цікавіла не толькі высокая палітыка, не толькі элітарнае мастацтва, яго цікавіў і просты чалавек, жыхар невялічкага гарадка, з якога калісьці выбраўся ў свет і сам гумарыст.

AVE – будзь здаровы! Гэтая маска дае адказы на лісты ў «Почтовом ящике». Але першнаперш AVE – крытык. Ён вядзе сваю тэатральную старонку ў «Сатириконе», піша аб жывапісу, паэзіі і г. д. AVE выступае супраць мадэрнізму, авангардызму...

Перамяніў маску А. Аверчанка – змяніўся аб'ект яго смеху (была Мядуза Гаргона – была палітычная сатыра, быў Воук – быў смех з адчаю, смех з сябе, затым з'явіўся AVE ў шыкоўнай тэатральнай вопратцы, у гальштуку, адукаваны і выхаваны – змяніўся аб'ект смеху, і размова пайшла аб мастацтве).

Аднойчы AVE ў «Весах» прачытаў успамін К. Бальмонта аб наведванні Яснай Паляны. Менавіта з гэтага і пачынаецца фельетон «Великий писатель земли Русской у Льва Толстого». К. Бальмонт успамінае: «Великий старик добрым голосом говорил, подтрунивая: «А вы все декадентские стихи пишете? Нехорошо, нехорошо».

Я ему прочел «Аромат Солнца», а он ... беззвучно посмеивался и приговаривал: «Ах, какой вздор! Аромат Солнца. Ах, какой вздор!». Он попросил прочесть еще что-нибудь. Я прочел... Лев Толстой притворился, что и это стихотворение ему не нравится...». Гэтыя словы К. Бальмонта і сталі матэрыялам для фельетона, сталі аб'ектам смеху. Далей аўтар іранізуе, пасмейваецца з Бальмонта. У прыватнасці AVE расказвае аб тым, як К. Бальмонт з'явіўся да Талстога з прапановай пачытаць вершы:

«– Ну, уж так и быть…. – Прочту свои стихи! Что уж с Вами делать!...

Едва сдерживая душившую его радость, он притворился хладнокровным, сказал:

– Может быть, стишки бы того ... по боку! А?» [27, с. 3].

А. Аверчанка выкарыстоўвае размоўны стыль. Смех перадаецца пры супастаўленні таго, што мог сказаць Талстой, і таго, што яго «прымушае» казаць А. Аверчанка. Далей К. Бальмонт прапануе Талстому паслухаць «Аромат Солнца».

«По мере чтения его врожденная шутливость и природный юмор возрастали, и на третьем стихотворении великий старик закричал хриплым голосом, притворяясь испуганным:

– Эй, люди! Сюда... Ко мне!!

Вбежало несколько человек прислуги.

– Уведите этого человека – устройте, чтобы он поскорее уехал! – попросил он, притворяясь негостеприимным.

– А я вам еще хотел почитать свой «Скрежет Млечного пути»...» [27, с. 3].

Трэба адзначыць, што ў AVE – выдатны густ. Ён мог бы быць выдатным «... істам», каб не быў супраць абстрактнага мастацтва. Заўважым, як трапна ён знайшоў новы загаловак вершам К. Бальмонта «Скрежет Млечного пути», які нічым не горш за «Аромат Солнца». Цікава пададзена і рэакцыя самога Талстога: «Притворяясь, что заглавие этого стихотворения кажется ему не совсем удачным, великий старик запустил в меня маленькой скамеечкой для ног и вскричал, тщательно скрывая свое преклонение перед мощью моего таланта:

– Отказываюсь раз и навсегда от своей вздорной теории «О непротивлении злу»!!

Так перед грандиозностью гения рушатся мелкие вздорные теории. Когда я ехал обратно, то возница притворился, что хочет получить с меня за проезд деньги, а станционный кассир сделал вид человека, принимающего меня за сумасшедшего» [27, с. 3].

AVE ведае мастацтва, прычым ведае яго дасканала: кірункі, школы, плыні... Ён улюбёны ў прыгожае і не можа пагадзіцца з існаваннем «гультаёў» у творчым свеце. Яго фельетоны прасякнуты і сціслай іроніяй, і адкрытым сарказмам. AVE вітае геніяльнасць, але карае бяздарнасць.

Сярод крытыкаў таго часу былі і такія, што спрабавалі «выехаць» на навамодных плынях у мастацтве, надавалі вагу тым, хто нічога не рабіў для сапраўднага мастацтва. У фельетоне «Выставки (Союз русских художников)» (Сатирикон. – 1909. – № 11) AVE распавядае пра тое, як аднойчы ён (малады фельетаніст) дамовіўся з мастакамі пайсці на выставу сучаснага мастацтва, і што з гэтага наведвання атрымалася.

Фальстаф – вобраз вядомы. Мы сустракаемся з ім у драме «Король Генрих IV». І якім сатварыў яго Шэкспір – свавольнікам, вясёлым ілгуном – такім ён і «перайшоў» да А. Аверчанкі. Фальстаф назірае за жыццём. Тут жонка здрадзіла мужу, там пляменнік пакрыўдзіў цётку, а на суседняй вуліцы састарэлы мужчына чакае сына, а той гуляе з п’янымі сябрамі.

Гумарыстычныя мініяцюры Фальстафа добра зразумелыя і ў наш час. Ды толькі Фальстаф не проста смяшыць чытача. На першы погляд, лёгкі смех гумарыстычных мініяцюр Фальстафа лечыць чалавечыя душы, дапамагае чытачу зразумець і іншых, і сябе.

Наступная маска – Фама Апіскін. Вобраз гэтага ханжы стварыў Ф. Дастаеўскі ў аповесці «Село Степанчиково и его обитатели», «узяты» на працу А. Аверчанкам у «Сатирикон». Гэта, бадай што, адна з самых любімых масак гумарыста. У яе надзвычайны лёс. Фама Апіскін перажыў свой часопісны час і «выступіў» з «асабістаю кнігай». У 1914 г. у Санкт-Пецярбурзе пабачыла свет кніга А. Аверчанкі «Сорные травы» за подпісам Фама Апіскін. Гэта адна з самых складаных масак А. Аверчанкі. Пра што ён толькі не піша! На першы погляд, ён аб’ядноўвае ўсе маскі, бо цікавіцца ўсімі людскімі заганамі (Наследственность // Сатирикон. – 1909. – № 36), пісьменнікамі, іх творчасцю (Писатели // Сатирикон. – 1909. – № 12), палітыкай (Парадный обед // Сатирикон. – 1909. – № 7) і г. д. Піша амаль пра ўсё. Але сказаць, што Фама Апіскін – гэта і AVE, і Воўк, і Мядуза Гаргона, і Фальстаф, было б няправільна. Паглядзім, напрыклад, чым адрозніваюцца (у агульных рысах) фельетоны Фамы Апіскіна ад твораў Мядузы Гаргоны. Як мы падкрэслівалі вышэй, Мядузу Гаргону цікавяць палітычныя плёткі, адносіны паміж партыямі ў Думе, канстытуцыя, адносіны паміж палітычнымі дзеячамі і інш.

Героямі Фамы Апіскіна таксама з’яўляюцца палітычныя дзеячы, але яго цікавіць не вытанчанасць высокай палітыкі. Перш за ўсё яго цікавяць інстынктыўныя жывёльныя праявы палітычных дзеячаў (А Фальстаф?). Але Фальстаф мае сваю мастацкую палітру, яго смех больш лёгкі, яскравы, поўны яркіх фарбаў.

Фама Апіскін бліжэй да маскі Ваўка. Ён, мабыць, як і Воўк, «выйшаў з народа». Між тым Фама Апіскін – кемлівы, разумее мастацтва, але яму не хапае адукацыі, якую «атрымаў» AVE, ён піша проста, не закранаючы вышэйшых матэрый. Яго смех – гэта смех-здзек, смех-нянавісць. Ён нагадвае старога, што шмат у жыцці бачыў, які жыве, як жабрак, і за гэта ненавідзіць увесь свет. Возьмем фельетон «Ошибка» (Сатирикон. – 1909. – № 8). Сюжэт нескладаны, ды і тэма, абраная для размовы, не надта высокая (Мядуза Гаргона і не глянула б на такую тэму). У палацы, дзе амаль цёмна, у сваім пакоі сядзяць акцябрысты. Яны «ненавідзяць» кадэтаў. Тут узнікае рашэнне – злавіць кадэта і яго разарваць. У цемені акцябрысты ідуць у пакой кадэтаў і выманьваюць адтуль чалавека. Вырашаюць, што з ім рабіць, але раптам бачаць, што злавілі свайго. Для Мядузы Гаргоны гэта – не факты, няма чаго і пісаць. Фама Апіскін лічыць інакш, ён жадае паказаць унутраную сутнасць акцябрыстаў. Таму Апіскіна цікавяць рэплікі, словы, учынкі, і з гэтай драбязы ён стварае выдатны твор. Свайго аўтарскага майстэрства Фама Апіскін дасягае пры дапамозе невялікіх з’едлівых заўваг, азначэнняў і г. д. (напрыклад, пра тое, што акцябрысты ненавідзяць кадэтаў, зразумела чытачу не толькі з іх слоў, а з заўвагі аўтара, аб тым, што шпалеры ў пакоі кадэтаў паабляталі, так што нават цэгла, якая вытыркаецца з-пад іх, «пратэстуе» разам з акцябрыстамі і г. д.).

Удзельнічаюць у абмалёўцы вобразаў і ўчынкі «напалову». Так, акцябрысты прыдумваюць, што ім зрабіць са злоўленым кадэтам, а адзін з акцябрыстаў прапануе абліць кадэта напалову кіпенем – а гэта проста цёплая вадзічка.

У сатырычным апавяданні «Ошибка (Восточное сказание)» (Сатирикон. – 1909. – № 6) Фама Апіскін распавядае аб тым, як персідскі губернатар-злодзей узяў сабе руку сумленнага пашталььёна, а яму аддаў сваю. Губернатар стаў сумленным, а паштальён пачаў красці, і яны абодва пакутавалі ад гэтых пераўтварэнняў. З аднаго боку, відавочна палітычная тэматыка, бо выкрываецца чыноўнік-злодзей і г. д., але з другога – усё гэта зроблена зусім не тымі сродкамі, якімі карыстаецца Мядуза Гаргона – праз асабістае жыццё герояў, праз, на першы погляд, нязначныя ўчынкі. Фельетон «Тяжелый крест» (Сатирикон. – 1909. – № 46) прысвечаны Гучкову. Але гэта зусім не той Гучкоў, якога мы ведаем па фельетонах Мядузы Гаргоны. Тут Гучкоў – палітык, праўда, амаль няздольны рабіць у палітыцы нешта самастойна (Веселая прогулка // Сатирикон. – 1909. – № 24), але ж палітык.

У фельетоне «Тяжелый крест» перад намі паўстае Гучкоў – прыстасаванец ды яшчэ і палахлівец. Ён з кожным гатовы «абдымацца», абы толькі хто дрэнна пра яго чаго б не падумаў. Пра палітыку – ніводнага слова, а між тым, дзея адбываецца ў Думе. Гучкоў усім спрабуе дагадзіць, бяжыць – толькі скажы! – па газету, па цыгарэты і г. д. Між тым, і гэтым фельетонам Фама Апіскін па-свойму сказаў слова менавіта пра Гучкова-палітыка, якому нельга давяраць.

Маскі звязаны з часопісам, яны народжаны ім. Кожная маска, як мы бачым, мае свой смех, свой аб’ект смеху, свой жанр, стыль. У кнізе іншая справа – там А. Аверчанка непрадказальны. Але так можна сказаць толькі тады, калі разглядаць смех твораў А. Аверчанкі без сувязі з псеўданімамі-маскамі.

Псеўданімы-маскі вызначаюць смехавы свет пісьменніка, яго стыль. Ад іх залежыць танальнасць смеху, сістэма жанраў. Ёсць маскі, так сказаць, шырокага выкарыстання, бо яны выходзяць за межы творчасці адной асобы, іх праграма – вобраз перажывае стваральніка. Так адбылося, напрыклад, з Францішкам Вядзьмаком-Лысагорскім, які быў створаны для сатырыкагумарыстычнай паэмы «Сказ пра Лысую гару». Сапраўднае імя аўтара не раскрыта, яно і па сённяшні дзень з’яўляецца тайнай (хаця час ад часу з’яўляюцца чарговыя гіпотэзы). Між тым, гэты псеўданім-маска выкарыстоўваецца іншымі аўтарамі. Трэба адзначыць, што чытач часам адгадвае своеасаблівасць літаратурнай гульні, асабліва, калі маска мае звязаны з сатырай ці гумарам сэнс. Але ў літаратурным жыцці нямала кур’ёзаў. Так, пісьменніку У. Правасуду, які шмат гадоў прысвяціў часопісу «Вожык», лёс нібы знарок даў прозвішча, якое лёгка можна прыняць за псеўданім-маску.

Мы разгледзелі некалькі варыянтаў стварэння аўтарскай маскі: а) праз «я» літаратурнага героя і пераўвасабленне аўтара ў літаратурны персанаж (ці ў некалькі персанажаў); б) пры дапамозе псеўданіма-маскі, подпісу, які дазваляе аўтару выбіраць іншыя стылі, тэмы і г. д.

Але ёсць выпадкі ў літаратуры, калі абодва прыёмы прысутнічаюць адначасова. Мы маем на ўвазе «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя [28]. Сама маска-псеўданім «Мрый» нібы прадвызначыла лёс пісьменніка. Каб зразумець гэта, дастаткова прыгадаць жыццёвы і творчы шлях А. Шашалевіча, які абраў сабе ў якасці літаратурнага псеўданіма гэткую маску. Каб высветліць паходжанне маскі-псеўданіма «Мрый», звернемся да значэння гэтага слова: «Мара – мана, блазн, морок, морока, наваждение, обаяние, грёза, мечта, призрак, привидение, обман чувств и самый призрак» [29, с. 298], а таксама «мрыять – мельтешить, маячить, брезжить, мерцать, чуть посвечивать, неясно видеться, обозначаться во мраке, в сумерках; мря – непроницаемый туман, во время которого идет густой снег» [29, с. 355]. Такім чынам, атрымліваецца, што «Мрый» – гэта не толькі і не столькі мара ў сэнсе «мечта», а хутчэй за ўсё – прывід альбо нешта ледзь бачнае ў змроку. Аднак у «Запісках Самсона Самасуя» маска-псеўданім «Мрый» аб'ядноўваецца з маскай «я» – галоўнага героя Самсона, ад імя якога вядзецца аповед. Імя Самсон перакладаецца як «сонечны» (і імя, і вобраз дадзенага героя змяшчаюць не толькі сатырычны і гумарыстычны смех, але і міфалагічны смех, звязаны з сонечнай сімволікай [30, с. 89–122]). Аднак аб'яднанне маскі «сонечнага» героя з маскай-псеўданімам «Мрый» (прывід, змрок) толькі на першы погляд змяшчае супярэчлівасць. Міфалагічны «сонечны» Самсон, дзякуючы гэтым сваім якасцям, нацэлены на перамогу, і Самсон Самасуй дзякуючы сваёй мэце атрымлівае перамогу, але перамога сатырычнага героя – гэта перамога кар'ерыста і прыстасаванца, і менавіта ў гэтай перамозе яскрава бачна змрочнае будучае. Аб'ядноўваючы дзве розныя маскі дзеля стварэння сатырычнага вобраза аўтара «Запісак…», А. Шашалевіч здолеў увасобіць у сваім творы сатырычны малюнак тагачаснага жыцця і перадаць яго праз самавыкрыццё.

Характэрная рыса сатыры і гумару – выдаваць адно за другое, хаваць сапраўднае і маскіраваць яго пад уяўнае. На несупадзенні сапраўднага і ўяўнага ставараюцца смешныя эпізоды, менавіта гэта з'яўляецца адной з асноўных рыс, напрыклад, пародыі, а іронія ўвогуле заўсёды змяшчае падвойны сэнс, дзе сапраўдным з'яўляецца не прамы сэнс, а супрацьлеглы яму. Аўтарская маска таксама маскіруе сапраўдны твар, яна дазваляе пераўвасобіцца аўтару ў літаратурны персанаж, выбраць своеасаблівы стыль і г. д. Менавіта ў сатырычным (гумарыстычным) творы аўтарская маска найбольш яскрава знаходзіць сваё прымяненне, бо яе стварэнне вельмі падобна на характар пабудовы і асаблівасці ўсяго астатняга ў сатырычным (гумарыстычным) творы. Такім чынам, даследаванне маскі вельмі істотна пры аналізе стылю пісьменніка, яго творчай лабараторыі, асабліва калі гэта датычыць творчасці сатырыка, гумарыста.

## Літаратура


1. В а л о ш и н, М. А. Лики творчества / М. А. Валошин. – Л.: Наука, 1988.
2. Т ы н я н о в, Ю. Н. Достоевский и Гоголь (К теории пародии) / Ю. Н. Тынянов // Поэтика. История литературы. Кино. – М.: Наука, 1977.
3. Г р у з д е в, И. Лицо и маска / И. Груздев // Серапионовы братья: Альманах. – Берлин, 1922.
4. Б а х т и н, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М.: Искусство, 1979.
5. О с ь м у х и н а, О. Ю. Авторская маска в русской культуре: генезис, эволюция, специфика функционирования / О. Ю. Осьмухина // Обсерватория культуры. – 2007. – №4. – С. 46–63.
6. Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А. Н. Николюкина. Ин-т науч. информ. по обществ. наукам РАН. – М.: НПК «Интелвак», 2001.
7. Т е р у, П. Моя тайная история / П. Теру // Иностранная литература. – 2000. – № 3. – С. 3.
8. А в д е е в, А. Д. Маска и ее роль в процессе возникновения театра / А. Д. Авдеев // VII Междунар. конгресс антропологических и этнографических наук. – М., 1964.
9. И в л е в а, Л. М. Ряженье в русской традиционной культуре / Л. М. Ивлева. – СПб.: Рос. ин-т истории искусств, 1994.
10. И в л е в а, Л. М. Окрутки, хухляки, страшки... / Л. М. Ивлева // Жив. старина. – 1995. – № 2. – С. 29–30.
11. Маска и маскарад в русской культуре XVIII–XX вв. Сб. ст. – М., 2000.
12. Л е в и-С т р о с, К л о д. Путь масок / Клод Леви-Строс. – М.: Республика, 2000.
13. К р а п і в а, К. Выбраныя творы: у 2 т. / К. Крапіва. – Мінск: Маст. літ., 1986. – Т. 1. – С. 12.
14. В ы с о ц к и й, В. С. Собр. соч.: в 4 т. / В. С. Высоцкий. – М.: Время, 2008. – Т. 4.
15. T k a c h o v a, P. P. To a question on self-organizing literary genres: chaos, structure, system, model in the literature, author's innovative genres / P. P. Tkachova // CHAOS 2009. Book of Abstracts. 1–5 june 2009, Chania,Crete, Greece. – P. 88.
16. Т к а ч о в а, П. П. Да праблемы межаў гумару і сатыры ў сістэме родаў літаратуры / П. П. Ткачова // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2007. – № 4. – С. 92–95.

17. Т к а ч о в а, П. П. Узнікненне інавацыйных аўтарскіх жанраў на аснове працэсаў самаарганізацыі ў літаратуры / П. П. Ткачова // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2010. – № 2. – С. 98–106.
18. Т к а ч е в а, П. П. Инновационный подход к классической басне (по творчеству В. С. Высоцкого) / П. П. Ткачева // Вопросы языка и литературы в современных исследованиях. – М.; Ярославль: Ремдер, 2010. – С. 514–520.
19. В ы с о ц к и й, В. С. Собр. соч.: в 4 т. / В. С. Высоцкий. – М.: Время, 2008. – Т. 3.
20. Т к а ч е в а, П. П. Жанровые границы произведения В. Высоцкого «Про дикого вепря» / П. П. Ткачева // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі.– Мінск: Бестпрынт, 2008. – Вып. 5. – С. 210–215.
21. Т к а ч е в а, П. П. Символическое пространство в произведении В. Высоцкого «Очи черные» / П. П. Ткачева // Вопросы языка и литературы в современных исследованиях.– М.: Ремдер, 2009. – С. 352–358.
22. Наша Ніва. – 1908. – № 14. – С. 3.
23. М и х а й л о в, О. Н. Аркадий Аверченко / О. Н. Михайлов // Аверченко, А. Т. Избранные рассказы. – М.: Сов. Россия, 1985. – С. 5–18.
24. Н и к о н е н к о, С. С. Король смеха / С. С. Никоненко // Аверченко, А. Т. Бритва в киселе. – М.: Правда, 1990. – С. 18.
25. Новый Сатирикон. – 1913. – № 23. – С. 6.
26. А в е р ч е н к о, А. Т. Крутые времена /А. Т. Аверченко // Сатирикон. – 1909. – № 22. – С. 3.
27. А в е р ч е н к о, А. Т. Великий писатель земли Русской у Льва Толстого / А. Т. Аверченко // Сатирикон. – 1908. – № 3. – С. 3.
28. М р ы й, А. Творы: Раман, апавяданні, нататкі / А. Мрый. – Мінск: Маст. літ., 1993.
29. Д а л ь, В. И. Толковый словарь живого великорусского языка / В. И. Даль. – М.: Рус. яз., 1982. – Т. 2.
30. К а р а с е в, Л. В. Философия смеха / Л. В. Карасев. – М.: Рос. гуманит. ун-т, 1996.

*P. P. TKACHOVA*

**MASK IN SATIRE AND HUMOR LITERATURE: TRANSFORMATIONS OF THE AUTHOR'S IMAGE IN THE WORK OF ART**

## Summary

Image of the author is an imagination of reader about the one who has written the art product. Certainly, image of the author in many respects is similar to the author, because the author's ideas and feelings have been incorporated into his creation. But there are some cases in fiction when image of the author completely has been subjected to laws of the art image creation. In such cases we deal with a innovative transformation of image of the author. In the given article some questions connected to the problem of the so-called "author's mask" have been considered. Such mask allows the author to transform into the literary character to choose original style etc. Thus, the research of innovative transformation of image of the author as well as his mask is rather essential for analysis of style of the writer, of his creative laboratory, especially when it concerns to creativity of the satirist, humorist.

## *МОВАЗНАЎСТВА*

*УДК 070(476) Наша Ніва*

*Т. М. МАРАКУЛІНА*

# ЗАГАЛОЎКІ ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТЭКСТАЎ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА»: ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ І СТРУКТУРНЫ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

*Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 14.12.2010)*

Адным з перспектыўных напрамкаў сучаснай беларускай функцыянальнай стылістыкі з’яўляецца даследаванне заканамернасцей функцыянавання беларускай мовы ў сферы яе актыўнага ўздзеяння на грамадства – у сродках масавай інфармацыі і, у першую чаргу, у газеце. На сучасным этапе развіцця беларускай лінгвістыкі існуе неабходнасць у комплексных сістэмных даследаваннях анамастыкі публіцыстычнага тэксту. Пэўныя аспекты гэтай праблематыкі знайшлі сваё адлюстраванне ў навуковых працах айчынных мовазнаўцаў [1; 2]. Спецыяльнага вывучэння патрабуе і такая анамастычная адзінка, як газетны загаловак – адзін з асноўных элементаў кампазіцыйнай і сэнсавай арганізацыі тэксту. Менавіта назва адыгрывае важную ролю ва ўспрыманні газетнай публікацыі. Таму застаецца актуальным аналіз спецыфікі функцыянавання газетных загалоўкаў, іх структурна-семантычныя і стылістычныя механізмы прагматычнага ўздзеяння, роля ў фарміраванні інфармацыйнага адзінства тэксту. Асноўная ўвага лінгвістаў часцей скіроўваецца на даследаванне загалоўкаў мастацкіх твораў [3; 4]. Калі ж аб’ектам вывучэння становіцца менавіта газетны загаловак, то аналіз звычайна праводзіцца на матэрыяле сучаснай газетнай публіцыстыкі [5–7], пры гэтым па-за ўвагай мовазнаўцаў застаецца вельмі значны перыяд у гісторыі фарміравання публіцыстычнага стылю беларускай мовы, у прыватнасці, яго газетнай разнавіднасці.

У сувязі з гэтым уяўляецца актуальным зварот да пачатковага, але надзвычай важнага этапу ў развіцці беларускай газетнай публіцыстыкі – перыяду дзейнасці газеты «Наша Ніва». На пачатку ХХ ст. яна стала тым сродкам масавай інфармацыі, які здолеў на сваіх старонках узняць актуальныя на той час грамадска-палітычныя, сацыяльныя і культурныя праблемы і даць ім ацэнку з дэмакратычных пазіцый. Вось як вызначаліся мэты і задачы «Нашай Нівы» рэдакцыяй самой газеты: «... будзіць у беларусоў пачуцьцё чалавека і грамадзяніна, голасна гаварыць аб яго патрэбах і правох … усе новые думскіе законы, каторые датыкаюць Беларусі, разбіраць і ацэніваць жывымі прыкладамі з жыцьця Беларускаго краю; тлумачыць сваім чытацелём усё, што робіцца на цэлым сьвеце і ў Расеі» [8].

Аб’ектам нашага даследавання паслужылі загалоўкі публіцыстычных тэкстаў газеты «Наша Ніва». Асноўная мэта даследавання заключаецца ў тым, каб паказаць гэтыя анамастычныя адзінкі як неад’емны кампанент адзінай інфармацыйнай і тэкстаўтваральнай сістэмы: вызначыць іх функцыянальныя асаблівасці ў публіцыстычным тэксце нашаніўскага перыяду, выявіць і прааналізаваць структурныя тыпы загалоўкаў. Пад газетна-публіцыстычнымі тэкстамі разумеецца сукупнасць тэкстаў на палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і іншыя тэмы, абмежаваныя рамкамі газеты «Наша Ніва». Такім чынам, газетны матэрыял і тэматычна, і жанрава дастаткова разнастайны і разнародны. Гэта інфармацыйныя нататкі, палітычныя каментарыі, аналітычныя артыкулы і агляды, у якіх закранаюцца найбольш важныя грамадска-палітычныя, грамадска-эканамічныя, сацыяльныя і культурна-асветніцкія праблемы. Матэрыялам даследа-

вання, атрыманым метадам суцэльнай выбаркі, паслужыў корпус загалоўкаў інфармацыйных і аналітычных газетна-публіцыстычных тэкстаў за 1906–1915 гг. Колькасць прааналізаваных прыкладаў – 1000 адзінак.

Эфектыўнасць любога газетна-публіцыстычнага тэксту ў першую чаргу вызначаецца яго магчымасцю выклікаць цікавасць чытача да змешчанай інфармацыі. Газетны загаловак у дасягненні такой мэты займае ключавую пазіцыю. Так, даследаванні псіхолагаў паказваюць, што прыблізна 80% чытачоў наогул звяртаюць увагу толькі на загаловак [9]. З пункту гледжання лінгвістыкі, загаловак з'яўляецца часткай тэксту, яго структурным элементам [10]. Аднак многія даследчыкі прызнаюць дваістую прыроду загалоўка, а менавіта: разглядаючы загаловак як элемент тэксту, яны адначасова адзначаюць і самастойнасць гэтай адзінкі [11–14]. Такім чынам, загаловак, з аднаго боку, з'яўляецца структурным і сэнсавым складнікам тэксту і непарыўна звязаны з яго галоўнай думкай. Пры гэтым ён з'яўляецца і адзінкай, з якой пачынаецца акт камунікацыі з чытачом, і элементам, з якога пачынаецца працэс успрымання тэксту адрасатам. З другога боку, неабходна прызнаць і той факт, што загаловак характарызуецца дастатковай самастойнасцю (на што ўказвае яго прасторавая пазіцыя – пэўная дыстанцыйнасць), канкрэтнымі граматычнымі і семантычнымі характарыстыкамі, не адрываючыся пры гэтым ад тэксту. Такім чынам, газетны загаловак вызначаецца намі як камунікатыўная адзінка ў пазіцыі перад тэкстам, якая з'яўляецца яго назвай, мае пэўнае сінтаксічнае афармленне, прама ці ўскосна ўказвае на змест тэксту і адмяжоўвае адно маўленчае выказванне ад другога. Ролю газетнага загалоўка, на наш погляд, карэктна разглядаць у аспекце ўспрымання яго адрасатам, а таксама з улікам зместавай сувязі загалоўка непасрэдна з тэкстам. У сучаснай навуковай літаратуры вызначаюцца наступныя функцыі газетнага загалоўка:

– *намінатыўная*: загаловак называе, абазначае тэкст;

– *інфарматыўная*: паведамляючы што-н., загаловак актывізуе мысленне чытача праз абуджэнне цікавасці да інфармацыі;

– *сэнсаўтваральная*: загаловак дапамагае зразумець змест публікацыі;

– *экспрэсіўна-ацэначная:* загаловак удзельнічае ў фарміраванні эмацыянальнага ўздзеяння на чытача;

– *функцыя адлюстравання аўтарскіх адносін да прадмета маўлення і да тэксту*: загаловак дапамагае чытачу зразумець аўтарскую пазіцыю;

– *стылістычная*: загаловак уключаецца ў стварэнне стылістычных тэкставых эфектаў;

– *рэкламная:* загаловак спецыяльна прыцягвае ўвагу чытача да тэксту;

– *графічна-выдзяляльная:* загаловак міжвольна прыцягвае ўвагу чытача з дапамогай разнастайных графічных сродкаў;

– *мнеманічная*: загаловак у цэлым дапамагае чытанню і запамінанню газетных публікацый [15; 16].

Ступень праяўлення кожнай з вышэйназваных функцый вызначаецца пры іх узаемадзеянні ў кожным канкрэтным газетным загалоўку. Як паказалі даследаванні, у мове «Нашай Нівы» большасць загалоўкаў публіцыстычных артыкулаў скіравана на выкананне намінатыўнай, інфарматыўнай, сэнсаўтваральнай і ацэначна-экспрэсіўнай функцый. Так, газетны загаловак – гэта назва, абазначэнне тэксту, якая дапамагае чытачу зарыентавацца ў газетнай прасторы і выбраць цікавую для сябе інфармацыю. Інфарматыўная і сэнсаўтваральная функцыі загалоўка ў «Нашай Ніве» праяўляюцца ў яго здольнасці ў сціслай форме выразіць змест твора, дапамагчы чытачу лепш усвядоміць сэнс паведамлення і зразумець аўтарскую канцэпцыю. Своеасаблівымі «сігналамі семантычнай напоўненасці» адпаведнага тэксту выступаюць такія нашаніўскія загалоўкі, як *«Аб мужыцких павинносцях», «Бюджэт народнаго вучыцеля», «Выбары», «Палажэньне у Эуропе», «Вайна», «Дума и народ», «На Балканах», «Да нашых беларускіх інтэлігентоу», «З вясковага жыцьця», «Як жыве амэрыкански рабочы», «Нехват школ», «Як у Бэльгии ваююць з даражыней», «Якуцкі національны рух», «Аб народным вучыцелю», «Значэньне народнай прасьветы», «Партии у Думе», «Новы закон аб рэкрутчыне», «Асцярога эмігрантам»* і інш. Інфарматыўнасць, яснасць і дакладнасць, дэмакратычнасць у выбары лексічных сродкаў і лаканічнасць – асноўныя характарыстыкі загалоўкаў нашаніўскай публіцыстыкі, прызначанай у першую чаргу для «... беларускай беднаты працовитай; для тых васьми мийлоноу мужыкоу беларусоу, чыю мову так

доуга гнали и высьмейвали» [17]. Лаканічнасць дасягаецца эканомным выкарыстаннем моўных сродкаў, адборам неабходнай і дастатковай інфармацыі, выключэннем залішніх падрабязнасцей. Кожнае слова ў загалоўку нясе сэнсавую нагрузку. Асноўны сэнс гэтых загалоўных канструкцый найчасцей пераходзіць у агульны сэнс тэксту газетнай публікацыі: у сціслай форме загаловак выражае яе асноўную тэму (ці яе тэзіс), ідэю, часам прадвызначае змест твора. Прычым у семантыцы газетнага загалоўка прама ці ўскосна знаходзіць адбітак як сувязь газетнай інфармацыі з сацыяльнай рэчаіснасцю, так і характар падачы гэтай інфармацыі ў тэксце. Такія загалоўкі характарызуюцца апісальнасцю, пэўнай стандартнасцю, нейтральнасцю і ўласцівыя ў першую чаргу такім газетным жанрам, як інфармацыйная нататка, палітычны каментарый, аглядны артыкул.

Супрацьлегласцю стандарта з'яўляецца прыём экспрэсіі, які таксама выкарыстоўваецца ў газетных загалоўках «Нашай Нівы». Экспрэсіўнасць уключае ў сябе некалькі базавых канататыўных аспектаў – ацэначнасць, эмацыянальнасць, вобразнасць, інтэнсіўнасць і інш., што дае магчымасць адрасанту ўплываць на свядомасць і эмоцыі адрасата. Таму загаловак павінен быць цікавым, арыгінальным, у меру інтрыгуючым: *«Не жаласьці, а праўды!», «Голас прауды», «Месца нима!..», «"Тожэ" беларусы», «"Прыяцелі"», «Глыбы і слаі», «"Зрэбные" и "паркалёвые"», «Праудзівы шлях», «Апекуны і дарослае дзіця»* і інш. Выконваючы экспрэсіўна-ацэначную функцыю, такі загаловак удзельнічае ў фарміраванні эмацыянальнага ўздзеяння газетнага твора на адрасата. У адрозненне ад апісальных загалоўкаў, якія адлюстроўваюць тэму тэксту, некаторыя экспрэсіўныя загалоўкі можна аднесці да алюзійных, паколькі іх сувязь непасрэдна з тэмай тэксту з'яўляецца адноснай і вобразнай, напрыклад: *«Скора прыдзе весна..», «Запахло порахам», «Скінулі скуру!», «Край с пяцьцю ніцямі», «Хто к лесу, а хто к бесу»* і інш. Пасля прачытання такой метафарычнай назвы ў чытача можа з'явіцца індывідуальны варыянт разумення сэнсу яшчэ непрачытанага тэксту. Экспрэсіўна-ацэначная функцыя такога роду загалоўкаў праяўляецца і ў адлюстраванні аўтарскай ацэнкі і адносін да прадмета маўлення і да тэксту і вызначаецца тым, што загаловак павінен пераканаць чытача ў тых палажэннях, якія абараняе аўтар. Пра гэта сведчаць такія назвы артыкулаў, як *«Горэй ня будзе», «Хто з намі, хто проціў нас», «Не дамося», «Свайго не чурайцесь, чужому навучайцесь», «Жыла, жыве і будзе жыць!..»* і інш.

Акрамя таго, загаловак у «Нашай Ніве» адыгрывае графічна-выдзяляльную ролю, аддзяляючы тэкст ад іншых тэкстаў, вызначае яго межы. У гэтым сэнсе назва служыць своеасаблівым знакам, які сігналізуе пра існаванне тэксту на пэўным месцы ў газетнай прасторы. Часам чытач запамінае публікацыю, калі яна звярнула на сябе ўвагу зместам або выразнай кампазіцыйнай пабудовай, у якую ўваходзіць і загаловак. Менавіта назва, якая кампрэсіўна выражае змест тэксту, можа захавацца ў памяці чытача. У гэтым выражаецца мнеманічная функцыя загалоўка.

Што датычыць стылістычнай і асабліва рэкламнай функцый (у сучасным іх разуменні), то ў газетных загалоўках «Нашай Нівы» яны, безумоўна, прысутнічаюць, але адыходзяць на другі план. Магчыма, гэта можна растлумачыць адсутнасцю багатага журналісцкага вопыту ў нашаніўскіх аўтараў, якія, даючы назву тэксту, хутчэй за ўсё зыходзілі з характару самога паведамлення, яго жанравай прыналежнасці, а таксама ўлічвалі запатрабаванні і кампетэнтнасць чытачоў і не імкнуліся да стварэння спецыяльных стылістычных «эфектаў», якімі характарызуюцца загалоўкі ў сучасных СМІ. Вывучэнне стылістычнай функцыі патрабуе больш глыбокага аналізу семантыкі газетнага загалоўка, сувязі кампанентаў загалоўка і іх непасрэднай рэалізацыі ў тэксце.

На выкананне асноўных функцый газетнага загалоўка арыентавана таксама і яго сінтаксічная форма з яе семантычным зместам і лексічным напаўненнем. Выбар аўтарам пэўнай сінтаксічнай канструкцыі як спосабу выражэння яго інтэнцыі павінен быць абумоўлены характарам развіцця зместу артыкула, адпавядаць патрабаванню прадказальнасці, якое вызначае працэс чытання, інтэрпрэтацыі і разумення тэксту чытачом.

Паколькі газетныя загалоўкі ў тэкстах «Нашай Нівы» ў асноўным будуюцца па пэўных мадэлях, абумоўленых агульнымі заканамернасцямі сінтаксісу, сінтаксічны статус загалоўных канструкцый, іх структурныя асаблівасці можна вызначыць шляхам іх суаднясення са структурнымі схемамі словазлучэння і сказа.

Да назваў, якія маюць спецыфічныя рысы, уласцівыя толькі загалоўкам, адносяцца аднакампанентныя загалоўкі, пабудаваныя без удзелу прэдыкатыўнай формы дзеяслова. Так, у «На-

шай Ніве» 5,2% (табл. 1) складаюць назвы, выражаныя *назоўнікам у Н. скл.*: *«Выбары», «Прамова», «Японія», «Вайна», «“Націоналізація”», «Зода», «Праца», «Воля», «Коопэрация», «Самоупраўленне», «Забабоны»* і інш. Гэтыя загалоўкі абазначаюць тэму паведамлення і выконваюць намінатыўную і інфарматыўную функцыі.

Т а б л і ц а 1. **Колькасная характарыстыка структурных тыпаў загалоўкаў газеты «Наша Ніва»**

| Структурныя тыпы загалоўкаў | Колькасць, % |
|---|---|
| Аднакампанентныя назвы | 5,2 |
| Назоўнік у *Н. скл.* + *і* + назоўнік у *Н. скл.* | 9,7 |
| Прыназоўнікавыя канструкцыі | 20,6 |
| Загалоўкі тыпу *«Вільня, ...»* | 27 |
| Словазлучэнні | 18,2 |
| Аднасастаўныя сказы | 10 |
| Двухсастаўныя сказы | 8,6 |
| Складаныя сказы | 0,7 |

Сінанімічнымі па выконваемых функцыях да гэтага тыпу загалоўкаў з’яўляюцца прыназоўнікавыя канструкцыі, пабудаваныя па схеме *прыназоўнік+назоўнік (з залежнымі словамі) ва ўскосным склоне.* Такіх загалоўкаў 20,6% (табл. 1). Найбольш пашыраныя загаловачныя канструкцыі з прыназоўнікам *аб: «Аб перасяленьню», «Аб “бюджэце”», «Аб гарадох», «Аб свабодах», «Аб национализации школы», «Аб мужыцких павинносцях», «Аб народным вучыцелю», «Аб арэндзи зямли у Беларуси», «Аб унивэрсытэци у Вильни», «Аб беларускім національным адрадзэньні», «Аб беларускай народнай песьні», «Аб грамадзкай працы», «Аб дарогах у Беларусі», «Аб навучаньні веры», «Аб вясковай інтэлігенцыі».* Такія загалоўкі складаюць 67,8% ад агульнай колькасці канструкцый, суадносных са схемай *прыназоўнік+назоўнік (з залежнымі словамі) ва ўскосным склоне.* Варыянтам да такіх загалоўкаў з’яўляюцца больш разгорнутыя канструкцыі, якія пачынаюцца з выразаў «Колькі слоў аб…» і «Ешчэ аб…», «Думкі аб…», «Справа аб…», «Закон аб...», «Праект закона аб…». Гэтыя канструкцыі ў «Нашай Ніве» набываюць характар устойлівых: *«Кольки слоу аб национальным адрадзэньню забытаго народу», «Колькі слоу аб даунай веры беларусоу», «Колькі слоу з дарогі па Беларусі», «Колькі слоу аб “беларускім” дэпутаці», «Кольки слоу аб славянским народзе чэхах», «Ешчэ аб сплачываньню доугу», «Ешчэ аб зямельнай справи у нас», «Думкі аб школьнай справе», «Новы закон аб рэкрутчыне», «Законы аб арэндаторах-мужыках у Индии», «Справа аб беларускай школі у Думе»* і інш. Адзначаны таксама канструкцыі з прыназоўнікамі *з (с), у, без, на, каля, да, проці: «З Сыбіры», «З гісторыі Фінляндіі», «З жыцьця Англіі», «С Фінляндіі», «З Гішпаніі», «С чужыны», «С Канады»*; *«У Бэсарабіі», «У Пэрсии»*; *«Без гарэлкі»*; *«На Балканах»*; *«Каля вайны»*; *«Да супольнай працы», «Да убогіх духам», «Да вясковых селян», «Проці украінцоу»* і інш. Як і аднакампанентныя загалоўкі, выражаныя назоўнікам у назоўным склоне, разнастайныя субстантыўныя прыназоўнікавыя канструкцыі ў ролі загалоўкаў вызначаюць тэму артыкула і звычайна выконваюць намінатыўную і інфарматыўную функцыі.

Дастаткова распаўсюджанымі ў «Нашай Ніве» з’яўляюцца газетныя загалоўкі, утвораныя па схеме *назоўнік у Н. скл. + і + назоўнік у Н. скл.* (9,7%): *«Дума и народ», «Даражыня и банкруцтва», «Нація і рэлігія», «Сэрбія і Аўстрыя», «Земля і самоупраўленьне», «Расея і Кітай», «“Інородцы” і” іноверцы”», «Граматнасць и заработки», «Апекуны і дарослае дзіця», «Педагогіка і палітыка», «“Зрэбные” и “паркалёвые”», «Слова і дзела»* і інш. Выконваючы ў першую чаргу намінатыўную, сэнсаўтваральную і інфарматыўную функцыі, такія загалоўкі ўяўляюць сабой апорныя кропкі, якія дапамагаюць выбудаваць тэматычную структуру наступнага тэксту. Сваёй лаканічнасцю і выразнасцю яны адразу засяроджваюць увагу чытача на двух асноўных, ключавых, тэматычных кірунках, дапамагаюць зразумець змест публікацыі.

Аналіз фактычнага матэрыялу дае падставы сцвярджаць, што ў «Нашай Ніве» не існуе дакладнай адпаведнасці паміж пэўнай структурай загалоўка і жанрам твора. Інфармацыйная нататка, перадавы артыкул, нарыс, палітычны (эканамічны) агляд, каментарый, эсэ могуць мець

у якасці загалоўка розныя структурныя мадэлі. Аднак некаторыя загалоўкі з’яўляюцца выключэннямі, паколькі прасочваецца заканамернасць іх выкарыстання для тэкстаў з пэўнымі жанравымі характарыстыкамі. Так, на працягу 1906–1912 гг. у «Нашай Ніве» рэгулярна публікаваліся матэрыялы пад загалоўкамі тыпу *«Вільня, 16(29) сьнежня 1910 г.»; «Вільня, 20 (2) трауня (мая)»; «Вільня, 17(30) марца 1911 г.»*, а таксама *«У Думе і каля Думы».* Яны ўяўлялі сабой аглядную інфармацыю пра работу Дзяржаўнай Думы, яе заканатворчую дзейнасць, а таксама пра розныя палітычныя і эканамічныя падзеі як унутры краіны, так і за яе межамі. З 1913 года ў «Нашай Ніве» рэгулярна з’яўляецца інфармацыя пад назвай *«Вайна»* (ваенныя падзеі на Балканах), а з 1914 – «*На вайне і каля вайны»* (хроніка падзей Першай сусветнай вайны). Тэксты пад такімі загалоўкамі па жанравай прыналежнасці можна аднесці да кароткага палітычнага агляду ці хронікі (у залежнасці ад зместу). А змешчаныя на першай старонцы газеты, яны набываюць статус «перадавіцы». Такім чынам, калі ў асноўным нашаніўскія загалоўкі не мелі пэўнай заканамернасці пры суаднясенні з жанрам тэксту, то ў дадзеным выпадку як лексічнае напаўненне, так і структура загалоўка заўсёды сведчылі пра канкрэтны характар і змест наступнага паведамлення. Назвы тыпу *«Вільня, ...»* у «Нашай Ніве» з’яўляюцца адметнымі і складаюць каля 27% ад агульнай колькасці ўсіх структурных тыпаў загалоўкаў (табл. 1).

Зыходзячы з характарыстыкі словазлучэння паводле яго фармальна-граматычнай будовы і агульнага граматычнага значэння, адзначым, што ў якасці загалоўкаў у «Нашай Ніве» ўжываюцца ўсе віды словазлучэнняў, у якіх выражаюцца розныя семантыка-сінтаксічныя значэнні: суб’ектныя, аб’ектныя, акалічнасныя і інш. Найбольш пашыраныя сярод іх – ад’ектыўныя – 75,6% (малюнак), у якіх вельмі часта залежнае слова (у большасці выпадкаў – прыметнік) выконвае не толькі азначальную, але і ацэначную функцыю: *«Карысная работа», «Нячыстая палітыка», «Першы крок», «Фальшывая дарога», «Сіла еднасьці», «Фальшывы страх», «Цяжкая пара», «Шкодная палітыка», «Чужая мова», «Ваукі у авечай скуры», «Пустые словы», «Прыгонная праца», «Праудзівы шлях», «Пуцяводная ідэя», «Важная справа», «Народнае нешчасьце», «Хвароба часу», «Край с пяцьцю ніцямі»* і інш. У такіх загалоўках на першы план выступаюць эмацыянальна-экспрэсіўная і функцыя адлюстравання аўтарскіх адносін да прадмета маўлення і да тэксту.

У разгледжаным намі матэрыяле шырока прадстаўлены газетныя загалоўкі, выражаныя простым сказам. Гэта двухсастаўныя сказы (развітыя і неразвітыя) – 8,6% (табл. 1): *«Што казау дэпутат Гасударственай Думы аб перасеЛенню у Сыбир и Туркестан», «Скора прыдзе весна..», «Правінцыя будзіцца», «Жыцьце вучыць», «Беларусь будзіцца», «Прыйшла пара», «У сваёй хаці – свая сіла», «Народ чуе».* Такія загалоўкі ўяўляюць сабой поўную рэалізацыю мінімальнага граматычнага ўзору (у сказе занятыя ўсе сінтаксічныя пазіцыі і прадстаўлены ўсе кампаненты яго структурнай схемы). Найбольшай інфарматыўнай ёмкасцю характарызуюцца загалоўкі, якія складаюцца з галоўных і даданых членаў.

Асаблівай экспрэсіяй характарызуюцца газетныя загалоўкі, выражаныя клічнымі і пытальнымі сказамі: *«Рэка пайшла!»*, «*А ўсё-ж такі мы жывём!...*», *«Chrystos naradziŭsia!»*; *«Ці запрауды мы ніколі ня будзем мець свайго Міцкевіча, Пушкіна, Сенкевіча, Толстого?»*, *«Ці маем мы права вырэкацца роднай мовы?»*, *«Чаму плачэ песьня наша?»*, *«Што думае народ аб школах?»*,




Загалоўкі-словазлучэнні

*«Чым дзержыцца згода?»* і інш. Праз асобую інтанацыю, уласцівую большасці такіх загалоўкаў, чытачу перадаецца эмацыянальны настрой аўтара, узнікае жаданне атрымаць адказ на вынесенае ў загаловак пытанне.

Асаблівасцю пытальных загалоўкаў у «Нашай Ніве» з'яўляецца тое, што не ўсе загалоўкі захоўваюць пытальную інтанацыю: некаторыя страчваюць значэнне пытальнасці, а набываюць сцвярджальна-апавядальны характар: *«Якім павінен быць беларус», «Што кажуць аб нас палякі», «Якой цэной купляюцца "Амэрыканскіе грошы" на Беларусі», «Чаму нас усе крыўдзяць», «Як жыве амэрыкански рабочы», «Што такое націоналізм»* і інш.

Акрамя простых двухсастаўных, 10% ад агульнай колькасці ўсіх газетных загалоўкаў – гэта розныя віды аднасастаўных сказаў (табл. 1): пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя.

Пэўна-асабовыя сказы ў пазіцыі газетнага загалоўка найбольш пашыраны ў «Нашай Ніве» – 34% (табл. 2). Яны з'яўляюцца надзвычай эфектыўнай формай не толькі для перадачы аўтарскіх адносін (катэгарычнасць, пажаданне, заклік, запрашэнне да сумеснага дзеяння і інш.), эмоцый і іх праекцыі на змест самога тэксту, але яшчэ маюць характар непасрэднага звароту да чытача: *«Свайго не чурайцесь, чужому навучайцесь», «Будзьця цьвёрды», «Будуйце, браты, будуйце!», «Выкупляймося», «Памажыця!», «Не дамося», «Дайце нам нашэ!», «Беражыця прыроду роднага краю», «Сплачывайця доуг», «Схамяніцеся»* і інш. Адсутнасць у такіх загалоўках асабовых займеннікаў падкрэслівае тое, што субяседнікам (аўтару і чытачу) вядома, да каго звяртаюцца, і таму няма неабходнасці называць асобу.

Што датычыць няпэўна-асабовых сказаў (17%, (табл. 2)), то нявызначанасць у загалоўку асобы, якая ўтварае дзеянне, дазваляе зрабіць акцэнт на самім дзеянні: *«Скінулі скуру!», «Не перэбіраюць у спосабах», «Чаму у Бэльгии не караюць сьмерцью?», «Чаму нам не даюць жыць»* і інш. Акрамя таго, такія загалоўкі ўжываюцца, калі па розных прычынах нельга, не абавязкова або нават немагчыма назваць канкрэтнага выканаўцу дзеяння. Часцей за ўсё размова ідзе пра нейкую калектыўную дзейнасць. Хоць у адносінах да калектыўнай дзейнасці не толькі немэтазгодна, але нават і не заўсёды магчыма абазначыць у загалоўку дзеючых асоб, у выніку яны становяцца яснымі для чытача, паколькі інфармацыя пра іх абавязкова будзе змешчана непасрэдна ў тэксце.

Сярод аднасастаўных сказаў у якасці газетнага загалоўка ўжываюцца безасабовыя і інфінітыўныя сказы (24,3 і 22,3% адпаведна (табл. 2)), у якіх з пэўнай ступенню катэгарычнасці падкрэсліваецца значэнне самога дзеяння ці стану безадносна да якога-небудзь канкрэтнага дзеяча: *«Чаго нам трэба дабівацца у Гас. Думе», «Пара ладзіцца да выбароу у земствы», «Думаць і гаварыць трэба па беларуску», «Горэй ня будзе», «Месца німа!..», «Ня гожэ!», «Нашто дарма муціць», «Як нам учыцца», «Дык што-ж рабіць?»* і інш.

Т а б л і ц а 2. **Газетныя загалоўкі ў адносінах да структурных схем простага сказа (колькасная характарыстыка)**

| Аднасастаўныя сказы, % | | | | |
|---|---|---|---|---|
| пэўна-асабовыя | няпэўна-асабовыя | безасабовыя | інфінітыўныя | іншыя віды |
| 34 | 17 | 24,3 | 22,3 | 2,4 |

Асобную групу ўтвараюць газетныя загалоўкі, суадносныя з простым сказам, у якіх асноўная лагічная частка сказа не вербалізавана (напрыклад, адсутнічае выказнік або дзейнік). Разам з тым патэнцыяльна чытач можа самастойна дапоўніць сказ, не скажаючы яго сэнс: *«Па сваім шляху!», «Не жаласьці, а праўды!», «Не адным хлебам...», «Жыла, жывець і будзе жыць!», «Дзе праўда?».*

Найбольш разгорнутымі і поўнымі ў плане інфарматыўнасці з'яўляюцца загалоўкі, суадносныя са структурнай схемай складанага сказа, часткі якога звязаны падпарадкавальнай сувяззю. Такія загалоўкі ў мове «Нашай Нівы» прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі; асноўная думка, ідэя тэксту ў іх выражаецца максімальна дакладна і поўна: *«Аб тым, як сесьці на хутар мужыку», «Як паступаць, каб дзеці выросшы шанавалі сваіх бацькоу і былі ім апорай на старасьць».*

Прыцягнуць увагу чытача, зацікавіць і выклікаць у яго жаданне прадоўжыць чытанне – звышзадача любога газетнага загалоўка. Вырашэнне гэтай задачы датычыцца не толькі зместу газетнага загалоўка, але і той сінтаксічнай формы, у якой ён прадстаўлены. Выбар аўтарам той ці іншай структурнай схемы загалоўка, якая ператвараецца ў «сігнал семантычнай напоўненасці», абумоўлены характарам самога твора (у асобных выпадках пэўная заканамернасць вызначаецца і ў сувязі з жанравай прыналежнасцю тэксту: «*У Думе і каля Думы», «Вільня,...», «На вайне і каля вайны», «Вайна»*), імкненнем у пэўнай ступені спрагназаваць і ў лаканічнай форме выразіць змест адпаведнага тэксту, дапамагчы чытачу лепш усвядоміць сэнс паведамлення і зразумець аўтарскую пазіцыю. Агляд загалоўкаў публіцыстычных тэкстаў газеты «Наша Ніва» паказвае, што яны паўнавартасна выконваюць усе функцыі, характэрныя і для загалоўкаў сучасных СМІ, што робіць іх неад'емным кампанентам адзінай інфармацыйнай і тэкстаўтваральнай сістэмы.

## Літаратура


1. Р а т н и к о в а, И. Э. Имя собственное: от культурной семантики к языковой / И. Э. Ратникова. – Минск: БГУ, 2003. – 214 с.
2. Р а т н и к о в а, И. Э. Топонимические единицы в образной номинации (на материале СМИ России и Беларуси за 1997–1999 гг.) // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Материалы VII Междунар. науч. конф., Гродно, 14–15 апр., 2000 г. – Гродно: ГрГУ, 2000. – С. 365–369.
3. В а с і л е ў с к а я, А. С. Параўнальны аналіз загалоўкаў гістарычных твораў (на матэрыяле творчасці У. Караткевіча, У. Арлова, В. Шатавай) / А. С. Васілеўская // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 21–22 кастр., 2010 г. – Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2010. – С. 17–19.
4. К о ж и н а, Н. А. Заглавие художественного произведения: онтология, функции, типология / Н. А. Кожина // Проблемы структурной лингвистики. – М.: Наука, 1986.
5. Г а р м а з а, М. В. Типология газетных заголовков / М. В. Гармаза, Г. А. Молочко // Культура речи в условиях билингвизма: состояние, перспективы, технологии: Материалы междунар. науч. конф., Минск, 25–26 февр., 2004 г. – Минск: БГПУ, 2004. – С. 32–34.
6. Ш у б а д з ё р а в а, А. М. Эліпсіс і парцэляцыя як спосабы пабудовы газетных загалоўкаў / А. М. Шубадзёрава // Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24 крас., 2009 г. – Магілёў: Выдавецкі цэнтр МДУ імя А. Куляшова, 2009. – С. 172–174.
7. К о ж а м б е р д и н а, Р. Д. Тематическая релевантность субстантивов газетных заголовков / Р. Д. Кожамбердина // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Тез. докл. III респ. конф., Гродно, 5–6 окт., 1989 г. – Гродно, 1989. – Ч. I. – С. 103–104.
8. Наша Ніва. – 1910. – № 2. – С. 21.
9. З ы р я н о в а, И. П. Прагматический потенциал прецедентных феноменов в заголовках британской прессы / И. П. Зырянова // Известия Уральского государственного университета. – 2010. – № 1(71). – С. 73.
10. Г а л ь п е р и н, И. Р. Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин. – М.: Наука, 1981. – 138 с.
11. К о ж и н а, Н. А. Заглавие художественного произведения: онтология, функции, параметры и типология / Н. А. Кожина // Проблемы структурной лингвистики. – М.: Наука, 1989. – С. 167–183.
12. Л а з а р е в а, Э. А. Системно-стилистические характеристики газеты / Э. А. Лазарева. – Свердловск, 1993. – 165 с.
13. Л а з а р е в а, Э. А. Заголовок в газете / Э. А. Лазарева // Учеб. пособие. 2-е изд., доп., перераб. – Екатеринбург: Изд-во Урал. ун-та, 2004. – 84 с.
14. С л а в к и н, В. В. Заголовок в современном газетном тексте / В. В. Славкин // Журналистика и культура русской речи. – 2002. – № 1. – С. 40–49.
15. Л а з а р е в а, Э. А. Заголовочный комплекс текста – средство организации и оптимизации восприятия / Э. А. Лазарева // Известия Уральского государственного университета. – 2006. – № 40. – С. 158–160.
16. Г а л ь п е р и н, И. Р. Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин. – М.: Наука, 1981. – С. 110.
17. Наша Ніва. – 1907. – № 33. – С. 4–5.


*T. M. MARAKULINA*

**HEADLINES OF THE «NAŠA NIVA» NEWSPAPER TEXTS: FUNCTIONAL AND STRUCTURAL ASPECTS OF RESEARCHES**

## Summary

Subject of inquiry of this article is headlines of the «Naša Niva» newspaper texts (1906-1915). The author defines the functional peculiarities of headlines. Their structural types have been revealed and analyzed, too.

## *РЭЦЭНЗІІ*

# ТУРИСТИЧЕСКАЯ МОЗАИКА БЕЛАРУСИ

Туризм во многих странах занимает значительное место среди наиболее приоритетных видов хозяйственной деятельности. Для ряда государств он является традиционным источником основных доходов. В рамках туризма происходит знакомство с культурными достижениями стран и народов, социальным устройством общества, особенностями национального быта, кухни и т. д.

Коллективная монография А. И. Локотко, О. Н. Князевой, Е. В. Морозова, О. В. Изотовой «Туристическая мозаика Беларуси» (науч. ред. А. И. Локотко) (Минск: Беларус. навука, 2011) является результатом инновационного проекта «Разработать программы и методики использования историко-культурного наследия и определить локальные историко-культурные территории для развития туризма в Беларуси» (научный руководитель А. И. Локотко, член-корреспондент НАН Беларуси). В книге нашли решение актуальные задачи формирования и развития высокоэффективного и конкурентоспособного туристического комплекса в нашей стране, обеспечивающего широкие возможности для удовлетворения потребностей граждан в разнообразных туристических услугах. Исследование вносит вклад в развитие экономики страны, сохранение и реставрацию историко-культурного наследия, развитие на его основе патриотизма, гражданственности, обеспечение национальной безопасности в социально-гуманитарной сфере.

В современной культуре туризм имеет важную культурно-познавательную функцию, становится элементом диалога различных социальных и этнических групп. Феномен туризма выходит за пределы национальных, культурных и географических границ, формируется на основе изменений в пространстве и времени, обусловленных современными возможностями коммуникаций и процессами глобализации.

Географическое положение Беларуси, расположенной на пересечении трансъевропейских туристических коридоров Восток–Запад и Скандинавия–Балканы, создает предпосылки для развития здесь крупного туристического бизнеса государственного и международного уровня. Туристический потенциал республики базируется, главным образом, на многообразии и красоте природы, уникальности историко-культурного наследия и включает более чем 15 тысяч объектов, имеющих историческую, культурную, архитектурную значимость, памятных мест, связанных с именами выдающихся деятелей мировой истории и культуры. На территории Беларуси расположено значительное количество исторических городов – Полоцк, Новогрудок, Туров, Гродно, Несвиж и другие. В республике имеется 4 национальных парка (Беловежская пуща, Нарочанский, Припятский, Браславские озера), 97 заказников, в том числе 7 международного значения, более 10 тысяч озер, около 20 тысяч рек. Воссоздан уникальный объект водного туризма – Августовский канал. В список Всемирного наследия ЮНЕСКО включены замковый комплекс «Мир» в городском поселке Мир (Гродненская область), архитектурно-культурный комплекс Радзивиллов в городе Несвиж (Минская область), Национальный парк «Беловежская пуща», пункты Геодезической дуги Струве.

В книге впервые представлена разработанная оригинальная научная концепция выявления локальных районов комплексного историко-культурного наследия как основы для создания туристско-рекреационных зон на территории Беларуси. В совокупности результаты исследований данного цикла представляют собой научный прорыв в формировании государственной стратегии развития внутреннего и международного туризма. Впервые в отечественной науке разработана научная концепция развития туризма в Беларуси на основе локально-рекреационных территорий, транзитных, широтных и меридиональных маршрутов, многовекторной спирали для глубокого знакомства с туристическим потенциалом всех регионов республики.

В книге даны очерки по истории городов и городских поселков Беларуси от времени их возникновения до современности. Помимо исторических, социально-экономических, статистических материалов приводятся сведения о памятниках истории и культуры, архитектуры, национальных парках и заповедниках.

Для решения проблемы комплексного анализа природно-ценных территорий и историко-культурных ландшафтов Беларуси с целью определения локальных районов, важных для развития регионального туризма, системно раскрыты теоретические аспекты историко-культурного районирования Беларуси. В результате на основе анализа особенностей природно-ландшафтной среды, системы расселения, коммуникаций, застройки поселений, традиционной материальной и духовной культуры всех областей страны научно обоснованно выделены 52 локальных района комплексного историко-культурного наследия Беларуси. Даны карты локальных историко-культурных территорий с указанием центров материальной и духовной культуры, оригинальные иллюстрации.

В обозначенных локальных районах комплексного историко-культурного наследия на основе существующих природных компонентов, сохранившихся памятников археологии, истории, архитектуры, народного зодчества, этнографии, действующих музеев предлагаются наиболее перспективные туристские маршруты (сухопутные, водные, автомобильные, конные, пешие и т. д.). Даны предложения и рекомендации по сохранению и использованию объектов историко-культурного наследия малых городов и исторических сел Беларуси, сведения о фольклорно-этнографических коллективах, народных промыслах и ремеслах Беларуси.

Научные результаты и выводы создают прочную основу для государственной политики в области сохранения и развития историко-культурных регионов всех областей Беларуси, возможность более глубокого подхода к решению вопросов охраны историко-культурного наследия страны. Данное исследование имеет большое значение для развития инфраструктуры села и привлечения инвестиций в сельские населенные пункты и малые города. Результаты исследований могут войти в проекты стратегии градостроительного развития и другие разработки в качестве разделов по проблемам территориального развития туризма, для разработки новых перспективных туристических маршрутов в регионах, а также могут использоваться для подготовки специалистов в сфере туризма, в практической работе туроператоров и экскурсоводов.

Прикладная сторона результатов внедрена в проекте определения границ перспективных охраняемых градостроительных территорий (в разделе корректировки Генерального плана Минска, совместно с УП «Минскградо»), в предложениях по развитию туризма в регионах Припятского Полесья, районах, пострадавших от аварии на Чернобыльской АЭС, в Национальном парке «Нарочанский», в развитии сельского туризма, представленных для соответствующих Государственных программ Совета Министров Республики Беларусь, а также в двух международных проектах, финансируемых БРФФИ: «Белорусско-румынский туризм: перспективы развития в контексте трансъевропейских туристических коридоров» и «Экологический фактор и этнокультурные параметры жизни населения в зоне Чернобыльской катастрофы (Гомельская, Брянская и Черниговская области)», в задании Филиала «Белорусского отделения Российско-Белорусского информационного центра по проблемам последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС Республиканского научно-исследовательского унитарного предприятия «Институт радиологии».

Концептуальные идеи исследования положены в основу разработки разделов задания «Архитектура и историко-культурное наследие городов и сел Беларуси: традиции, инновации, развитие туризма» в рамках Государственной программы научных исследований на 2011–2015 гг. «История, культура, общество, государство».

Опубликованные в представленном цикле работ результаты исследований внедрены в учебный процесс на кафедре истории Беларуси и музееведения Белорусского государственного университета культуры и искусств в 2006–2008 учебных годах (в курсах лекций: «Историко-культурные регионы Беларуси» и «Туризм в Беларуси»), используются сотрудниками туристской компании «Виаполь» при планировании туристских маршрутов и проведении экскурсий по территории Беларуси. Положительные оценки специалистов о монографии прозвучали на страницах газет «Культура», «Веды», озвучены в программах Белорусского телевидения и радио, на сайтах интернета.

*В. Ф. Медведев*

# *РЕФЕРАТЫ*

*УДК 165.12:004.81*

Д е м и р о в В. В. **Проблема сознания сквозь призму построения моделей искусственного интеллекта** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 4–10.

Статья посвящена рассмотрению проблемы объективности смысла и онтологической референции сквозь призму тех междисциплинарных наработок, которые были сделаны в области изучения сознания и языка в рамках реализации задачи построения моделей ИИ.

Показывается, что решение этой задачи напрямую зависит от рассмотрения следующих фундаментальных вопросов, которые задавала себе философская мысль на протяжении столетий: каким образом приобретаются, хранятся, передаются и используются знания? Что такое сознание и откуда происходят осознанные мысли? Какова природа восприятия и памяти? Что есть мысль? Идентична ли субъективная репрезентация мира его физическим свойствам? Сегодня ставить эти вопросы уже невозможно без привлечения специально-научного знания по этой проблеме. Исходя из философской методологии и категориального аппарата, осуществляется оригинальный синтез указанного специально-научного знания.

Делается вывод, что в основе сущностных факторов, посредством которых сознание способно работать не только на локально-процедурном, формально-синтаксическом уровне, но и на уровне представления и обработки смыслового содержания информации, лежат специфические механизмы темпорального синтеза и интуитивно-эйдетические формы «восприятия общего», «схватывания смысла».

Библиогр. – 12 назв.

*УДК 316.334.55-057.32(476)*

С м и р н о в а Р. А. **Управленческие кадры АПК как лидеры развития аграрной сферы Беларуси //** Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 11–15.

Статья посвящена анализу инновационного потенциала аграрного истеблишмента – директоров и специалистов СПК. Показывается специфика их экономического поведения и сознания, обусловленная переходом аграрной сферы от редистрибутивной к рыночной экономике.

Библиогр. – 5 назв.

*УДК 331.524:316.43*

К у з ь м е н к о Т. В. **Основные направления повышения эффективности использования трудовых ресурсов в сельской местности** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 16–23.

Статья посвящена проблеме поиска возможностей эффективного использования человеческих ресурсов в сельской местности. В качестве основных направлений решения данной проблемы рассматриваются снижение уровня безработицы, оптимизация кадровой структуры сельхозпредприятий и повышение квалификации руководителей и специалистов, а также диверсификация сфер приложения труда и способов получения доходов граждан на селе, их вовлечение в альтернативные формы занятости, не связанные с сельхозпредприятием.

Табл. 1. Библиогр. – 7 назв.

*УДК 342.72/.73;364(476)*

С и в е ц С. М. **Обеспечение прав граждан как основной вектор реализации социальной политики Республики Беларусь** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 24–28.

Проводится анализ системы гарантий социальных прав граждан, рассматриваемой в правовой науке в качестве одного из основных направлений развития социальной политики Республики Беларусь. Дается авторская классификация системы политических, экономических, социальных и духовных гарантий социальных прав граждан, закрепленных на конституционном уровне.

Вносятся предложения по совершенствованию системы гарантий социальных прав граждан с целью придания им реального характера.

Библиогр. – 17 назв.

*УДК 342.92*

Л а д у т ь к о В. К. **Объективные признаки административных правонарушений в сфере налогообложения** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 29–38.

Проведено исследование объективных признаков административных правонарушений против порядка налогообложения. Автором проанализирована общетеоретическая и отраслевая литература по рассматриваемому вопросу, законодательство Республики Беларусь об административных правонарушениях и разработаны предложения по его совершенствованию.

Библиогр. – 52 назв.

*УДК 34.03:004.056.5*

А б л а м е й к о М. С., М а р у ш к о Д. А. **Правовое обеспечение информационной безопасности при формировании информационного общества в Республике Беларусь** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 39–45.

Проанализированы правовые основы формирования информационного общества, обеспечения информационной безопасности в Республике Беларусь. Подготовлены предложения по развитию национального законодательства в данной сфере.

Библиогр. – 22 назв.

*УДК 336.7+338*

К о р о п В. В. **Монетарный индикатор состояния белорусской экономики** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 46–50.

Эффективность экономической политики в стране зависит от своевременной и объективной оценки состояния и динамики экономических процессов. На основе анализа эоносического роста Беларуси и показателей платежного оборота, опосредующего движение ресурсов и факторов в эконосике, автором предложен монетарный индикатор для оперативного мониторинга экономической ситуации.

Табл. 1. Ил. 4. Библиогр. – 4 назв.

*УДК 336.1/.5+339*

С а б д е н О р а з а л ы, А р м е н с к и й А. Е. **Обеспеченность национальных валют и переход к равноправной торговле** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 51–56.

Процесс реформирования мировой финансовой системы достаточно сложен и многогранен. Он требует тщательной подготовки, внимательных расчетов и поэтапной реализации.

Основные требования к валюте должны заключаться в ее привязанности не к одному определенному товару. Необходимо, чтобы эта валюта содержала по своей сути силу, мощь. Кроме того, в качестве такой валюты не должна быть принята валюта какой-либо страны, чтобы отойти от соблазна возникновения главенствующего, господствующего в мировой экономике государства, по желанию которого могут случаться кризисы или войны.

Табл. 7. Ил. 1. Библиогр. – 1 назв.

*УДК 94(476)(36)–912.43:93/99 “9/13”*

В и т я з ь С. П., К у л а к о в В. И. **«Каменные» городища раннего средневековья //** Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 57–68.

Обобщены данные о городищах с каменной облицовкой внешнего склона вала («каменные» городища) восточноевропейской лесной полосы периода раннего средневековья. Всего выделены 29 памятников на территории России (12 ед.), Польши (9 ед.), Беларуси (5 ед.), Литвы (3 ед.). Городища располагаются в исторических областях распространения племен пруссов (14 ед.), ятвягов (9 ед.) и в пограничных балто-славянских областях (6 ед.). Отмечается центр формирования и бытования таких памятников – п-в Самбия (Калининградская обл. России), что прямо указывает на этническую принадлежность носителей данного конструктивного приема – древних пруссов.

Ил. 1. Библиогр. – 51 назв.

*УДК 936.91:940.1 «03/05»*

Г р и г о р ь е в В. В. **Влияние гуннов на эволюцию этнических общностей в позднеантичной и раннесредневековой Европе** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 69–73.

Исследуется трансформация этнического пространства европейского континента в связи с влиянием гуннов. Показаны этнические процессы, проходившие до активного изменения гуннами такого пространства. Подчеркивается место стратегической системы влияния гуннов и их этнического проникновения в общности континента. Данное исследование актуально, поскольку доказывает, что изменение этнической и политической сферы Европы гуннским воздействием с IV по VI в. н. э. создало новые политические, геополитические звенья и этнические общности.

Библиогр. – 19 назв.

*УДК 94(476) «1914/1918»:930(476)*

Д м и т р и е в а О. П. **Этнические меньшинства Беларуси в годы Первой мировой войны в отечественной историографии 90-х гг. XX – начала XXI в.** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 74–82.

Анализируются исследования белорусских историков 90-х гг. XX – начала XXI в., посвященные различным аспектам положения этнических меньшинств, проживавших в Беларуси в годы Первой мировой войны. Отмечается недостаточная степень изученности вопросов, связанных с национально-культурным, социально-экономическим и политическим развитием этнических меньшинств, которое происходило в условиях немецкого оккупационного режима и под влиянием правительства Российской империи.

Библиогр. – 39 назв.

*УДК 792.2.03(476-25)*

С а в и ц к а я А. А. **Современная проблематика в репертуаре детского театра (практика Белорусского театра юного зрителя)** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 83–89.

Рассматривается одна из ключевых задач функционирования детского театра – создание современного репертуара для подростков. Автор отмечает характерные особенности подросткового возраста, раскрывает их роль и значение в сценической интерпретации актуальных проблем. Анализируются социокультурные и художественные аспекты воплощения современной темы на разных этапах деятельности Белорусского театра юного зрителя. Отмечается, что в 1930-е гг. действуют социальные механизмы включения детей в мир прекрасного, а потому доминируют спектакли, в которых затрагивается стандартная для того времени тема классового воспитания подрастающего поколения. Во второй половине 1950-х гг. современная тема получает сценически выразительное морально-этическое толкование, наполняется духовным, общечеловеческим содержанием. В последующие десятилетия наблюдается резкое ухудшение ситуации с современным репертуаром для 11 – 14-летних зрителей. Автор указывает как на количественное, так и на качественное сужение данной репертуарной линии. С конца 1990-х гг. современность вовсе уходит с подмостков ТЮЗа. Выявленная тенденция оценивается как крайне неблагополучная, которая негативно отражается как на профессиональном, так и на творческом состоянии единственного в республике национального театра для детей.

Библиогр. – 10 назв.

*УДК 72.012(476)*

М у р и н а Н. В. **Аутентичность художественного образа современной архитектуры Беларуси** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 90–94.

Проведены анализ и оценка степени влияния традиций на современное архитектурное формообразование и аутентичность художественного образа. Раскрыты некоторые подходы, способствующие развитию и сохранению национальных и региональных особенностей в архитектуре. Выявляется роль инноваций и авторского влияния на формообразование и художественный образ в современной архитектуре. Затрагиваются проблемы поиска национальной и индивидуальной аутентичности в контексте современного формообразования в архитектуре. Рассматриваются различные принципы и их особенности, лежащие в основе современного формотворчества.

Библиогр. – 11 назв.

*УДК 791.43.03+821.161.3.09(092)*

Р е м и ш е в с к и й К. И. **Максим Богданович и эволюция мемориальной парадигмы в экранной культуре Беларуси** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 95–105.

Анализируется широкий массив аудиовизуальной продукции (неигровые кино-, видео- и телефильмы), созданной в Республике Беларусь за последние четыре десятилетия на темы жизни и творчества великого белорусского поэта Максима Богдановича (1891–1917).

На примере сложных и противоречивых процессов формирования культурной памяти о М. Богдановиче исследуется становление и развитие мемориальной парадигмы в белорусской экранной культуре; выявляются механизмы взаимовлияния литературоведения на экранную культуру; обосновываются закономерности эволюции содержательных и жанрово-стилевых подходов авторов аудиовизуальной продукции о М. Богдановиче в зависимости от доминирующей на конкретном историческом этапе аксиологической оценки наследия поэта, а также смен приоритетов развития национального неигрового фильмопроизводства.

Библиогр. – 11 назв.

*УДК 882.6.09-3*

Т к а ч е в а П. П. **Маска в сатирико-юмористической литературе: трансформации образа автора в художественном произведении** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 106–116.

Образ автора – это представление читателя о том, кто написал художественное произведение. Безусловно, образ автора во многом похож на самого автора, так как его мысли и чувства заложены в произведении. Однако есть примеры в художественной литературе, когда образ автора подчиняется полностью законам создания художественного образа. В таком случае мы имеем дело с инновационной трансформацией образа автора.

Рассматриваются вопросы, связанные с проблемой так называемой «авторской маски», которая позволяет автору перевоплотиться в литературный персонаж, выбрать своеобразный стиль и т. д. Таким образом, исследование инновационной трансформации образа автора (его маски) весьма существенно при анализе стиля писателя, его творческой лаборатории, особенно когда это касается творчества сатирика, юмориста.

Библиогр. – 30 назв.

*УДК 070(476) НАША НІВА*

М а р а к у л и н а Т. Н. **Заголовки публицистических текстов газеты «Наша Ніва»: функциональный и структурный аспекты исследования** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 4. С. 117–123.

Объектом исследования послужили заголовки публицистических текстов газеты «Наша Ніва» (1906–1915 гг.). Определяются функциональные особенности газетных заголовков, выявляются и анализируются их структурные типы.

Ил. 1. Табл. 2. Библиогр. – 17 назв.